КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 39 (215) ◂ 29 кастрычніка ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**НАРАЧ: ПАГРОЗЫ МАДЭРНІЗАЦЫІ**

Стар. 6

**ЕЎРОПА НА ПРОВАДЗЕ**

Чым бліжэй беларускія прэзідэнцкія выбары, тым больш Беларуссю цікавіцца Еўрасаюз

Стар. 4

**КРЫМ СТАНЕ ДАНБАСАМ**

На думку шматлікіх украінскіх палітолагаў, Партыя рэгіёнаў збіраецца зрабіць тое, пра што «аранжавыя» нават марыць не маглі, — ліквідаваць аўтаномію Крыма

Стар. 28

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**БЕЛАРУСКІ ФАЎСТ**

Нарыс Аляксея Хадыкі

▸ **МЕРКАВАННЕ**

# «ПЛОШЧА — УСЯГО ТОЛЬКІ ЧАСТКА СЦЭНАРУ»

**Змагацца да перамогі і ісці на выбары, каб перамагчы. Пра такія намеры заявілі шэраг кандыдатаў ад апазіцыі. Пытанне «як?» цяпер галоўнае, на што трэба даць адказ прэтэндэнтам. Якім чынам расцэньваюць такія заявы адмыслоўцы? Сваё меркаванне на гэты конт журналістцы «НЧ» Алене Варажбей выказаў палітолаг Юры Чавусаў.**

***— Апазіцыя можа разлічваць на поспех? І пры якіх умовах?***

— Ніхто з кандыдатаў не разлічвае, што Ярмошына абвесціць лічбы, якія б сведчылі пра паразу Лукашэнкі. Бо выбараў у Беларусі няма: іх няма ў тым сэнсе, што галасы не лічацца.Таму словы пра перамогу могуць азначаць перамогу на плошчы пасля пратэстаў. Або пасля плошчы ў выніку ціску па ўмовах паставак энергарэсурсаў, які чакаецца з боку Расіі напачатку года.

***— А чым плошча–2010 можа кардынальна адрозніваца ад плошчы–2006? Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, колькасць людзей, гатовых выйсці на вулічныя акцыі, вельмі нязначная.***

— Палітыкі карыстаюцца тым, што шмат для каго з палітычна ангажаванай публікі плошча зрабілася сімвалам маральнай (а не палітычнай) перамогі. Яны хаваюцца за гэтыя словы, паўтараюць: «Плошча, плошча, мы выйдзем на плошчу». Але сэнсу гэтаму надаюць вельмі мала, то бок канкрэтыкі няма. Плошча, як і адзіны кандыдат,— гэта ўсяго толькі сродкі, часткі пэўнага сцэнару, якія нельга разглядаць як самастойныя каштоўнасці.




Калі кандыдат кажа пра перамогу, трэба пытацца, што ён лічыць перамогай у гэтай кампаніі. Мілінкевіч у 2006 годзе разлічваў на 30 працэнтаў. Але высветлілася гэта толькі пасля кампаніі. Так што трэба глядзець на кампаніі апазіцыйных кандыдатаў тэхналагічна і цікавіцца, якім чынам яны збіраюцца перамагаць. Фальшывасць гэтых выбараў вядомая ўсім, але людзі, якія стаялі на плошчы ў 2006 годзе, будуць задаваць пытанні: «Мы прыйдзем на плошчу ізноў, але, спадары кандыдаты, што мы будзем рабіць? Зноў стаяць у намётавым мястэчку? Добра, мы гатовыя. Але якім чынам гэта паўплывае на сітуацыю? Што будзе адрознае ад ранейшага сцэнару, каб мы разлічвалі на гэту славутую перамогу?» І адказы на такія пытанні кандыдаты ў прэзідэнты павінны мець.

***— У рэальнасці хто б перамог, на ваш погляд? Бо ўсе адзначаюць малы рэйтынг даверу апазіцыі, які складае не больш за 15 працэнтаў.***

— Справядлівыя выбары — гэта не толькі сумленны падлік галасоў. Гэта азначае не арыштоўваць дэмакратычных актывістаў, не выносіць папярэджанні газетам, якія пішуць пра апазіцыйных кандыдатаў. Урэшце, не прымушаць людзей на прадпрыемствах падпісвацца за Аляксандра Рыгоравіча. Сітуацыя ў Беларусі такая, што пра справядлівыя выбары ўжо на гэтым этапе кампаніі казаць немагчыма. Таму прагназаваць, колькі б працэнтаў атрымаў Аляксандр Рыгоравіч у сітуацыі, калі б былі справядлівыя выбары, — гэта ўсё роўна, як пытацца: «А колькі б галасоў атрымаў Леанід Ілліч Брэжнеў на выбарах у 1978 годзе і ці перамог бы ў яго спадар Сахараў?»

Апазіцыйныя дзеячы ўсведамляюць, якое малое значэнне мае тое, што там у выбарчай скрынцы будзе. Таму ім, магчыма, больш важна дамагчыся вядомасці ў якасці кандыдатаў у прэзідэнты, а не змагацца за канкрэтныя галасы. І гэтыя мэты ставяцца па-за межамі катэгорыі «электаральны рэйтынг». Гаворка ідзе хутчэй пра рэйтынг вядомасці.

На гэтых выбарах нельга казаць ні пра справядлівы падлік галасоў, ні пра справядлівыя выбары, ні пра перадвыбарчыя рэйтынгі. Гэта ўсё не мае дачынення да бягучага палітычнага працэсу. Безумоўна, палітык павінен быць вядомым. Але мы бачым, што самы вядомы з апазіцыйных палітыкаў Аляксандр Мілінкевіч не балатуецца. А ён меў самыя вялікія рэйтынгі вядомасці і падтрымкі. Гэта сведчыць пра тое, што апазіцыя разумее ўсю штучнасць пытання пра рэйтынгі падчас выбарчай кампаніі.

***— Вы згодны з меркаваннем, што апазіцыя не падрыхтавалася да выбараў?***

— Нельга раней часу казаць, што апазіцыя атрымала фіяска. Папросту сітуацыя не падобная на тую, якая была ў 2006 годзе. Яна хутчэй нагадвае сітуацыю 2001 года, калі і подпісы збіралі некалькі дэмакратычных кандыдатаў, і дамовіліся яны пра адзінства ўжо літаральна перад галасаваннем. І як мы цяпер рэтраспектыўна аналізуем сітуацыю 2001 года і далейшы ход падзей, лепей бы яны тады ішлі ўдвух, а не стваралі сітуацыю штучнага адзінства.

Калі ўсе бачаць, што сэнсу ў аб'яднанні пад шыльдай безаблічнага агульнадэмакратычнага кандыдата няма, прадстаўнікі партый думаюць пра тое, што трэба данесці да насельніцтва ўласную ідэалагічную пазіцыю.

Працяг на стар. 5 ▸

КАМПАНІЯ

# ЗА «ЯКАСЦЬ ПЯРА»

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Беларуская асацыяцыя журналістаў распачала кампанію «За якасную журналістыку». Яе ініцыятары ставяць на мэце разгарнуць шырокую дыскусію ў журналісцкай супольнасці аб неабходнасці выпрацоўкі стандартаў журналісцкай працы.**

Сыход у інтэрнэт беларускіх СМІ, у тым ліку і закрытых уладамі, разам з відавочнымі плюсамі мае і адваротны бок. Часта журналіст, які працуе ў інтэрнэце, пачынае губляць якасць прафесійнай працы.

Прафесійныя стандарты і іх фармуляванне будуць абмяркоўвацца падчас дыскусійных прэсавых клубаў і майстар-класаў. БАЖ збіраецца іх праводзіць на працягу шасці месяцаў. Вынікам сумеснай працы стане распрацоўка і выданне дапаможнікаў для журналістаў.

Першыя прэсавыя клубы ўжо прайшлі ў Мінску і Магілёве. Яны тычацца працы журналістаў падчас выбараў.

Як падкрэслілі ініцыятары кампаніі, не ставіцца мэта ўніфікаваць журналістаў. Гаворка ідзе пра падыходы да журналісцкай працы, якая павінна выконвацца прафесійна. Пытанне ў тым, каб такія крытэрыі былі выпрацаваныя і дакладна сфармуляваныя.

Падобная практыка ўжо існуе ў нашых украінскіх калегаў, якія некалькі гадоў таму пачалі фармуляваць у рэдакцыях так званыя рэдакцыйныя палітыкі. Гэта звод правілаў, які прымаецца на ўзроўні журналіст — рэдактар — уладальнік, і які дапамагае журналістам пісаць, а рэдактарам ацэньваць напісанае.

Рэдакцыйныя палітыкі ўкраінскіх СМІ звычайна публічныя. Часцей за ўсё ўкраінскія медыя вывешваюць гэтыя дакументы на сваіх сайтах. І чытачы могуць даведацца, якіх прынцыпаў прытрымліваецца кожнае выданне.

Ці прыйдуць да гэтага ў рэдакцыях беларускіх СМІ, пакажа час.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ГКС ЗАМЕСТ ФГС

Вольга ХВОІН

**Прадстаўнікі грамадскага сектара Беларусі, удзельнікі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства» раскрытыкавалі дзяржструктуры, якія заявілі пра намер далучыцца да дзейнасці Форума грамадзянскай супольнасці (ФГС).**

Сутнасць прэтэнзій у тым, што суб'екты дзяржаўнай сістэмы, з аднаго боку, выказваюць зацікаўленасць у працы Форума, з другога — дэманструюць невыкананне агульнапрынятых нормаў супрацоўніцтва.

22 кастрычніка ў Кіраўнічы камітэт Форума грамадзянскай супольнасці (ФГС) «Усходняга партнёрства» паступіў сумесны зварот прадстаўнікоў Грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі прэзідэнта, у якім выказвалася гатоўнасць членаў савета далучыцца да дзейнасці ФГС. Удзельнікі ФГС адказалі згодай абмяркоўваць фармат такога ўдзелу. Але на прынцыповай аснове: ў адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі работы Форума, а таксама з улікам таго, што ГКС сам па сабе не з'яўляецца структурай грамадзянскай супольнасці Беларусі.

Асаблівую заклапочанасць удзельнікаў Нацыянальнай платформы ФГС выклікае дзейнасць па стварэнні платформы грамадзянскай супольнасці, што было ініцыявана праектам «Развіццё патэнцыялу для супрацоўніцтва дзяржаўных і грамадскіх арганізацый». Гэты праект рэалізуецца на сродкі Еўрапейскай камісіі пад эгідай АБСЕ і міжнароднай арганізацыяй CIVICUS.

Нацыянальны каардынатар ФГС па Беларусі, кіраўнік Міжнароднага кансорцыума ЕўраБеларусь Улад Вялічка зазначае, што грамадзянская супольнасць вітае любыя рэальныя крокі беларускай дзяржавы ў накірунку супрацоўніцтва з грамадзянскім сектарам, але гэтыя працэсы мусяць адбывацца адкрыта, на прынцыпах узаемнай адказнасці і ўключэння ў працэс дзейсных структур грамадзянскай супольнасці.

Другі Форум грамадзянскай супольнасці адбудзецца ў Берліне 18–19 лістапада гэтага года. На яго прадстаўнікі Беларусі паедуць са сфармуляванымі прапановамі па развіцці даследчай дзейнасці, мясцовага самакіравання, культуры, пытанняў веравызнання, па развіцці і рэалізацыі моладзевай палітыкі.

«Берлінскі Форум будзе крокам у развіцці грамадзянскай супольнасці ў межах праграмы «Усходняга партнёрства» як суб'екта. Цяпер змястоўную частку вырашаюць удзельнікі Форума, а не Еўракамісія», — зазначыў Нацыянальны каардынатар ФГС па Беларусі Улад Вялічка.

СПРАВА

# РАССЛЕДУЕ АБСЕ

Вольга ХВОІН

**Справу аб смерці журналіста Алега Бебеніна разглядаюць эксперты АБСЕ. Двое экспертаў-крыміналістаў з Нарвегіі і Швецыі прыехалі ў Мінск і ўжо пачалі знаёміцца з матэрыяламі следства.**

«Эксперты зараз вывучаюць усе матэрыялы, што з'явіліся падчас расследавання гэтай справы. Яны не праводзяць новага расследавання, але пераглядаюць усе матэрыялы і фармуюць уласнае меркаванне, — паведаміў кіраўнік мінскага Офіса АБСЕ Бенедыкт Халлер. — Гэтых экспертаў абраў цэнтральны Офіс АБСЕ ў Вене. Яны ўжо мелі сустрэчу з генеральным пракурорам Беларусі Рыгорам Васілевічам. Але іх праца не разгалошваецца. Пакуль я не магу сказаць нават аб праграме іх візіту», — зазначыў Халлер.

Пракурор Мінскай вобласці падоўжыў тэрмін правядзення праверкі па факце смерці Бебеніна да 3 лістапада. Комплексная экспертыза цела завершаная толькі часткова. Не выключаецца і верагоднасць таго, што пры неабходнасці будзе праведзена эксгумацыя.

Нагадаем, цела журналіста было знойдзена на яго дачы пад Мінскам у вёсцы Перхурава Дзяржынскага раёна 3 верасня каля 19.00. Органы пракуратуры правяраюць версію аб забойстве Бебеніна і інсцэніроўцы самазабойства. Сваякі настойваюць, што гэта было забойства.

# ПАМЯЦІ ПАЎЛА ЛОЙКІ

**22 кастрычніка на 53-ім годзе пайшоў з жыцця выдатны беларускі гісторык Павел Алегавіч Лойка.**

Ён паходзіў з інтэлігентнай беларускай сям'і са Слоніма, яго дзед быў доктарам, а бацька — паэтам, перакладчыкам, універсітэцкім прафесарам.

Павел Лойка доўгі час узначальваў аддзел гісторыі Беларусі XIII–XVIII стагоддзяў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, з 1994 года — кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Белдзяржуніверсітэта. Даследаваў дзяржаўна-палітычнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя, аграрную гісторыю XVI–XVIII стст. Павел Лойка з'яўляецца аўтарам манаграфій пра паўстанне Васіля Вашчылы і пра развіццё сельскай гаспадаркі ў XVI–XVIII стагоддзях, складальнікам шэрагу такіх знакавых для развіцця беларускай навукі зборнікаў, як «Скарына і яго эпоха».

Сапраўдным прарывам ў беларускай школьнай асвеце сталіся яго падручнікі па нацыянальнай гісторыі, якія з'явіліся ў першыя гады незалежнасці і ўзнялі працэс адукацыі на новы якасны ўзровень. Працуючы на важных акадэмічных і універсітэцкіх пасадах, Павел Лойка, у адрозненне ад абачлівай большасці навукоўцаў, не баяўся браць удзел у незалежных грамадскіх навучальных праектах, такіх як Народны ўніверсітэт. Працаваў у камандзе папулярнага апазіцыйнага дэпутата ВС 12 склікання Валянціна Голубева.

Да абароны доктарскай дысертацыі, якую Павел не паспеў ажыццявіць, ён выпусціў сваю апошнюю манаграфію. Апраўдацца перад Богам Павел зможа і без чарговага навуковага тытула.

Рэдакцыя «НЧ» выказвае свае шчырыя спачуванні жонцы, дзецям, сваякам Паўла Алегавіча. Светлая і вечная яму памяць…



Фота Яраслава Сцешыка

ЗАКЛІК

# НЕАБХОДНА ВАША ДАПАМОГА!

**Эдуарду ўсяго 2 гады. З-за халатнасці лекараў, што прымалі роды, ён з першай хвіліны жыцця асуджаны на барацьбу за тое, каб прайсці па жыцці на сваіх нагах, а не ў інваліднай калясцы, каб аднойчы заняць годнае месца ў грамадстве. Дыягназ — дзіцячы цэрэбральны параліч цяжкай формы, эпілепсія.**



У свае два гады Эдзік не пераскоўваецца, не валодае рукамі, не размаўляе. Рэабілітацыйныя цэнтры Беларусі і Расіі не прынялі малечу з-за курчаў. Але бацькі знайшлі Інстытут Глена Домана ў Філадэльфіі, дзе не адмаўляюцца дапамагчы нават дзецям з самымі цяжкімі хваробамі.

У красавіку дзякуючы дапамозе неабыякавых людзей было сабрана 7 500 долараў, і хлопчык атрымаў магчымасць паехаць у ЗША. Вынікі проста неверагодныя — дзіця стала ўсміхацца, вымаўляць гукі. У яго наладзілася стравыванне і сталі знікаць курчы. І самае галоўнае — у маленькага Эдзіка ўжо атрымліваецца паўзці.

Праграма лячэння прадугледжвае прыезд у ЗША раз у паўгода на абследаванне і карэкціроўку заняткаў. Чарговая паездка запланаваная на 8 снежня. І, на жаль, бацькі зноў вымушаныя прасіць аб дапамозе.

Калі ласка, не праходзьце міма!

Неабыякавасць людзей робіць цуды. Калі вы можаце ахвяраваць усяго 10 000 рублёў, уявіце, колькі атрымаецца, калі гэта зробяць 1000 чалавек…

Запрашаем на наш сайт: www.dcp.by !

Дапамагчы можна, пералічыўшы сродкі на дабрачынны рахунак, адкрыты ў філіяле №514 у АСБ «Беларусбанк», УНП 100420097; МФО 153001614. Прызначэнне плацяжу: На Дубінка Вольгу Вячаславаўну для лячэння сына Базанава Эдуарда.

**У беларускіх рублях** — №000000008 (Транзітны рахунак №3819382102369 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

**У доларах ЗША** — №840000000112 (Транзітны рахунак №3819382109779 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

**У еўра** — №978000000018 (Транзітны рахунак №3819382109779 пры пералічэнні сродкаў юрасобай

**У расійскіх рублях** — №643000000009 (Транзітны рахунак №3819382109779 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

**Нумар кашальку EasyPay:** 09814460

**Нумары кашалькоў Webmoney:** Бел.рублі: B131285312953; Долары ЗША: Z310650633740; Расійскія рублі: R249762746578; Еўра: E149232757799

**Для паштовых пералікаў:** Получатель: Дубинко Ольга Вячеславовна, паспорт MP 2051911 выдан Советским РУВД г. Минска. Адрес: 220017 г. Минск, ул. Кунцевщина, 15—15.

**З павагай і бясконцай падзякай, Вольга, Павел і маленькі Эдуард**

**P.S.** Эдуард — гэта яшчэ і ўнук Вячаслава Дубінкі, знанага журналіста і пісьменніка, аўтара знакамітых выцінанак. Нядаўна ён пакінуў гэты свет: ня вытрымала сэрца.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЕЎРОПА НА ПРАВАДЗЕ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Чым бліжэй беларускія прэзідэнцкія выбары, тым больш Беларуссю цікавіцца Еўрасаюз. Здаецца, за апошні час не было такога «дэсанту» еўрапейскіх прадстаўнікоў у «сінявокую». І не было адпаведных заяў і рэзалюцый з еўрапейскага боку ў адносінах да Беларусі.**

Пасля візіту прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ Савет Еўрасаюза 25 кастрычніка працягнуў санкцыі ў дачыненні да 41 высокапастаўленага беларускага чыноўніка, уключаючы прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку, да 31 кастрычніка 2011 года. Адначасова з працягам санкцый падоўжаны мараторый на іх прымяненне ў дачыненні да 36 чалавек.

Пад дзеянне мараторыя не трапляюць пяць чалавек — былы камандзір брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС Дзмітрый Паўлічэнка, два былыя міністры ўнутраных спраў Юрый Сівакоў і Уладзімір Навумаў, былы генеральны пракурор Віктар Шэйман і кіраўнік ЦВК Лідзія Ярмошына.

Як адзначаецца ў рэзалюцыі, гатоўнасць ЕС да развіцця адносінаў з Беларуссю будзе залежаць ад прагрэсу ў галіне развіцця дэмакратыі ў краіне, у тым ліку выканання правоў чалавека і прынцыпу вяршэнства закону. ЕС таксама працягне абмеркаванне плана рэформ для Беларусі, распрацаваных Еўракамісіяй у межах Еўрапейскай палітыкі добрасуседства. Акрамя таго, не выключаецца магчымасць макрафінансавай дапамогі ЕС Беларусі ў выпадку выканання дзяржавай пэўных умоў.

У той жа час Савет ЕС выказвае занепакоенасць сітуацыяй у Беларусі ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека. Савет таксама «глыбока шкадуе ў сувязі з адсутнасцю прагрэсу» па шэрагу пытанняў, у тым ліку па далейшым рэфармаванні Выбарчага кодэкса, выкананні права на свабоду слова, СМІ, сходаў і асацыяцый.

У рэзалюцыі падкрэсліваецца, што ЕС працягне аказваць падтрымку грамадзянскай супольнасці ў Беларусі ў мэтах «развіцця плюралістычнай і дэмакратычнай атмасферы» ў краіне.

У дакуменце ўтрымліваецца заклік да беларускіх уладаў правесці прэзідэнцкія выбары ў адпаведнасці з нормамі і стандартамі міжнароднага права. Савет ЕС вітае рашэнне беларускіх уладаў запрасіць для назірання за выбарамі прадстаўнікоў БДІПЧ АБСЕ. «ЕС будзе ўважліва сачыць за развіццём сітуацыі ў час выбараў і пасля іх, — гаворыцца ў дакуменце. — Выразны і відавочны прагрэс пры правядзенні выбараў дасць новы стымул для развіцця палітыкі ЕС адносна Беларусі».

Амаль адначасова стала вядома, што ў пачатку лістапада Беларусь плануе наведаць з візітам міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі. Пра гэта паведамляе газета «Reczpospolita» са спасылкай на блізкую да польскага МЗС крыніцу. Паводле звестак газеты, Сікорскі плануе сустрэцца з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым, а таксама з прадстаўнікамі неафіцыйнага Саюза палякаў.

Больш за тое, Беларусь наведала прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуня Міятавіч. Ёй многае не спадабалася ў нашай сістэме рэгулявання СМІ, але ж сам факт яе прыезду цікавіць нашмат больш. Што яна спрабавала тут знайсці, акрамя таго, што ёй ўжо вядома? Што спрабуе тут знайсці Сікорскі? Чаго тут шукала Даля Грыбаўскайтэ?

Падаецца, Еўропа заклапочаная тым, што будзе з Беларуссю пасля прэзідэнцкіх выбараў. Пэўна, асаблівых ілюзій, якімі будуць гэтыя выбары і які будзе іх вынік, Еўропа не мае. Пакуль яна рыхтуецца максімальна наблізіць беларускія выбары да дэмакратызацыі, пры гэтым спрабуе скарыстаць знакаміты метад «бізуна і перніка». Бізун — у выглядзе падаўжэння санкцый, пернік — у выглядзе візітаў чыноўнікаў. Еўропа, аднак, не ўлічыла, што такая тактыка даўно не спрацоўвае. Як ужо не раз адзначалася (і не толькі беларускімі аналітыкамі), мясцовая ўлада разумее толькі сілу. Пернік для яе — гэта слабасць. Улада заўсёды скарыстае аргумент «нас прымаюць у Еўропе», што вельмі дарэчы на фоне абвастрэння адносінаў з Расіяй. Бізун жа стала ўспрымаецца як спроба паставіць Беларусь на калені, таму агучваецца довад: «Мы павінны супрацьстаяць знешнім ворагам». Карацей, абодва інструменты ўлада навучылася выкарыстоўваць у сваіх, адрозных ад еўрапейскіх, мэтах.

А тым часам Беларусь напаткала бяда. 25 кастрычніка адбыўся выбух на прадпрыемстве «Пінскдрэў». На тушэнні ўзнікшага пажару былі задзейнічаны больш за 10 пажарных разлікаў. На момант выбуху ў цэху, паводле папярэдніх звестак, знаходзіліся 29 чалавек.

Пад заваламі ратавальнікі знайшлі целы двух загінуўшых мужчын: аператара аўтаматычных і паўаўтаматычных ліній 1984 года нараджэння і слесара-рамонтніка 1958 года нараджэння. Потым з'явілася інфармацыя, што яшчэ адзін чалавек памёр у бальніцы. Як мяркуецца, прычынай гэтага здарэння на заводзе «Пінскдрэў-ДСП» стаў «выбух адкладанняў драўлянага пылу ў выніку парушэння рэжыму эксплуатацыі абсталявання па вытворчасці драўляна-паліўных гранул».

Гэтая падзея ўзрушыла Беларусь. Беларуская партыя зялёных у спецыяльнай заяве адзначыла, што гэтае прадпрыемства неаднаразова крытыкавалася з-за забруджвання навакольнага асяроддзя. Але ўлады на скаргі грамадзян адказвалі, што паветра ў раёне фабрыкі чыстае. Па звестках БПЗ, у Беларусі існуе практыка, калі горадастваральныя і валютастваральныя прадпрыемствы ацэньваюцца па ўзроўні забруджвання не з экалагічнага пункту погляду, а з улікам так званага прынцыпу «эканамічнай мэтазгоднасці». «Меnavіта празмернае забруджванне навакольнага асяроддзя ў выглядзе драўлянага пылу і прывяло да смерці людзей», — адзначылі ў БПЗ.

Партыя запатрабавала ад урада Беларусі неадкладна ўзмацніць кантроль над забруджваннем навакольнага асяроддзя на горадастваральных і валютастваральных прадпрыемствах і цалкам адмовіцца ад прынцыпу «эканамічнай мэтазгоднасці», а тыя прадпрыемствы, якія не здолеюць уклаcціся ў экалагічныя нарматывы забруджвання, — зачыніць.

Цікава, ці прыслухаецца ўрад да прапановаў «зялёных» хаця б пасля трагедыі? Дарэчы, еўрапейскія нормы ў пытаннях экалогіі значна больш жорсткія за нашы…



Пінск. Развітанне з ахвярамі выбуху

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА

Тэнісістка Вікторыя Азаранка перамагла ў міжнародным турніры «Кубак Крамля» з прызавым фондам 1 мільён долараў ЗША. Гэтым спартсменка пацвердзіла сваё 10-е месца ў сусветным рэйтынгу. Вікторыя выйграла ў шостай ракеткі турніру расіянкі Марыі Кірыленка ў двух сэтах. «Маша за апошні год вельмі павысіла сваё майстэрства, яна баец, заўсёды змагаецца да канца, — падзялілася ўражаннямі ад гульні Азаранка. — Самае складанае было вытрымаць у доўгіх розыгрышах, бо мы абедзве паказвалі агрэсіўны тэніс. Напачатку другога сэта Маша гуляла вельмі добра, я ж на нейкі час страціла сваю гульню, але потым разгулялася на сябе і змагла пераламаць ход матча на сваю карысць».

«Перамога ў Маскве была вельмі патрэбна перад выніковым чэмпіянатам у Досе, яна надала мне ўпэўненасці ва ўласных сілах», — сказала беларуская спартоўка на прэс-канферэнцыі пасля фіналу, паведамляе прэс-служба турніру. Вікторыя сказала: «Я вельмі хацела б вярнуцца ў Маскву ў наступным годзе і абараніць тытул. Калі буду здаровая, абавязкова прыеду, мне падабаецца гуляць у Маскве», — падзялілася планамі тэнісістка.



### СВЯТЛАНА БАЙКОВА

Старшы следчы па асабліва важных справах Генеральнай пракуратуры Святлана Байкова будзе заставацца пад хатнім арыштам яшчэ мінімум месяц. Адвакат Святланы Байковай накіраваў на імя Генпракурора хадайніцтва аб падаўжэнні месячнага тэрміна, адведзенага на вывучэнне крымінальнай справы. Супраць Байковай Камітэт дзяржбяспекі распачаў яшчэ некалькі крымінальных спраў, і следства па іх ужо ідзе. Таму цалкам магчыма, што па зноў распачатых справах могуць абраць новую меру стрымання і перавесці Байкову ў СІЗА.

Следчага Святлану Байкову затрымалі напрыканцы лютага гэтага года. КДБ тлумачыць арышт супрацоўніцы пракуратуры так: «Падчас праввядзення следчых дзеянняў, акрамя ўстаноўленых раней, былі выяўлены факты незаконных затрыманняў, прыцягнення ў якасці абвінавачаных, заключэння грамадзян пад варту, дапушчаныя Байковай у 2006–2007 гадах. Інфармацыя па справе не падлягае шырокаму асвятленню ў СМІ ў інтарэсах забеспячэння тайны следства і каб пазбегнуць уплыву на яго ход».

Святлана Байкова адной з першых пачала расследаваць крымінальныя справы, заведзеныя па артыкуле «Бандытызм». Па шэрагу расследаваных Байкавай спраў злачынцы былі асуджаныя да вышэйшай меры пакарання. Таксама праз следчую брыгаду Байковай прайшоў шэраг гучных крымінальных спраў, фігурантамі якіх былі высокія чыны з мытні, КДБ і МУС.

### ДЗМІТРЫЙ КАСПЯРОВІЧ



Беларус Дзмітрый Каспяровіч стаў бронзавым прызёрам у апорным скачку на чэмпіянаце свету па спартыўнай гімнастыцы ў Ратэрдаме. Ён адзіны з беларусаў здолеў падняцца на п'едэстал гонару. Чэмпіёнам свету тут стаў француз Тома Бухель, срэбра — у актыве расіяніна Антона Галацуцкава.

На папярэдніх топ-турнірах Дзмітрый Каспяровіч у сваім кароняным відзе спорту заваёўваў золата чэмпіянату Еўропы–2001, срэбра чэмпіянату свету–2006 і чэмпіянату Еўропы–2008. Акрамя таго, у яго калекцыі некалькі ўзнагарод у камандных спаборніцтвах у складзе зборнай Беларусі — золата чэмпіянату свету–2001, срэбра чэмпіянату свету–1997, бронза чэмпіянату свету–1999. Дзмітрыю Каспяровічу ў кастрычніку споўнілася 33 гады, па спартыўных мерках ён ужо ветэран. Заўзятары перажываюць, што школа беларускай гімнастыкі здала свае пазіцыі, і замены таленавітаму спартсмену пакуль няма.

Мужчынская зборная Беларусі па спартовай гімнастыцы ўвайшла ў лік 24 мацнейшых каманд, заняўшы 16-е месца, і атрымала права змагацца за пуцёўкі на лонданскую Алімпіяду–2012.

Жаночая зборная Беларусі па спартовай гімнастыцы па выніках кваліфікацыйных спаборніцтваў у камандным турніры не патрапіла ў лік 24 лепшых і страціла права змагацца за пуцёўкі на Алімпійскія гульні–2012. Дванаццаць пропускаў у Лондан праз год будуць разыграныя на наступным чэмпіянаце свету ў Японіі. У асабістых спаборніцтвах ні адна з беларусак не патрапіла ў фінал. Лепшай з нашых суайчынніц у шматбор'і стала Аліна Сотнікава, якая заняла 75-е месца.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# АД МОЦНАЙ ДА НЕЭФЕКТЫЎНАЙ

Сяргей НІКАЛЮК

**Калі Улада разважае пра стабільнасць, варта пацікавіцца, чыю канкрэтна стабільнасць яна мае на ўвазе.**




Са школьнага курса літаратуры я памятаю, што *«Слова у нас до важного самого в привычку входят, ветшают, как платье»*. Слова «лібералізацыя» — з таго ж шэрагу. З галоўнай трыбуны краіны яно актыўна загучала напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2001 года. Яго далейшы лёс дапаможа прасачыць інтэрнэт. Зойдзем на сайт самай салiднай газеты і скарыстаемся пошукам. Раніцай 23 кастрычніка пошукавік выдаў мне спіс у 178 артыкулаў, што ўтрымлівающь слова «лібералізацыя».

У 2001 годзе такіх артыкулаў было 29. Як правіла, іх аўтары карысталіся словазлучэннем *«либерализация экономики и стимулирование активности людей»*. Гэта прамая цытата з перадвыбарчай праграмы Лукашэнкі.

Даверлівасць — адна з базавых характарыстык выбарцаў. Але на празмерную даверлівасць пакутуюць і «залатыя пёры» дзяржаўнай журналістыкі. Прывяду прыклад: «...заява Аляксандра Лукашэнкі пра лібералізацыю была зроблена не для прыгожага слоўца. Не дзеля прапаганды. Не з мэтай спадабацца тым, у чыёй свядомасці ўжо ўмацавалася рынкавая ментальнасць. Было сказана для таго, каб зрабіць, каб выканаць дадзенае народу абяцанне» (Л. Маслюкова, 18.12.2001).

Але выбары прайшлі, і ў 2002 годзе колькасць артыкулаў у «СБ», якія ўжывалі слова «лібералізацыя», скарацілася ўдвая. У 2003 годзе іх колькасць зменшылася да васьмі, а ў 2004 — да двух! Прэзідэнцкія выбары 2006-га не ўнеслі істотных карэктываў у «дадзенае народу абяцанне» (5 артыкулаў). У год максімальных прыбыткаў ад «нафтавага афшора» Уладзе было не да лібералізацыі. Ды і расійскі рынак, перапоўнены нафтадоларамі, уражваў сваёй ненаеднасцю — толькі паспявай падвозіць.

Але колькі вяроўцы халявы не віцца, канец усё адно будзе. Падвышэнне ў два разы коштаў на расійскі газ у 2007 годзе вярнула прызабытае слова: 2008 г. — 40 артыкулаў, 2009 г. — 72 і 2010 г. — 51 (на 23 кастрычніка).

## Палавінчатыя рашэнні

Калі дзевяць гадоў таму гаворка ішла пра лібералізацыю эканомікі і стымуляванне актыўнасці людзей, то ў Пасланні–2010 лібералізацыю эканомікі мяркуецца накіраваць на разняволенне прадпрымальніцкай ініцыятывы. Ключавая роля ў разняволенні (цікава, хто і калі яе запрыгоніў?) адведзеная Дырэктыве № 4.

Тэкст Паслання–2010 агучылі 20 красавіка. З таго памятнага дня таполі за маім акном паспелі пакрыцца лістотай, за што я быў ім шчыра ўдзячны ў анамальна гарачыя дні другой паловы лета. Аднак, у поўнай адпаведнасці з каляндарным планам, надышла восень, і 2 верасня са старонак ужо згаданай газеты прагучала пытанне: «Дзе ж яна?». З таго часу ад былых тапалевых шавялюраў засталіся адны ўспаміны. Ужо нават адважылася выпасці і першыя нясмелыя сняжынкі-дыяменты, але ўцямнага адказу на, здавалася б, элементарнае пытанне так і не з'явілася.

Праблема, аднак, не абмяжоўваецца шматразова сарванымі тэрмінамі. Прадпрымальнікаў, г. зн. грамадзян, чыя рынкавая ментальнасць «ужо ўмацавалася», непакоіць ступень абяцанага разняволення. Свае хваляванні кіраўнікі трох прадпрымальніцкіх саюзаў выказалі ў адкрытым лісце, накіраваным на адрас першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Прыводжу фрагмент допісу: «На вялікі жаль, паводле нашай інфармацыі, шматлікія ідэі і прапановы ўжо не знаходзяць свайго месца ў праекце гэтага дакумента. Палавінчатыя рашэнні, расплывістыя фармулёўкі, нормы, якія нічога не змяняюць, усё больш пачынаюць пераважаць у цяперашняй рэдакцыі праекта Дырэктывы».

Тут самы час перайсці ад фактаў да азбучных ісцін паліталогіі.

## Клапатлівая рука самародка

У фінале вядомага анекдота пра вожыка ёсць такія словы: «Я моцны, моцны, але вельмі лёгкі». У нашым выпадку пасля слоў «я моцны, моцны» можна смела паставіць: «але вельмі неэфектыўны». Мяркую, чытач здагадаўся, што пад займеннікам першай асобы адзіночнага ліку хаваецца родная дзяржава. Менавіта сіла з'яўляецца яе галоўнай характарыстыкай, і гэту сілу дзяржаве забяспечвае «вертыкаль улады». Такая афіцыйная версія.

На «вертыкаль улады» ўскладзена роля рычага, які *«позволяет нам концентрировать ресурсы на главных направлениях развития»*. З гэтым не паспрачаешся. Перафразоўваючы Архімеда антычнага, сучасны беларускі Архімед мог бы смела заявіць: «Дайце мне дармовыя рэсурсы, і я пабудую рынкавы сацыялізм».

Канцэнтрацыя і цэнтралізаванае непаразмеркаванне рэсурсаў — гэта прывітанне ад нярынкавай эканомікі. Гэта прывітанне са свету неэфектыўнага кіравання. Для пацвярджэння такой рашучай заявы спашлюся на аўтарытэт Сусветнага банка, які рэгулярна публікуе даклады пра якасць дзяржаўнага кіравання ў краінах свету.

У табліцы адлюстраваны сукупныя рэйтынгі краін па шасці індэксах якасці дзяржаўнага кіравання за 1996–2008 гады: 1) улік думкі насельніцтва і падсправаздачнасць дзяржаўных органаў; 2) палітычная стабільнасць і адсутнасць гвалту; 3) эфектыўнасць працы ўрада; 4) якасць заканадаўства; 5) вяршэнства закона; 6) стрымліванне карупцыі. Чым ніжэйшы рэйтынг, тым горшая якасць дзяржкіравання (рэйтынгі змяняюцца ад 0 да 100).

У цэлым па сусветнай эканамічнай шкале за мінулае дзесяцігоддзе рэйтынгі змяніліся нязначна. Што да Беларусі, то разам з Зімбабве, Кот д'Івуарам, Эрытрэяй і Венесуэлай яна апынулася ў групе краін, якія павольна, але ўпэўнена зніжаюць якасць дзяржкіравання.

| Дзяржава | Індэкс №1 | Індэкс №2 | Індэкс №3 | Індэкс №4 | Індэкс №5 | Індэкс №6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусь | 7 | 61 | 12 | 10 | 17 | 24 |
| Латвія | 73 | 59 | 70 | 81 | 71 | 65 |
| Літва | 72 | 72 | 72 | 85 | 67 | 63 |
| Польшча | 73 | 74 | 68 | 74 | 65 | 68 |
| Расія | 22 | 24 | 45 | 31 | 20 | 15 |
| Расія | 47 | 44 | 33 | 39 | 31 | 28 |
| Венесуэла | 30 | 12 | 17 | 5 | 3 | 9 |
| Кітай | 6 | 33 | 64 | 46 | 45 | 41 |
| Паўночная Карэя | 0 | 58 | 0 | 0 | 14 | 0 |
| Паўднёвая Карэя | 65 | 60 | 86 | 73 | 74 | 70 |

Усё, чым можа пахваліцца рэспубліка-партызанка на сённяшні дзень, — гэта стабільнасць (індэкс № 3). Для таго, каб зразумець, якім шляхам яна дасягаецца, прывяду фрагмент даклада на III Усебеларускім народным сходзе: «Дзяржава па-ранейшаму павінна трымаць руку на пульсе жыцця грамадства ва ўсіх галінах: забяспечваць законнасць і парадак, стабільнасць і спакой, бяспеку і абарону сваіх грамадзян».

Клапатлівую руку на пульсе жыцця грамадства адчуваюць сёння не толькі палітычна, але і эканамічна актыўныя беларусы. Нездарма ж у чарговы раз на парадак дня пастаўлена пытанне пра разняволенне прадпрымальнікаў. Што да законнасці і парадку, то, мяркуючы па індэксах № 4 і № 5, тут дзяржаўная рука вельмі неэфектыўная. Вось і даваліся насельніцтву для абароны сваіх правоў звяртацца да подкупу службоўцаў, г. зн. карупцыі (індэкс № 6).

Дзеля справядлівасці адзначу, што меркаванне Сусветнага банка падзяляюць у нас далёка не ўсе. Так, акадэміку Рубінаву з крэсла старшыні Савета Рэспублікі адкрываецца прынцыпова іншая карціна: «Нам пашанцавала ў тым, што ў самым пачатку нашага дзяржаўнага будаўніцтва краіну ўзначаліў А.Р. Лукашэнка — таленавіты самародак з народа, які вызначыў самыя эфектыўныя і бязбольныя шляхі нашага развіцця, здолеў згуртаваць народ, выбудаваць сістэму кіравання дзяржавай, аб'яднаў высілкі ўсіх грамадзян на рашэнне самых галоўных, жыццёва важных задач».

## Вялікая праблема маленькай зарплаты

Перад любым грамадствам стаяць дзве ўзаемавыключныя задачы: захаванне стабільнасці і адаптацыя да зменлівых умоў. Гэта вырашаецца за кошт своеасаблівага падзелу працы. Улада (дзяржава) бярэ на сябе адказнасць за стабільнасць, а грамадства — за адаптыўную зменлівасць. Суладная праца тандэма дазваляе паспяхова супрацьстаяць Будучыні з яе прынцыповай непрадказальнасцю. Няцяжка здагадацца, што там, дзе рука моцнай дзяржавы сціскае грамадства за горла, немагчымы пошук інавацый ні ў палітыцы, ні ў эканоміцы, ні ў культуры.

Будучыня гуляе супраць нас, выкарыстоўваючы выпадковую стратэгію. Тэорыя гульняў падказвае, што супраць выпадковай стратэгіі любая рацыянальная, дэтэрмінаваная стратэгія робіцца неэфектыўнай. Выстаўце супраць дваровай футбольнай каманды зборную каманду свету, гульцы якой абавязаны строга выконваць загадзя распісаныя трэнерам хады, і лік у такой гульні будзе трохзначны. Таму калі родная Улада стварае на свой лад канструктыўныя структуры грамадства і цвёрда душыць неканструктыўныя, яна пазбаўляе беларускую нацыю асноўнага рэсурсу выжывання.

Высокая стабільнасць не гарантуе поспехаў па іншых кірунках. Звярніце ўвагу на два апошнія радкі табліцы. Рэйтынгі стабільнасці (індэкс № 2) у Паўночнай Карэі і ў Карэі Паўднёвай практычна аднолькавыя. Вось толькі «паўднёўцы» ўвесь час балансуюць на мяжы галоднай смерці, у той час як іх браты па крыві і культуры на поўначы стварылі адну з самых эфектыўных эканомік сучаснага свету.

Стабільнасць, як шматразова падкрэсліваe сацыёлаг Георгій Сатараў, ніколі не бывае чыннікам чагосьці. Яна сама ёсць вынік, і вынік заўсёды часовы, інакш не было б ніякага развіцця. На чым трымаецца беларуская стабільнасць? На высокім рэйтынгу адзінага палітыка, які, у сваю чаргу, забяспечваецца ростам рэальных прыбыткаў насельніцтва. Сам адзіны палітык ад такога забеспячэння свайго рэйтынгу актыўна адмаўляецца: *«Не надо упрекать, я работаю спокойно, никогда не покупаю избирателей. Мне это не надо»*. Аднак сфармуляваны на II Усебеларускім сходзе прынцып беларускай стабільнасці, тым не менш, застаецца ў сіле. Нагадаю яго чытачам «НЧ»: *«Нельзя не признать справедливость истины о том, что маленькая зарплата способна разрушить даже самое сильное государство»*.

Сусветны крызіс прымушае сёння ўрады еўрапейскіх дзяржаваў перагледзець сацыяльныя абавязацельствы ў бок паніжэння. У адказ мільёны выходзяць на мітынгі пратэсту. Ці здольная такая актыўнасць разбурыць еўрапейскую дзяржаўнасць? Мяркую, што не здольная. А вось кіруючым партыям паўторна перамагчы на выбарах будзе цяжка. Але гэта праблемы кіруючых партый, а не дзяржаваў. У гэтым карэннае адрозненне цывілізаванага свету ад свету, у якім адзінай крыніцай згуртавання народа выступае «таленавіты самародак».

ВЫБАРЫ

# «ПЛОШЧА — УСЯГО ТОЛЬКІ ЧАСТКА СЦЭНАРУ»

Працяг. Пачатак на стар. 1.




***— Наколькі важна — ці будзе адзіны кандыдат ад апазіцыі, ці некалькі?***

— Не думаю, што колькасць кандыдатаў адыгрывае стратэгічную ролю. Па вялікім рахунку, не мае істотнага значэння, колькі людзей выйдзе на плошчу. Таму гэта тактычнае пытанне.

Узгадаем 2001 год — адзіны кандыдат фармальна быў. Насамрэч на плошчу мала хто выйшаў. У 2006 годзе быў Казулін і быў кандыдат Мілінкевіч са статусам адзінага. На плошчу народ выйшаў і за таго, і за другога.

Зараз шмат шараговых удзельнікаў тых падзей кажуць, што Казулін быў сапраўды маральным лідэрам. Ён павёў людзей за сабой. А Мілінкевіч, маўляў, гэтым не скарыстаўся.

Але беларуская палітычная сістэма не настолькі архаічная, каб лідэр на плошчы аўтаматычна ператвараўся ў палітычнага правадыра. Мы памятаем, як спадар Казулін вёў людзей да Акрэсціна. Аднак гэта не зрабіла яго палітычным лідэрам усёй апазіцыі. Седзячы за кратамі, ён меў вялікі маральны і палітычны аўтарытэт. А пасля, калі выйшаў з турмы, перастаў быць істотнай фігурай на беларускай палітычнай арэне.

***— Якую пазіцыю зойме Расія ў дачыненні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі?***

— З тых выказванняў, якія даводзіцца чуць ад Някляева, ад Раманчука, ад таго ж Саннікава, узнікае падазрэнне, што яны перабольшваюць значасць расійскага ціску. Гэта хібны шлях. Наяўнасць расійскага ціску карэнным чынам сітуацыю на праспекце Незалежнасці, на Кастрычніцкай плошчы альбо на плошчы Незалежнасці ў Мінску не зменіць. Не думаю, што Расія сапраўды мае планы маніпуляваць газавымі кранікамі і коштамі на нафту такім чынам, каб на плошчу выйшлі сотні тысяч чалавек.

Усе цудоўна разумеюць, што ніводзін алігарх з Расіі (беларускі ці небеларускі) не будзе ўкладаць грошы ў палітычныя кампаніі ў іншых краінах без санкцыі расійскай улады. Таму Масква ў беларускіх выбарах удзельнічае. Пытанне, наколькі актыўна. Ці з'яўляюцца палітычныя кампаніі, якія фінансуюцца праз Расію, спробай замены дзеючага прэзідэнта на іншага? Ці гэта толькі працяг ціску, каб палохаць Лукашэнку і прымусіць пайсці на саступкі?

***— А які ваш адказ на гэта пытанне?***

— Мне падаецца найбольш верагодным сцэнар, які Расія ўжо неаднаразова выкарыстоўвала. Яна палохае Лукашэнку па палітычным, эканамічным, медыйным напрамках. Мы бачым стратэгію Расіі на постсавецкай прасторы. Не важна, хто кіруе ў Мінску, Кіеве ці Бішкеку. Трэба зрабіць такую мадэль узаемадзеяння з краінамі, каб любы, хто там кіруе, выконваў стратэгічныя расійскія інтарэсы.

У 1989 годзе Гарбачоў заявіў, што СССР перастае ўмешвацца ва ўнутраныя справы краінаў народнай дэмакратыі. І гэта паўплывала на дэмакратызацыю ў гэтых краінах. У гэтым палягае розніца — адмовіцца ад умяшання альбо ўмешвацца з пэўнымі мэтамі. Калі Расія насамрэч адмовілася ад падтрымкі Лукашэнкі, то ёй дастаткова спыніць яго фінансавую падтрымку.

***— Як адрэагуюць людзі на заклік выйсці на плошчу?***

— Пытанне ў матывацыі людзей. У тым, ці будуць яны бачыць сэнс гэтага выхаду.

Накачванне сацыяльных трансфертаў пры наяўных эканамічных цяжкасцях працуе на тое, што людзі хоць і незадаволеныя, але не выяўляюць жадання пратэставаць. Лукашэнку будзе складана падтрымліваць узровень сацыяльных гарантый, якія дазваляюць людзям не цікавіцца палітыкай. Але ж гэта магчыма ў кароткачасовай перспектыве шляхам напружвання ўсёй эканомікі. Тое, што да канца будзе ў рознай ступені падтрымліваца, — гэта буйныя заводы ў Мінску. Лукашэнка баіцца ўласнага народа — гурту на плошчы, які складаецца не з рамантычных хлопчыкаў і дзяўчынак, а з працоўных прамысловых прадпрыемстваў. І пакуль гэтыя працоўныя на плошчу не пойдуць.

Плошча, на якую выходзіць дэмакратычны актыў ці студэнцтва, не страшная для ўлады. Бо туды прыходзяць, каб выказаць маральную пазіцыю, праявіць незадаволенасць рэжымам, паказаць адзін аднаму, што «мы ёсць». А вывесці на плошчу людзей, якія туды не хочуць ісці, — вось гэта амбітная задача. Вось гэта плошча, якая прыводзіць да змены ўлады.

ВІЗІТ

# НОВАЯ СТАРОНКА

Генадзь КЕСНЕР

**Завяршыўся візіт у Беларусь прадстаўніка АБСЕ ў пытаннях свабоды слова Дуні Міятавіч.**

Вынікі свайго знаходжання ў беларускай сталіцы яна падсумавала на прэс-канферэнцыі 27 кастрычніка.

У Мінску спадарыня Міятавіч правяла сустрэчы з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым, міністрам інфармацыі Алегам Пралясkоўскім, старшынёй ЦВК Лідзіяй Ярмошынай, начальнікам Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Усеваладам Янчэўскім. А таксама — са старшынёй БАЖ Жаннай Літвіной і яе намеснікамі Аляксандрам Старыкевічам і Андрэем Бастунцом, галоўным рэдактарам недзяржаўнай газеты «Народная воля» Іосіфам Сярэдзічам, а таксама з беларускімі журналісткамі, якія сёлета папалі пад пераслед уладаў, — Марынай Коктыш, Святланай Калінкінай, Ірынай Халіп і Наталляй Радзінай.

«Заканадаўства аб СМІ павінна спрыяць з'яўленню і развіццю СМІ і плюралізму, а не абмяжоўваць іх дзейнасць… Я сказала ўладам, што неабходна тэрмінова зрабіць захады па заахвочванні і падтрымцы аслабленых незалежных СМІ і стварыць умовы для з'яўлення механізма незалежнай самарэгуляцыі СМІ», — адзначыла Дуня Міятавіч.

Паводле яе слоў, падчас афіцыйных сустрэч закраналіся і пытанні неабходнасці прыватызацыі дзяржаўных мас-медыя, адмены крымінальнага пераследу СМІ за дыфамацыю. «Я таксама заклікала беларускія ўлады да распрацоўкі і прыняцця закону аб доступе да інфармацыі, якога сёння ў Беларусі няма… Я вельмі спадзяюся, што мой візіт будзе новай старонкай у гісторыі стварэння свабоднай прэсы і свабодных СМІ ў Беларусі, і я прапаную любую дапамогу і падтрымку з боку майго офіса, каб зрабіць гэта магчымым», — заявіла прадстаўнік АБСЕ у пытаннях свабоды слова Дуня Міятавіч.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# НАФТА І РЭВАЛЮЦЫЯ

**Бадай што кожны з візітаў прэзідэнта Венесуэлы ў Беларусь абуджаў у мяне смутныя ўспаміны. Узнікала пачуццё нейкай неакрэсленай трывогі, якое, па шчасці, знікала адразу ж пасля ад'езду сябра Чавеса.**

А зараз прыгадаўся сюжэт «Аднапавярховай Амерыкі» Ільфа і Пятрова. Стары каўбой распавядае пра нейкага індзейца з племені навага, што раптам вырашыў заняцца гандлем. У індзейца нейкім чынам з'явіўся ладны капітал — ці то скаціну прадаў, ці то нафту на сваім участку, але грошы завяліся. Паехаў ён у горад, набыў розных тавараў, прывёз у сваё паселішча. Гандаль распачаўся бойкі, але, па словах каўбоя, не зусім звычайны. Нават узнікала пытанне, ці не з'ехаў гандляр з глузду? Бо прадаваў ён тавары па той жа цане, па якой сам купляў. І ніяк не мог зразумець, што тавар, набыты за долар, трэба прадаваць за долар дваццаць, каб не разарыцца. На аргументы, што ў гэтым і ёсць сэнс гандлю як занятку, які дазваляе зарабіць грошы, ён адказваў, што гэта падман.

Так і гандляваў сумленны індзеец, аж пакуль не надакучыла. Адзінае камерцыйнае прадпрыемства з індзейскім капіталам у племені ляснула.

Астапа Бэндэра б туды з грашыма Сашы Карэйкі. У той час савецкі мільён, мусіць, каштаваў больш за дзвесце долараў індзейца з кнігі вялікіх сатырыкаў.

І па ўсім выходзіць, што мару Бэндэра (ды яшчэ як!) здолеў ажыццявіць беларускі прэзідэнт. Не ў Бразіліі, праўда, а ў Венесуэле, але затое там не меней індзейцаў, чым у племені навага. Ёсць дзе разгарнуцца. Бо калі нармальны гандаль з яго пасярэдніцкімі надбаўкамі — справа ўзаемавыгадная, то што казаць пра гандаль з венесуэльцамі, якія, магчыма, прадаюць Лукашэнку нафту па сабекошце? А ён у Венесуэле такі мізэрны, што бензін каштуе танней, чым вада з Арынока.



Падумаеш — дух займае. Усяго многа і за малыя грошы. Можа, гэта меў на ўвазе Лукашэнка, калі дзякаваў сябру Чавесу за тое, што ён падставіў Беларусі плячо і працягнуў руку ў цяжкі момант. Але ж калі чуеш пра працягнутую руку, то чакаеш удакладнення. Прыкладам, нашы заўжды яе працягваюць далонню ўверх. На ўсялякі выпадак — раптам хто грошык пакладзе. Але падобна на тое, што ў выпадку з Чавесам гэты нумар не праходзіць. Згодна апошнім статыстычным звесткам, у Расіі Беларусь купляе нафту па 402 долары за тону, а ў Венесуэлы — па 647. Атрымліваецца, што натуральнае дзіця прыроды, індзеец з племені Навага, усё ж такі болей разумеў у гандлі, чым нашы ўрадоўцы, якія заварылі ўсю гэту кашу. Купляць заморскі тавар у паўтары разы даражэй, чым у бліжняга суседа, ды яшчэ шчыра дзякаваць пры гэтым прадаўцу?..

Далібог, нешта тут не так. Як на самай справе разумець словы А. Лукашэнкі: «Вітаю цябе на ўжо тваёй беларускай зямлі...»? Як гульню двух дэмакратычных прэзідэнтаў-цэзараў? А калі сапраўды гэта зямля ўжо яго, а не наша? Бо нездарма ж так Расія апошнім часам крывіцца. Абяцаў ім, а аддаў Чавесу?

Не, нешта не так з гэтым беларуска-венесуэльскім гандлем. Пакуль што гандлёвае сальда нават горшае, чым з Расіяй. Набылі за восем месяцаў нафты на 400 мільёнаў долараў, а сваіх тавараў прадалі толькі на 200. Нават спецыялісты па знешнегандлёвай дзейнасці чухаюць патыліцы — нешта не так, нехта некага ці ўжо абдурыў, ці збіраецца. Лукашэнка не выканаў (не трэба было звязвацца!) сваіх абавязацельстваў перад Расіяй, а запэўнівае, што не хоча быць вінаватым перад Чавесам. І дзякуе... За што? Што атрымаў такую дарагую нафту, перапрацоўваць якую можна толькі коштам павелічэння эканамічных страт?

Як хочаце, нешта тут не тое. Няма ніякай празрыстасці ў гэтай таемнай дыпламатыі. Які бізнес пры гэтым мае барышы, беларусы насамрэч не ведаюць. А пажадана б ведаць.

Пабажыцца можна, што на гэтым фоне нават вялікі камбінатар выглядае такім жа працяком, як Шура Балаганаў.

Мусіць, нам не трэба ведаць, пра што прэзідэнты гутарылі тры з паловай гадзіны сам-насам. У вуснах такіх высокіх асобаў нават разважанні пра надвор'е перастаюць быць банальнымі. А тут такая справа — з «чорным золатам» звязаная. На такіх звычайна нажываюцца мільярды ды распачынаюцца войны з рэвалюцыямі. Чавес паабяцаў, што мы абавязкова адчуем усе яе наступствы. Што, дзе і калі?

Як паказвае практыка, А. Р. Лукашэнка нам гэтага ніколі не скажа. Адна надзея на Чавеса, па словах якога, Баліварская рэвалюцыя знайшла ў цэнтры Еўропы брацкі народ і запасную радзіму. Але Беларусь ужо ёсць такой для кіргізскага прэзідэнта. Магчыма, і для Чавеса месца хопіць. А калі і тут ён зробіць рэвалюцыю? З яго тэмпераментам не быць рэвалюцыянерам цяжка. А з улікам таго, што не ўся яго палітыка звязана з вялікімі грашыма, — немагчыма.

ЭКАЛОГІЯ

# НАРАЧ: ПАГРОЗЫ МАДЭРНІЗАЦЫІ

Вольга ХВОІН

**У Нацыянальным парку «Нарачанскі» адбыліся грамадскія абмеркаванні Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі праекта (СЭА) «Схема комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Мядзельскага адміністрацыйнага раёна» (СКТА). У адрозненні ад леташніх грамадскіх слуханняў па АЭС на Астравеччыне, у курортным пасёлку Нарач усё прайшло ціха-мірна, без рэзанансу і ў вузкім коле спецыялістаў. Але гэта не перашкодзіла знайсці слабыя і моцныя бакі стратэгічнай экалагічнай ацэнкі праекта.**

Асноўныя кірункі тэрытарыяльнага развіцця Мядзельскага раёна распрацоўваліся ў кантэксце мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы па экалагічным аздараўленні возера Нарач, зацверджанай указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №71 ад 14 лютага 2005 года. Таксама падставовымі з'яўляюцца агульныя кірункі стратэгіі тэрытарыяльнай арганізацыі Мядзельскага рэгіёна ў структуры Мінскай вобласці і Беларусі. Праект мусіць рэалізоўвацца на працягу 2010–2025 гадоў.

Тэрыторыя раёна мае спецыфічныя ўмовы. Тут знаходзіцца Нацыянальны парк «Нарачанскі», курортна-рэкрэацыйная зона «Нарач» агульнаю плошчай 58,5 тысячы гектараў, зона адпачынку рэспубліканскага значэння «Вілейка» (5 тысяч гектараў) і зоны адпачынку мясцовага значэння «Узлянка» (4,5 тысячы гектараў), мноства азёр (57), у тым ліку і Нарач. Усё гэта мае гаспадарчае і прыродаахоўнае значэнне, уплывае на планы сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна.



Існуе асобная дзяржпраграма развіцця Нарачанскага краю, большасць яе мерапрыемстваў мусяць быць выкананыя да 2014 года. У праграме задзейнічана 143 населеныя пункты з агульнай колькасцю жыхароў 22 тысячы чалавек, у тым ліку Мядзел, пасёлкі Свір і Нарач. Ужо ідзе рэканструкцыя шэрагу гасцініц і санаторыяў, плануецца будаўніцтва гасцявых домікаў, баз адпачынку і іншых турыстычных аб'ектаў. Ідзе добраўпарадкаванне тэрыторый. Некаторыя праекты будуць прафінансаваныя замежнымі фундатарамі. Напрыклад, з удзелам ізраільскага капіталу плануецца стварыць парк сельскагаспадарчых тэхналогій. Ёсць зацікаўленасць у рэстаўрацыі архітэктурнага помніка XIX стагоддзя ў раёне Блакітных азёр.

Каб сфармаваць спрыяльны клімат для развіцця прыватнага бізнесу для суб'ектаў гаспадарання, якія рэалізуюць інвестыцыйныя праекты ў Нарачанскім краі, уводзіцца пяцігадовы мараторый на выплату падатку на нерухомасць, падатку на прыбытак, зямельнага падатку. Таксама гэтыя суб'екты вызваляюцца ад адлічэнняў у інавацыйны фонд Мінскага аблвыканкама і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, ад выплаты сродкаў, што спаганяюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пры выдачы дазвольнай дакументацыі на будаўніцтва і (або) рэканструкцыю аб'ектаў, і платы за права заключэння дамовы арэнды зямельных участкаў.

Цяпер на тэрыторыі раёна дзейнічае турыстычна-экскурсійны комплекс, 16 арганізацый санаторнага і аздараўленчага профілю для адпачынку дарослых і дзяцей. У адпаведнасці з дзяржаўнай схемай комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі краіны, Мядзельскі раён аднесены да групы раёнаў з прыярытэтнай рэкрэацыйнай функцыяй. Таму ў рэгіёне прапануецца развіваць менавіта турыстычна-рэкрэацыйную дзейнасць і ствараць інфраструктуру для адпачынку і падвышэння прывабнасці Нарачанскага краю для турыстаў, у тым ліку і з-за мяжы.

## Прырода мусіць «пасунуцца»

З боку эколагаў і экспертаў, якія рыхтавалі крытыку «Схемы комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Мядзельскага адміністрацыйнага раёна», быў агучаны шэраг прэтэнзій, што звязаны з непралічаным вынікам ад павышэння антрапагенных нагрузак на рэгіён. Напрыклад, даводзіцца, што падчас ацэнкі прыдатнасці тэрыторыі для прыярытэтных функцый у СКТА толькі часткова ўлічвалася інфармацыя наконт месцаў жыцця рэдкіх жывёл, раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Спецыяліст па экатурызму Ігар Пастухоў гаворыць, што неабходна правесці адмысловую інвентарызацыю тэрыторыі нацпарка, каб у далейшым не мець праблем з непадкантрольным знішчэннем важных гісторыка-культурных аб'ектаў. Аўтары стратэгічнай экалагічнай ацэнкі праекта раяць рабіць ацэнку ўздзеяння на навакольнае асяроддзе для кожнага інвестыцыйнага праекта, які будзе рэалізоўвацца на тэрыторыі Мядзельскага раёна. «Гэтая працэдура дазволіць сабраць звесткі пра месца знаходжання ахоўваемых відаў раслін і жывёл», — прапанаваў эксперт СЭА Руслан Навіцкі.

Аўтары стратэгічнай экалагічнай ацэнкі праекта звяртаюць увагу і на неабдуманы пераход на мясцовыя віды паліва. На тэрыторыі Мядзельскага раёна няма буйных прамысловых прадпрыемстваў. Таму асноўнымі крыніцамі забруджвання паветра з'яўляюцца прадпрыемствы камунальнай гаспадаркі, харчовыя прадпрыемствы і здраўніцы, якія маюць на балансе кацельні для забеспячэння ўласных патрэб. Тэндэнцыя павелічэння выкідаў аксідаў серы, цвёрдых часцінак у паветра ў тым ліку звязаная і з пераходам кацельных на мясцовыя віды паліва. Эксперты сцвярджаюць, што ўвядзенне ў эксплуатацыю кагенерацыйных установак у кацельнях будзе спрыяць паніжэнню выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу і эканоміі энерганосьбітаў. Асабліва гэта тычыцца свінакомплексаў, птушкагадоўчых гаспадарак, прадпрыемстваў ЖКГ.

Яшчэ адна праблема рэгіёна таксама звязаная з сельскагаспадарчай спецыялізацыяй. На тэрыторыі Мядзельшчыны знаходзіцца шэраг могільнікаў для скаціны, у тым ліку адзін з захаваннем парэшткаў жывёлы, хворай на сібірскую язву. Спецыяліст УП «БелНДІгорадабудаўніцтва» Яўген Календа гаворыць, што для такіх аб'ектаў вызначана санітарная зона ў радыусе тысячы метраў. «Тое, што на тэрыторыі раёна ёсць могільнікі, — нармальна, гэта тыпова для сельскай гаспадаркі. Але праблема ў тым, што большасць з іх хаатычныя. У будучым можна было знішчыць шэраг асобных скотамогільнікаў і арганізаваць некалькі буйных, падкантрольных. Да таго ж на тэрыторыі Мядзельшчыны знаходзіцца чатыры язвенныя могільнікі, і адзін з іх на тэрыторыі водазабора Нарачы. Імгненна вырашыць праблему немагчыма, але праводзіць іх рэкультывацыю неабходна», — зазначае Яўген Календа.

## Забыліся на АЭС

Абурэнне эколагаў выклікала прапанова скараціць плошчу запаведных зон з 13,81 да 8,43 тысячы гектараў шляхам пераводу іх у зону строгага рэгулявання. «Прыкладам падобных «зон строгага рэгулявання» сталі сумна вядомыя выразаныя пляцоўкі Белавежскай пушчы, Чырвонага Бора, Сарачанскіх азёр у раёне возера Бараньскае ды іншыя», — гаворыць былы дырэктар заказніка «Сарачанскія азёры» Ігар Пастухоў. На гэта эксперт СЭА Руслан Навіцкі зазначыў, што распрацоўшчыкі СКТА дапусцілі памылкі і парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства Беларусі ў частцы аднясення асабліва ахоўных прыродных тэрыторый да зон рэгуляванага выкарыстання. І гэта мусіць быць выпраўлена.

Цікава, што ў праекце не пазначана магчымае ўздзеянне АЭС на тэрыторыю Мядзельшчыны. Аўтары праекта патлумачылі гэта тым, што на час распрацоўкі праекта рашэнне пра будаўніцтва станцыі яшчэ не было прынята. Ацэнку экалагічнага і антрапагеннага ўздзеяння на рэгіён давядзецца праводзіць асобна.

Загадчыца аддзела турыстычна-рэкрэацыйных прыродных тэрыторый і аховы навакольнага асяроддзя УП «БелНДІгорадабудаўніцтва» Святлана Сахарава зазначыла, што яна і іншыя спецыялісты, якія рыхтавалі абгрунтаванне Астравецкай пляцоўкі, першапачаткова былі супраць будаўніцтва атамнай станцыі ў рэгіёне, бо вынік негатыўнага ўздзеяння АЭС на запаведныя тэрыторыі можа быць знішчальным.

## Соцыум у пралёце

Мясцовыя жыхары да абмеркавання планаў па развіцці раёна зацікаўленасці не праявілі. На слуханнях выступіў толькі адзін чалавек з тутэйшых, і яго прэтэнзіі былі найперш звязаныя з тым, што распрацоўшчыкі праекта нічога не прапанавалі, каб зацікавіць у развіцці раёна моладзь.

«Я магу адказаць на пытанне, чаму мясцовыя жыхары не ўмешваюцца. Яны баяцца, каб не было чаго кепскага, каб на сваю шыю праблем не знайсці. Людзі думаюць: «Сёння дзень прайшоў — і добра, а нашы дзеці тут жыць не будуць». Я не пабачыў у праекце нічога для соцыуму, — выказаў сваю ацэнку Генадзь Куцкевіч. — А я хачу, каб мае дзеці жылі на гэтай зямлі, зямлі дзядоў. А тут, у вёсках, застаюцца толькі людзі сталага веку». На што аўтары схемы комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Мядзельскага адміністрацыйнага раёна патлумачылі, што ўсё залежыць ад фінансавання, якое будуць мець праекты. Аднак пра самі сацыяльныя праекты ў дакуменце нічога не гаворыцца.

Ігар Пастухоў гаворыць, што неабходна правесці адмысловую інвентарызацыю тэрыторыі нацпарка, каб не мець праблем з непадкантрольным знішчэннем гісторыка-культурных аб'ектаў

ГРОШЫ

# ГРАМАДСКАСЦЬ ПА-ЗА БЮДЖЭТАМ

**Часовы паверааны ў справах ЕС у Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель і прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніўс Брук падпісалі дамову аб вылучэнні больш за 5 мільёнаў еўра на новы праект у сферы аховы навакольнага асяроддзя.**

Праект будзе рэалізоўвацца на працягу трох гадоў у супрацоўніцтве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Ён называецца «Садзейнічанне развіццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь». Дзейнасць праекта будзе накіраваная на развіццё нарматыўнай базы Беларусі ў сферы кіравання воднымі рэсурсамі, абыходжання з адыходамі, захавання біялагічнай разнастайнасці, экалагічнай сертыфікацыі і г. д., а таксама на рэалізацыю пілотных праектаў, што датычаць абароту цвёрдых бытавых адыходаў і захавання біяразнастайнасці. Адзін з кампанентаў праекта будзе накіраваны на падвышэнне ўзроўню дасведчанасці шырокай грамадскасці ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.

Такая шырокая фінансавая дапамога выклікае не толькі пазітыўныя водгукі, але і пытанні наконт яе мэтазгоднасці. Так, шэраг экалагічных грамадскіх арганізацый выказалі занепакоенасць тым фактам, што пры супрацоўніцтве з дзяржструктурамі мае месца разыходжанне слоў і справы. То бок на паперы дэкларуецца абавязковы ўдзел грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і існуе цэлы пералік механізмаў уцягвання грамадзян у абмеркаванне і прыняцце рашэнняў, а на справе — нават інфармацыя наконт грамадскіх слуханняў па тым ці іншым праекце распаўсюджваецца за некалькі дзён да абмеркавання.

Сітуацыя з рэалізацыяй праектаў у Беларусі часта аднолькавая — удзел грамадскасці забяспечвае, як правіла ПРААН, які працуе не ва ўсіх праектах, што ўвасабляюцца ў жыццё ў Беларусі. Да прыкладу, экаарганізацыі ўдзельнічалі ў распрацоўцы Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2020 года, якая рабілася пры падтрымцы ПРААН, але зараз, падчас працы над Нацыянальнай стратэгіяй да 2025 года, грамадскасць не інфармуецца пра ход спраў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №11 (49) (кастрычнік)

www.lit-bel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: падзеі літаратурна-грамадскага жыцця..........с. 2
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Васіля ЗУЁНКА..........с. 3
«ПРОЗА»: апавяданне Віталя БЫЛЯ..........с. 4
«ПАЭЗІЯ»: вершы Макса ШЧУРА..........с. 5
«ПЕРАКЛАД»: «Хто забіў Паламіна Маляро» ад нобельскага лаўрэата Марыё Варгаса ЛЬЁСА..........с. 6–7
«ЧЫТАЛЬНЯ»: заканчэнне дэбютнай аповесці Сяргея ЕГАРЭЙЧАНКІ..........с. 8–9
«ПРОЗА»: апавяданне Алеся ТАРАНОВІЧА..........с. 10
«ШКАЛЯРЫЙ»: урок беларускай гісторыі ад Уладзіміра АРЛОВА..........с. 11–12
«ЭСЭ»: згадкі Яўгена ЛЕЦКІ пра Міколу ДЗЯШКЕВІЧА..........с. 13
«КРЫТЫКА»: літагляд новага нумара часопіса «ДЕЯСЛОЎ» ад ЛеГАЛА..........с. 14–15
«СВЕТ»: літнавіны замежжа, акцыя і конкурс..........с. 16


АКТУАЛІІ

# ГОНКА БЕЗ ПРАВІЛАЎ,

## АБО ЯК Я ЗБІРАЛА ПОДПІСЫ ЗА РЫМАШЭЎСКАГА

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, паэтэса, валанцёр

**У адрозненне ад іншых валанцёраў, якія пачыналі абход з суседзяў ці знаёмых, я адразу падалася ў чужы дом. Першы збор выдаўся няўдалым і стрэсавым.**

Суботнім вечарам дзве трэці кватэр проста не падавалі прыкметаў жыцця. Хто аказаўся дома, нават не цікавіўся, за каго з 17-ці можна паставіць подпіс. (Так, дарэчы, было не раз.) Хударлявы малады чалавек строга папытаўся: «Вы ведаеце, у якой краіне вы жывеце?». «Здагадваюся», — адказала я. Але аўтографа так і не даў. Нарэшце адгукнуўся неабыякавы мужчына, распачаў гаворку. Яго тэзісы звяліся да таго, што «ўсё роўна будзе ён, бо схлусяць». Людзі, даведаўшыся пра мэту майго візіту, часта ніякавелі, губляліся, проста палохаліся. Тэлестрашылкі пра апазіцыю зрабілі сваю чорную справу.

Другім разам я трапіла ў цагляны дом, дзе расхалёпаны ўсе лоджыі і шмат аднолькавых дзвярэй без нумароў, а то і без званкоў. Офісы тут размясціліся, ці што? Адна з жыхарак «запала» на тое, што наш прэтэндэнт хрысціянін. Сказала, што наведвае баптысцкую царкву «Галгофа», і вельмі спачувала ўсім, хто ўвязаўся ў гэтую гонку без правілаў. Падпісалася і маладзіца з двюма жэўжыкамі. Муж толькі маўкліва назіраў з канапы.

За другі вечар «падпісантаў» у маім падпісным лісце прыкметна прыбавілася. У трэцім доме ўжо адчынялі многія. Або коратка казалі «не», або падтрымлівалі. Падчас прызнаваліся: «Я за Лукашэнку». «Вашае права», — гаварыла я і ў агітацыю не кідалася. Націскаю чарговую кнопку — і выходзіць колішняя знаёмая па працы ў «ЛіМе». Бачу з калідора каталіцкі абраз, выйшаў сын-прыгажун. Абое праявілі такт і разуменне сітуацыі. С. нясмела пацікавілася: «І не баіцеся вы адна хадзіць? Людзі ж розныя...»

Ужо што розныя — гэта факт. Высоўвае галаву нізенькі мужычок у трусах — прыязны, адкрыты. Кажа: «А жонкі няма дома. — А ў вас пашпарт ёсць? — Ёсць. А хіба можна аднаму падпісвацца?».

Дзявёламу асілку з дзявятага паверха я памылкова пазваніла двойчы. Той таксама ў трусах, але нядобры, з нейкай злавеснай усмешкай. Яшчэ й прыгразіў: «Я буду скардзіцца на вашага Рымашэўскага».

Сівая кабета праверыла пасведчанне і выглядала незадаволенай, хоць і падпісалася. «Былая дзяржслужачая», — падумала я. З цікавасцю пазіралі з расчыненых дзвярэй высокія відныя мужчыны — і ветліва адмаўляліся. На пытанне «чаму» адзін коратка сказаў: «На тое ёсць прычыны». Хто ведае, да каго я трапляла? Гэта ж могуць быць і міліцыянты, і чыноўнікі, і вайскоўцы...

Адна з жыхарак усцешыла тым, што «апазнала» прадстаўніка незарэгістраванай БХД па партрэце. Прызналася, што яна ў яго «яшчэ каля ГУМа ўлюбілася».

Самая непрыемная катэгорыя насельніцтва — тыя, што праз зачыненыя дзверы спрабуюць дазнацца, што ад іх патрабуецца. Часцей гэта жанкі з няўстойлівай псіхікай. Адна такая і к нячыстаму паслала. Добра, што не далей...

Маладзіцы з дзецьмі выглядалі затурканымі ды спасылаліся на занятасць, на прастуду малых, на што заўгодна. Раздабрэлая кабета выйшла раззлаванай; ёй не да выбараў, бо ўрокі рыхтуе са сваім школьнікам. Якаясь бабуля наадрэз адмовілася ўдзельнічаць у падпісной кампаніі, бо ў яе, бачыце, два гады вентыляцыю не могуць адрамантаваць. Яшчэ ў адной, як назло, пацёк халадзільнік. Напарніку адчыніла дзверы бабуля, што зімуе ў дзяцей. У вас у Мінску, кажа, так усё добра, так чыста, а ў нас у вёсцы ніводнага цэлага плоту не засталося...

Па-рознаму людзі ставіліся да рэлігійнага пытання. Адна верніца заявіла, што Бог ёй сказаў не ўдзельнічаць у выбарах, а Лукашэнка нібыта беларусам дадзены «для смирения». Пажылая пара доўга чытала біяграфію і ніяк не магла вызначыцца. Вычарпаўшы ўсе аргументы, я падкрэсліла: «Наш — веруючы». «Ну калі веруючы, то лепей Лукашэнка», — плюнуў гаспадар і падаўся ў кватэру. «Не звяртайце на яго ўвагі», — супакоіла жонка. У дзвярах маячыў агрэсіўнага выгляду ўнук: «Ні за кога не буду галасаваць».

Дарэчы, гэтую бяскрыўдную працэдуру збору подпісаў многія прымалі за галасаванне, іх палохала сама неабходнасць хуткага і радыкальнага выбару. Не ўсе абазнаныя, што падтрымліваць подпісам можна кожнага, хто вылучыў сваю кандыдатуру. Некаторыя заяўлялі: «А я падпісаўся ўжо» альбо «А ў нас на рабоце збіралі пашпарты».




Photo.ByMedia.Net

У пікетах на станцыях метро справа ішла жывей. З людскога патоку, што цёк міма, раз-пораз вылучаліся жадаючыя аддаць подпіс за альтэрнатыўнага палітыка. Некаторыя прынцыпова наведвалі ўсе пікеты і прама казалі: «Падпішуся за ўсіх, акрамя аднаго». Хто вызначыўся, мэтава прыбягалі падпісацца за кагось асобнага з дэмакратаў. Яшчэ адна катэгорыя грамадзянаў (часцей пажылых) спынялася дзеля таго, каб распачаць дыскусію тыпу «А які сэнс у гэтых подпісах? Усё роўна нічога не зменіцца». З агідай і нянавісцю — але шэптам — людзі выказваліся пра выбарчы закон і пра Ярмошыну. Цікавіліся, хто колькі подпісаў набраў, хто выйшаў ужо на сто тысячаў. Набраць такую колькасць па адным, скажу я вам, неймаверна цяжка.

Найбольш актыўнічаў дужы пол, асабліва майго веку і старэйшыя. Я іх проста запаважала! Мала таго, што палітычна падкаваныя, дык яшчэ і пашпарты пры сабе носяць. Адзін, праўда, непрыемна здзівіў. На яго думку, нам трэба кінуцца ў ножкі Расіі, каб узяла да сябе ў якасці адной з абласцей. Ідзіце, кажу, мужчына, сваёй дарогай і не выдумляйце ўсялякіх жахаў.

Ва ўсіх пікетчыкаў падстаўкі з партрэтамі прэтэндэнтаў. Візуальная інфармацыя — вялікая рэч. Нават малодшыя школьнікі азіраліся на планшэты, хаця бацькі побач маглі не павярнуць галавы. Хлапчук гадоў дзесяці падняўся на дыбкі, зазірнуў у твар «нашага», а потым папрасіў ягоную візітку. Заціснуў у жменьку і пайшоў задаволены. Гэтыя падрастуць і прагаласуюць правільна...

Адна дамачка таксама паўглядалася, а потым спытала наконт праграмы Віталя Рымашэўскага. Я коратка распавяла пра базавыя каштоўнасці, пра неабходнасць маралі ў палітыцы... «Как это политика может быть моральной? — здзівілася суразмоўніца. — Это невозможно.»

Жанчына, што прадставілася экстрасэнсам, доўга трымала руку на выяве, але нічога толкам так і не вызначыла.

Расхрыстаны мужык на падпітку хадзіў туды-сюды і даваў свае каментары наконт прэтэндэнтаў: «Адзін — эканаміст, другі — артыст, трэці — баптыст... (адпаведна — Раманчук, Някляеў, Рымашэўскі). І сам рагатаў ад уласнага красамоўства...

У пікетах у асноўным стаяла моладзь. У знак салідарнасці падпісвалі адзін другому. Хто спакойна чакаў зацікаўленых людзей, а хто мог і падзываць: «Падтрымайце нашага кандыдата». Аднойчы пасля абеду з'явіўся пікет ад Міхалевіча, валанцёр-зазывала гучна выгукваў: «Дайце шанец маладым палітыкам!». Зборшчыкі прыкметна захваляваліся, а дзяўчаты ад суседняга стала нават спрабавалі яго перакрычаць.

Часцей за ўсё чамусьці мы аказваліся побач з пікетамі Саннікава. Тыя да нас ставіліся памяркоўна і маглі нават у час дажджу прытуліць у сваёй палатцы.

Народ, што знаёміўся з нашым «маладым, ды раннім», падчас чапляўся да беларускамоўнага тэксту. Маўляў, чаму па-расійску не напісалі? Мы тут жа прапанавалі перакласці для тых, хто не разумее. Мажны мужчына на Кунцаўшчыне зноў задаў тое ж сакраментальнае пытанне: *«Вы знаете, в какой стране вы живете? Вы давно разговаривали на белорусском языке?»*. Запэўніла яго, што не пазней, як сёння, і нагадала пра дзвюхмоўе. Маю напарніцу ні з таго, ні з сяго мінчанка гадоў 50-ці абазвала фашысткай. Згадаліся сумнавядомыя тэлефальшыўкі 90-ых ды іх стваральнік, што атрымаў заслужаную аплявуху. Ну як не падысці і не падтрымаць кандыдатуру Статкевіча?!

Пра хрысціянскую дэмакратыю ніхто не мае аніякага паняцця. Тлумачыла, як магла. Прыводзіла ў прыклад Германію, дзе такая партыя знаходзіцца ва ўладзе. У падпісчыкаў падчас выклікаў недаўменне лагатып незарэгістраванай партыі — стылізаваная кветка. «Гэта што — хары Рама, хары Крышна?» — пацікавілася дзяўчына ў свайго спадарожніка. Яшчэ адзін усур'ёз даводзіў, што гэта масонскі знак. «І граматныя, і дурныя адначасова», — прыйшла я да сумнай высновы. Аднак людзі такія, якія ёсць. Іншых нам з неба не спусцяць і з другой краіны не завязуць. Кепска тое, што вырасла індыферэнтная да палітыкі моладзь, а сталыя выглядаюць апатычнымі і зняверанымі. Маўляў, навошта спаборнічаць і заганяць коней, калі пераможца чакае ў кустах на фінішы? Навошта я нагадвала ім пра жабку, якая біла лапкамі ў малацэ? Я сама сабе здавалася такой жа стомленай, але ўпартай жабкай, якая насуперак усяму трымаецца на плыву і выконвае свой грамадзянскі абавязак.

Гэтыя шэрагі пікетаў у сталіцы ды іншых гарадах — як лапіна чыстай вады ў стаячым балоце, як глыток кіслароду ў загазаваным асяроддзі, як пробліск годнай будучыні. Толькі пачутае пытанне не выходзіць з галавы: ці разумеем мы, у якой краіне жывём?

КОНКУРС

# ПОМНІКІ КУПАЛУ І КОЛАСУ

**Міністэрства культуры Беларусі абвесціла конкурс на стварэнне эскізнага праекта помніка Янку Купалу і Якубу Коласу ў Варшаве. Арганізатарамі конкурса сталі Акадэмія мастацтваў і Беларускі саюз мастакоў.**



Мэта конкурса — пошук найлепшага варыянта помніка, які плануецца ўсталяваць у парку «Марское вока» ў Варшаве.

Паводле патрабаванняў арганізатараў эскізны праект павінен найбольш выразна і дакладна перадаваць вобразы Янкі Купалы і Якуба Коласа на аснове гістарычных звестак пра жыццё і творчасць пісьменнікаў. Удзел у конкурсе могуць узяць скульптары, якія маюць адпаведную прафесійную адукацыю.

Будучы помнік абавязкова павінен адпавядаць наступным патрабаванням: яго кампазіцыйнае і пластычнае выкананне павінна быць выканана ў найлепшых традыцыях класічнага і нацыянальнага манументальнага мастацтва, а сам ён павінен быць з бронзы альбо граніту.

Матэрыялы павінны быць прадстаўленыя на разгляд у Міністэрства культуры да 29 кастрычніка.

ДРУК

# НОВЫЯ «ТЭРМАПІЛЫ»

**Чатырнаццаты выпуск «Тэрмапілаў» быў прэзентаваны на сустрэчы Беларускага літаратурнага аб'яднання Польшчы «Белавежа» на кафедры беларускай філалогіі ў Беластоку.**




Проза Янкі Сіпакова, Радзіма Гарэцкага, Сакрата Яновіча, Галіны Сяўрук. Паэзія беларускіх літаратараў з Беларусі і Беласточчыны, літаратурная крытыка і літаратуразнаўчыя артыкулы — пад вокладкай больш чым 300-старонкавага выдання.

Па словах старшыні літаратурнага аб'яднання «Белавежа» пісьменніка і прафесара Яна Чыквіна, кожныя «Тэрмапілы» адметныя:

— Адразу кідаецца ў вочы вялікая колькасць матэрыялаў: 356 старонак мае чатырнаццаты нумар. Усе матэрыялы цікавыя. Найважнейшае, што яны арыгінальныя, гэта не перадрукі, мы перадрукаў увогуле не выкарыстоўваем.

Акрамя прэзентацыі «Тэрмапілаў», былі прадстаўленыя зборнікі твораў сябраў «Белавежы», выдадзеныя за апошні год. Сярод іх — кнігі Алены Анішэўскай, Галіны Тварановіч і Жэні Мартынюк. Выданне выбраных твораў прэзентаваў на сустрэчы і старшыня аб'яднання Ян Чыквін.

# «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» — У МУЗЕІ УКРАІНЫ

**Нумар «Літаратурнай Беларусі» за 24 верасня стаў адным з экспанатаў літаратурнага музея Восіпа Макавея ў горадзе Явараў на Львоўшчыне.**

Асобнік газеты, на старонках якога былі апублікаваныя пераклады вершаў паэта, празаіка, вучонага і грамадскага дзеяча Макавея на беларускую мову, быў адасланы ў Явараў. Пераклаў вершы славутага ўкраінца паэт Сяржук Сыс.

Дырэктар львоўскага музея Д. Місюк шчыра падзякаваў рэдакцыі «Літбелкі»: «Щиросердечно дякуємо Вам за цей чудовий подарунок нашому музею Осипа Маковея», — і пажадаў творчага плёну беларускім літаратарам.



РАДА

# ВОСЕНЬСКАЕ ПАПАЎНЕННЕ

**21 кастрычніка прайшло чарговае пасяджэнне Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП). Была заслуханая справаздача кіраўніцтва арганізацыі аб дзейнасці ў III квартале і разгледжаныя 8 кандыдатур на ўступленне ў СБП.**



Г.Бураўкін, С.Наркевіч, С.Законнікаў і В.Казько ў перапынку пасяджэння Рады СБП

Сярод асноўных арганізацыйных мерапрыемстваў, праведзеных СБП за мінулыя тры месяцы, старшыня грамадскага аб'яднання Алесь Пашкевіч назваў наступныя: выступленні членаў СБП як арганізацыі-сузаснавальніцы грамадскай кампаніі «Будзьма беларусамі!» ў Мінску і рэгіёнах Беларусі; правядзенне грамадскай акцыі «Лета з Быкавым» (распаўсюд па бібліятэках і летніх школьных лагерах тамоў Поўнага збора твораў В.Быкава); правядзенне агульнарэспубліканскага літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве» і падрыхтоўку да правядзення 4-5 студзеня двухдзённага семінара па гендэрнай праблематыцы і выніках конкурса; правядзенне літаратурнага конкурса для моладзі, прысвечанага 80-годдзю з дня нараджэння У.Караткевіча; правядзенне дзіцячага конкурса казак;арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў з нагоды 100-годдзя Ларысы Геніюш (Зэльва); мерапрыемствы па ўшанаванні памяці Ніны Мацяш, заснаванне штогадовых літаратурных чытанняў «Бабіна лета Ніны Мацяш» у Белаазёрску; арганізацыю і правядзенне штогадовага свята паэзіі Анатоля Сыса ў Гарошкаве (30 кастрычніка), а таксама цесную супрацу з беларускімі літаратурнымі і культурніцкімі праектамі: «Дзеяслоў», «Верасень», «Будзьма беларусамі», «Прайдзісвет», «Галерэя Ў» і інш. Кіраўніцтвам СБП праводзіўся пошук сродкаў на творчыя стыпендыі і адпачынак літаратараў (Швецыя, выспа Готланд, Балтыйскі Дом творчасці). Цягам апошніх месяцаў іх атрымалі А.Спрынчан, С.Астравец, Л.Сом, В.Коўтун і В.Стралко.

У галіне міжнароднай дзейнасці быў адзначаны ўдзел у працы Еўрапейскай пісьменніцкай Рады, прадстаўленне СБП у Міжнародным кангрэсе пісьменнікаў і літаратурных перакладчыкаў (Стамбул, верасень), удзел у літоўска-беларуска-польскім паэтычным форуме (Летува, М.Скобла, А.Івашчанка), правядзенне літаратурнага конкурса, прысвечанага Л.Геніюш і ўдзел у «Пражскіх чытаннях» (сумесна з ПЭН-цэнтрам), падрыхтоўка даклада на ўдзел у міжнародным пісьменніцкім форуме па аўтарскім праве (21 лістапада, Стамбул), правядзенне і ўдзел у беларускіх сустрэчах (круглых сталах) з літаратарамі замежжа (Вольга Такарчук (Польшча), Мікаэль Ніемі (Швецыя), распрацоўка прапаноў і перамоваў з украінскімі ўладамі аб увекавечванні памяці і правядзенню ўрачыстых мерапрыемстваў з нагоды 80-годдзя У.Караткевіча, а таксама хадайніцтвы і перамовы з Дзяржкамітэтам Украіны па друку аб выданні выбраных твораў В.Быкава і выбранага С.Грахоўскага ў перакладзе па-ўкраінску (з кастрычніка кнігі ў друку).

Асноўнымі кірункамі выдавецка-папулярызатарскай дзейнасці СБП ў апошнія месяцы сталі перыядычная падрыхтоўка і выданне незалежнага дадатка «Літаратурная Беларусь» у газеце «Новы час» (1-2 разы ў месяц), падрыхтоўка, выданне і распаўсюд кніжна-рэкламнага бюлетэня СБП «Кніганоша» (раз у два месяцы). Выйшлі ў свет чарговыя 4 кнігі серыі СБП «Кнігарня пісьменніка»: «Праўда як рэлігія» (гутаркі В.Быкава з Ю.Залоскам), «Мост святога Францішка» Д.Бічэль, «Сакрамэнта» Г.Багданавай і зборнік прозы беларускамоўнага літаратара Польшчы М.Андрасюка. Вядзецца праца па ўкладанні і пошуку сродкаў на выданне чарговых кніг гэтай серыі: кніг выбранага Н. Мацяш і А.Сямёнавай. Працягваліся — да ўсяго — архіўны росшук і завяршэнне падрыхтоўкі да друку чарговых тамоў Поўнага збора твораў В.Быкава, завяршалася падрыхтоўка і каардынацыя выдання юбілейнага альбома, прысвечанага100-годдзю Б.Кіта, укладзены абноўлены тэлефонны даведнік «Саюз беларускіх пісьменнікаў». Сайт СБП lit-bel.org займеў новы хостынг ды адміністрыраванне (штодзённа інфармацыйна напаўняецца).

На пасяджэнні Рады адбыўся прыём новых членаў СБП. Імі сталі:

- Анатоль ВАЛЮК (паэт; нарадзіўся 1.01.1961 г. у в. Вішняўка Зэльвенскага р-на; закончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт; друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях; аўтар паэтычнага зборніка «Музыка вятроў» (2008 г.));
- Лявон ВОЛЬСКІ (паэт, празаік, музыкант; нарадзіўся 14 верасня 1965 г. у Мінску; друкаваўся ў рэспубліканскіх і замежных выданнях ды калектыўным зборніку «Паветраны шар»; аўтар паэтычных зборнікаў «Калідор» (1993) і «Фотаальбом» (2000));
- Уладзімір ЛЯКІН (празаік; нарадзіўся 16.10.1951 г. у г. п. Хойнікі Гомельскай вобл.; закончыў Кіеўскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча; друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях; аўтар 6 кніг нарысаў і эсэ па краязнаўству і ваеннай гісторыі («Мозырь в 1812 году» (2005 г.), «Фамилии калинового края» (2008 г.), «Белорусские поля сражений 1812 года» (2009 г.), «Калинковичи на перекрёстке дорог и эпох» (2010 г.) і інш.);
- Анастасія ЛАЗЕБНАЯ (Стася НАРКЕВІЧ) (празаік, паэтэса, гумарыст, публіцыст; нарадзілася 28.06.1952 г. у в. Кушляны Маладзечанскага р-на.; закончыла факультэт журналістыкі БДУ; друкавалася ў рэспубліканскіх выданнях; аўтар калектыўнага зборніка «Прыдзвінне» і ўласнага зборніка апавяданняў «Настальгія» (2008 г.));
- Сяржук СЫС (паэт, перакладчык, публіцыст; нарадзіўся 26.01.1962 г. у в. Пракісель Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.; закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт; друкаваўся ў рэспубліканскіх і замежных выданнях; аўтар калектыўных зборнікаў і анталогій, а таксама кніг паэзіі «За трапяткім матыльком кахання» (2000 г.) і «Стрэмкі»; творы перакладаліся на англійскую, польскую, расійскую, украінскую, літоўскую і сербскую мовы);
- Дмітры ПЛАКС (паэт, празаік, драматург, перакладчык; нарадзіўся ў 1970 г. у Мінску; піша па-беларуску, па-шведску і па-расійску; аўтар кніг «Жара» (2004), «Су Twomblys dagbok» (2006), «Трыццаць тэкстаў» (Мінск, 2009));
- Андрэй ПРОХАРЧЫК (празаік, мемуарыст; нарадзіўся 23.02.1928 г. у в. Зазерка Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; кандыдат навук; закончыў Маладзечанскі настаўніцкі інстытут (1950 г.) і аспірантуру Мінскага педагагічнага інстытута; удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з траўня 1943 года (быў сувязным атрада Панамарэнкі 2-й Мінскай партызанскай брыгады, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і 12-ю медалямі; аўтар 12 зборнікаў прозы і вершаў);
- Усевалад СЦЕБУРАКА (паэт, празаік; нарадзіўся ў 1981 г. у г. п. Вялейка Мінскай вобл.; закончыў БДУ; друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях; аўтар зборніка паэзіі «Крушня» (2008 г.).

«Літаратурная Беларусь» шчыра віншуе папаўненне СБП, сярод якіх — яе сталыя і, спадзяемся, новыя аўтары.

**Матэрыялы старонкі падрыхтаваныя паводле ўласнай інфармацыі, а таксама Радыё Рацыя**

ВЕРШЫ

# СА МНОЙ ЗАЎЖДЫ ПРЫТОЕНАЕ РЭХА…

Васіль ЗУЁНАК



* * *

*На тое і восень прыходзіць,*
*Прыродаю мудрай даецца,*
*Каб мог ты аднойчы даўмецца*
*З палёгкаю выдыхнуць: «Годзе…»*

*Было — і вясны, і любосцяў,*
*І лета мядовага ўдосталь.*
*Навошта ж гукаць тую ростань?*
*Хіба ты забыўся там штосьці?..*

*Нічога не дасць гуканне,*
*А восень тастамент накрэсліць:*
*Застанься навечна з песняй,*
*Разбіўшы ўспамінаў камень…*

## Кветкаеды

*Квітнення лёс: і плойма кветкаедаў,*
*І кожны не абедаў і не снедаў,*
*І кожны спадзяецца на вячэру.*
*На кветку кожную — дзясяткі ненажэраў.*
*І кожны да нектарнае крыніцы*
*Сваім патомствам прагне пасяліцца:*
*Яечка ўджаліць каля сэрца ў кветкі, —*
*Расціце, кветкаедавыя дзеткі!*
*І стол салодкі тут вам і калыска…*
*З галінак асыпаюцца агрызкі,*
*Уежна нераскрытыя пялёсткі*
*Хрумсцяць, як на зубах у выжлаў косткі.*
*У вусцішчы стаіць нямая крона, —*
*Ні пчол і ні мядовага іх звону…*
*І толькі пруцца плоймай кветкаеды, —*
*Здаецца, загрызе сусед суседа.*
*І кожны пнецца першым да стала,*
*Каб яблыня мая не расцвіла…*

## На беларускім Парнасе…

*На беларускім Парнасе*
*Рыфмаў не чутна амаль, —*
*Тут бур'яном разраслася*
*Чыноўная «вертыкаль».*

*Дух волі пратручваюць газам*
*Падданства і рабскай хлусні.*
*Мярцвячыны метастазы*
*Ідэйны прыбрамнік сніць.*

*Літаратурную хату*
*Палкоўнік былы беражэ:*
*А раптам Пегас крылаты*
*Не тое й не так заіржэ…*

*Там, дзе гарэзвалі музы,*
*Гукалі ў нябесную сінь,*
*Трымаюць чыноўныя шлюзы*
*Літаратурную плынь.*

*А сэнс: каб паток той хлынуў —*
*О, як ім уладна карціць! —*
*На кола ўладнага млына —*
*Уладныя жорны круціць.*

*Ды толькі памолу не будзе —*
*Дарэмна чакае млынар!*
*Паэты — гісторыі суддзі,*
*А не прадажны тавар.*

*І грымне паток з Парнаса —*
*Не схопіш уладнай рукой, —*
*Змяце і шлюзы, і насып,*
*Каб вольнай разліцца ракой.*

## У ссылку!..

*Гналі ў ссылку паэтаў*
*На Чорнае мора:*
*З Рыма — Авідзія,*
*З Санкт-Пецербурга — Пушкіна.*
*Гэта было*
*У тысячагодне-стагоднім*
*Учора.*
*Век наш*
*Вольных паэтаў*
*На хвалях эўкінскіх пагушкваў.*

*Пёрлі самавыгнаннікі —*
*З целам уласным і жончыным.*
*Хто ў Піцунду, а хто ў Кактэбель,*
*А хто ў Гагру, —*
*Хто з інфляцыяй духу,*
*Хто з раманам няскончаным,*
*Хто гаіць рэцыдыў паэтычнай падагры…*

*Сёння быль чарнаморскіх этапаў сонечных*
*Сніцца казкай*
*З пытаннем —*
*Каму падказаць:*
*Ад жабрацкай нястачы паэтаў баронячы,*
*Ці не варта было б*
*Зноў у ссылку*
*На поўдзень*
*Да мора,*
*Ссылаць?!..*

## Знойдзеш слова

*Знойдзеш слова — кінеш каменьчыкам,*
*Як на першы звонкі лядок, —*
*І заскача вясёла: цок-цок!*
*І ўсміхнецца ямб пакамечаны —*
*І табе, і вершу сустрэчнаму, —*
*Нібы зробіш да радасці крок*
*На адзін — хай і горкі — радок.*

* * *

*Сябрам — віртуальнае SOS*

*Амор Султанаў, Кондру Анатол,*
*Матс Траат і Туманбай Малдагаліеў…*
*Як дрэва абламаныя галіны*
*На зруйнаванай звышдзяржавы дол…*

*Сябры мае з маёй былой краіны,*
*Я плачу не па ёй, але чаму*
*Плачу — так безнадзейна — і каму?! —*
*За страту нашай колішняй сябрыны?*

*Мне не шкада імперыі — але,*
*Калі не песняй, ні радком не дагукацца,*
*Якіх яшчэ баяцца акупацый*
*З імперскаю навалай начале?!..*

*Шчыміць душа: без еднасці паэтаў*
*Вялікае, святое штосьці гіне.*
*Шлю вам — як прывітанне —*
*настальгію.*
*А чым вы мне адкажаце на гэта?*

* * *

*Зямлі і неба валадар —*
*Такі мне боскі выпаў дар.*
*Ды памыліўся, пэўна, Бог:*
*Я зберагчы той дар не змог, —*
*Згубіў. А засталося мне —*
*Па сходнай для зямлі цане —*
*Адно: вязанка крэўных слоў —*
*Не свет узрушыць да асноў,*
*А на нябёсы зазірнуць:*
*Знайсці — і Богу дар вярнуць.*

* * *

***… Пора узнать, что в мирозданьи,***
***Куда ни обратись — вопрос,***
***а не ответ…***
***А. Фет***

*Я тыдзень з Фетам размаўляў:*
*Перад сталом аперацыйным*
*І зноў — вярнуўшыся здаля*
*Ў палаце рэанімацыйнай.*

*Лірычнай кладачкай паэт*
*Правёў мяне над той ракою,*
*Дзе і жыццё і цэлы свет*
*Адной трымаюцца рукою.*

*Яна ўсявышняя, і ёй*
*Я аддаваў сваё імгненне*
*Зямное — перад той сцяной,*
*Якую й твой не зрушыў геній.*

*З пытаннем нада мной стаяў —*
*Нябачны — побач з урачамі:*
*Натхнёная душа твая*
*Мяне надзеяй выручала…*

*То дзякуй Богу, дзякуй вам,*
*Хірургі, скальпеля паэта,*
*А пахвалю — сябе я сам,*
*Што ўзяў на ўлекі томік Фета.*

* * *

*Радню паэзію з прозай,*
*Лірыку з эпасам.*
*Жыву, як шпак на бярозе.*
*А песня? З жыцця і лепіцца.*

*Прынёс ў гняздо пярынку —*
*Пад бок ці пад грудкі шпачысе,*
*Прысеў, гайдануў галінку —*
*Душа ад радасці й свісне.*

*У дзюбачку, як у дудачку,*
*Песеньку выцінаю…*
*Сказаў бы, што заўтра адбудзецца, —*
*Ды гэтага я не знаю…*

## Мемарыяльная дошка

*Самотны Пімен Емяльянавіч…*
*З былой кватэры ў каменіцы*
*Збярог шматок сцяны цаглянае… —*
*А дзе ж інача прыхіліцца?..*

## Хандра зімовым дажджлівым днём

*Пры Моцарце заўсёды ёсць Сальеры, —*
*Інача нельга: абавязан быць!..*
*Душы замеры, помыслаў намеры, —*
*Як разгадаць, што ў тых вірах вірыць?*

*Падхопліва, з ахвотай уяўленне*
*Малюе — міражы ці муляжы? —*
*Цяпельца боскага звініць вясёлы геній,*
*Віюцца ў комін зыркія вужы…*

*Пасланне Зніча па складах чытаю*
*Ці Перуноў тастамент-запавет?*
*Старонкі пламяністыя гартаю —*
*А можа й свой пабачу раптам след?*

*Бо не настолькі ж чалавек я шэры,*
*Як гэты дождж — і летам, і зімой…*
*Калі я Моцарт, хто ж ён, мой Сальеры?*
*Калі — Сальеры, хто ж ён, Моцарт мой?*

*А можа, я і ёсць — і ў тым, і ў гэтым?..*
*Іскрынка ў вусны джгае, як аса…*
*Маўчу, маўчу… Валодай, Моцарт, светам!*
*Віват, Сальеры!..*
*Я… як-небудзь сам…*

## Прышэсце

*Калі адлічыць паўстагоддзя назад —*
*Хоць час не валодае цудам вяртання,*
*Усё ж паспрабуем, — і зноў інтэрнат*
*Філфакаўскі наш на Бабруйскай паўстане.*

*Калі яшчэ Клышка быў Толем Клышко,*
*На «ко» прамаўляліся Свірка і Цвірка;*
*Калі і Ясеніна томік цішком*
*Чытаўся ўзахоп, як «пяць лыжак заціркі»;*

*Калі і Гілевіч, і Лойка амаль*
*У класіках — хай і належна — хадзілі*
*Ды бралі навуку ў хаўрус, бо, на жаль,*
*Жыве чалавецтва не рыфмай адзінай;*

*Калі Барадулін і ў казачным сне*
*Пабачыць ён мог, як маркоціцца Нобель;*
*Калі дзервянела — кахалі ці не?.. —*
*Інтымная лірыка ў трэцяй асобе;*

*Калі: ды на хлеб ды кахання б мёд! —*
*Медытаваў у рыфму Вярцінскі,*
*І спрэс учарнелы рэдактарскі лёд*
*Ламала Вярба сэксуальнай націнкай;*

*Калі яшчэ вершы папісваў Рыбак*
*І з рыфмаю не расквітаўся Чыгрынаў,*
*А Пташнікаў, быццам з «Ля Скалэ» спявак,*
*Класічнаю арыяй цешыў сябрыну;*

*Калі на асфальце сена касіў*
*Стральцоў з цыгарэткаю інтэлігенцкай,*
*А сам палачанін — таму й не прасіў*
*Бураўкін па-княску сабе індульгенцый;*

*Калі дарога праз лес вяла*
*Сачанку крокам мініятуры,*
*Калі Сіпакоў зразумеў, што з сяла*
*Шлях самы кароткі ў літаратуру;*

*Калі над старонкай пакутна карпеў*
*І стыль глянцаваў і ваксіў Адамчык… —*

*Тады беларускім гімнам той спеў*
*І грымнуў — раз-два! — і ў дамкі:*
*Ці верш, ці балада, ці прозы сувой, —*
*Размах, шырыня і веліч!..*
*І хоць не з Бабруйскай, а ў дошку свой, —*

*То быў — і ёсць! — КАРАТКЕВІЧ!..*

АПАВЯДАННЕ

# ЧАЛАВЕК-ПАМЫЛКА

Віталь БЫЛЬ

Шарэе. Напрыканцы кастрычніка заўсёды шарэе так рана. Тым больш тут, у парку, сярод раскідзістых дрэваў, хоць і амаль пазбаўленых лістоты. Я іду, заграбаючы нагамі гурбы апалага лісця. Лісце незадаволена шапаціць і ўздымаецца на дыбкі, паглынаючы мае чаравікі. Навокал — нікога, і я магу дазволіць сабе гэта свавольства: згадзіцеся, дарослы чалавек, які грабе нагамі лістоту ў цёмным парку, выглядае крыху незвычайна. Людзей звычайна гэта бянтэжыць. А я люблю незвычайнае.

Позняй восенню парк падобны да адзінокага пенсіянера. Яго яшчэ час ад часу адведваюць, забягаюць па справах ці так, заскокваюць па дарозе. Гэта ўжо наведвальнікі, прахожыя, але не госці...

У голым цёмным парку ўсіх сустрэчных я дзялю на маньякаў і ахвяраў. Умоўна, канешне (так, і я таксама невылечна скалечаны тэлебачаннем). Вунь спадарыня ў цёплым паліто, нагружаная сеткамі і пакетамі. Відаць, вырашыла зрэзаць шлях праз парк і ўжо сама не радая. Эх, як азіраецца на кожны гук, як крок прыспешвае… Уціскае галаву ў каўнер і ледзь не подбегам мінае масток. Яна на варожай тэрыторыі. Яна чакае свайго маньяка, каб стаць ахвярай.

А ў такім выпадку, маньяк — гэта я. У двукоссі, безумоўна. Мы, «маньякі», тут як дома. Змрок, адзінота — мы гэта любім. Нашыя спіны прамыя, крок лёгкі, у вачах няма страху. Мы — як тыя коткі, што любяць гуляць самі па сабе.

Хутка мая любімая лаўка. Перад ёй — іржавы кантэйнер для смецця. Трава, лісце, неба, дрэвы, хмары — і раптам вялікі іржавы куб. Прыгожа…

Та-ак, відаць, сёння маё сузіранне не атрымаецца. Там ужо сядзіць нехта. Шэрая надзьмутая асенняя куртка надае яму выгляд згустку туману, што зачапіўся за недарэчна жоўтую лаўку. Хто гэта: брат-«маньяк» ці горкі п’янчужка? Вечар размывае рысы твару, але, быццам, нехта знаёмы… Падыходжу бліжэй, напружваю зрок. Чалавек азіраецца. Дык гэта ж Андрэіч, мой начальнік аддзела! Толькі нейкі сумны і памяты. Што ён тут робіць? Жонка з хаты выгнала, ці што?

Мне захацелася, каб сцежка раптам звярнула ўбок, але яна паволі цягнула мяне да жоўтай лавы.

— Добры вечар, Аляксандр Андрэевіч! — расплыўся я ў бадзёрай усмешцы бравага падначаленага. — Паветрам дыхаеце? Гэта правільна! Зараз на вуліцах такі смог!..

Шэф толькі сумна паківаў галавой:

— Выбачайце, малады чалавек, але я не Аляксандр Андрэевіч, ці як там вы мяне назвалі.

— О, выбачайце, — у мяне з душы ўпаў камень (не кожны работнік, седзячы на бальнічным, будзе рады сустрэць начальства ў парку халодным восеньскім вечарам!), — вы так падобныя… Я пераблытаў…

— Падобныя? — горка усміхнуўся мой субяседнік.



Фота www.photoclub.by

Толькі зараз я яго разгледзеў як след. Невысокі, вузкія плечы, хударлявы інтэлігентны твар, сумныя вялікія вочы. Падобны да шэфа, як Чарлі Чаплін да Шварцнэгера! Цяжка нават уявіць, што хвіліну таму я збіраўся завярнуцца і навастрыць лыжы.

Заўважыўшы маю збянтэжанасць, незнаёмец яшчэ больш горка дадаў:

— Нічога, не перажывайце. Людзям уласціва памыляцца. Асабліва са мной…

Раптам ён устаў з лаўкі і дастаў з-пад курткі нож. Звычайны кухонны нож, не вельмі новы, з крыху сточаным лязом і пачарнелай ручкай. Канешне, чалавек, які дастае з-пад курткі кухонны нож у цёмным парку, выглядае дзіўнавата, нават падазрона. Але сам рух быў такі натуральны і просты, ды і нож выглядаў зусім свойскім і хатнім, звыклым рэзаць мяккія боханы на лусты да абеду і крышыць гародніну ў суп… Пужацца проста не атрымлівалася.

Нож незнаёмец працягнуў мне.

— Выбачайце, шаноўны спадар, калі вам не цяжка, і калі вы нікуды не спяшаецеся, не маглі б вы мяне… ну, гэта самае… забіць. Калі вы, канешне, нікуды не спяшаецеся…

— Што-што? — я вырашыў, мне памроілася.

— Ну, забіць… Як бы гэта, зарэзаць… Не, у сэнсе не як бы, а сапраўды, да смерці, каб я памёр.

— Як гэта? — я ўсё яшчэ не мог паверыць, што сапраўды гэта чую.

— Як? — пытанне збіла з панталыку майго субяседніка. — Ну, я не ведаю. Як-небудзь. Па тэлевізары ж усяк робяць. Вы глядзіце, як вам будзе зручней… Толькі каб хутка.

— Гэта… А вы самі не спрабавалі? — спытаў я, тупа назіраючы, як ён укладвае нож у мае пакорныя далоні. Ад незнаёмца патыхала вінам.

— Сам? — ён апусціў вочы долу. — Не, ведаеце, неяк духу не хапае. Страшнавата. Болю баюся.

— Дык мо і не трэба? Давайце я вас правяду да прыпынку, — ледзь не праспяваў я аксамітным голасам. — Сядзеце на аўтобус, прыедзеце дадому, паспіце… Вам жа заўтра на працу, так?

Незнаёмец апусціўся на лаўку. Аўтаматычна я сеў побач. Вочы знайшлі ржавы кантэйнер. Ён ужо амаль зліваўся з паветрам — так сцямнела.

— Мо і не трэба… Не ведаю. Я ўжо нічога не ведаю. Нават ужо сумняваюся, хто я такі.

— У вашым стане гэта бывае. Паспіце, а раніцай усё будзе зразумела.

— Ці не жадаеце віна? — спытаў псеўда-шэф. — О, халера, разлілося, я не заўважыў. Ну што ж, яшчэ адна памылка. Ды я сам — памылка!

— Як гэта — чалавек-памылка? Як чалавек-павук? — не утрымаўся я.

— Не зусім. Хутчэй як чалавек-невідзімка. Памятаеце, у Герберта Уэлса? Толькі ад самага нараджэння. Калі я выпаўз на свет Божы, акушэрка схапіла мяне і давай маці віншаваць: «А якая ж мілая ў вас дзяўчынка! Сапраўдная прынцэса!». Толькі дома і агледзеліся, што да чаго. Мама ўсё любіла расказваць гэтую байку.

— Ды ну, не бывае такога. Так памыліцца! Мабыць, маці жартавала, ці сама чаго наблытала. Нараджаць — гэта вам не жартачкі.

— Вось і я баюся, што наблытала, — яго голас упаў да гучнага свісцячага шэпту. — А ці яе дзіця забралі дадому?

Жартуе? Твар незнаёмца быў сур’ёзны і нават абыякавы, але гэтыя вочы… З такімі вачыма не жартуюць. Ён тым часам працягваў:

— Са мной часта здараліся розныя рэчы. Быццам бы звычайныя. Мяне вельмі часта блыталі з братам…

— Нічога дзіўнага, браты звычайна падобныя, — перабіў я. — Таму іх часам і блытаюць.

— Але да брата я быў падобны не болей, чым да вашага шэфа, — крыва ўсміхнуўся мой субяседнік. — І ўсё ж нас блыталі. А яшчэ мне даставалася за чужыя грахі. Баба Гэля, суседка, часта скардзілася, быццам я лазіў у яе сад трэсці грушы і абдзіраць маліну. Бацька доўга не разбіраўся, а адразу хапаўся за папругу. Я цярпеў-цярпеў гэту несправядлівасць і нарэшце вырашыў: пакутаваць — дык за справу. Пералез цераз плот, ускараскаўся на дрэва і давай трушчыць вішні. Аж не заўважыў, як баба Гэля падышла. Стала, глядзіць. Уцякаць позна. А тая пастаяла і кажа: «Ты б, Касцічак, унучачак, не чапляўся так высока, яшчэ звалішся. Ідзі лепш дзедаў зэдлік вазьмі».

— Дык значыць вас Канстанцінам завуць? — спытаў я. — Вельмі прыемна. А як па бацьку?

— Як мяне завуць? Я і сам не ўпэўнены. Але тады мяне звалі Славікам, а ці быў я падобны да Косці, Гэлінага ўнука, — і блізка не быў. Вось тады я і зразумеў, што нешта са мной не так, як з усімі людзьмі…

— Але я ўсё ж не бачу падставаў, каб забіваць сябе.

— І я не бачыў. Да гэтага дня, нават вечара. Я апошнім часам працую звышурочна. Прыходжу дадому амаль за поўнач і падаю як забіты. Нам з жонкай патрэбныя грошы. Мы вырашылі, што ўжо час завесці дзіця. Дакладней, так Шура вырашыла. Яна ў гэтым лепш разбіраецца, я ёй давяраю, хоць сам і эканаміст. Шура ў мяне баба з галавой. Хоць і пакрычаць любіць і, чаго тут, рукам волю даць. Але яна ў мяне добрая.

Дык вось, сёння пад вечар у нас у канторы была невялічкая аварыя. Звычайная штатная аварыя, нават не аварыя, а так — збой. Нешта недзе перагарэла, і электрычнасць адрубілі, як нам сказалі, надоўга. Таму сёння атрымаўся скарочаны дзень. Ну, я, зразумела, адразу дахаты. Адмыкаю ключом дзверы, а там, у цёмнай прыхожай — Шура. Ды такая прыгожая! Закрывае мне далонькай рот і цягне за сабой у спальню… А пасля ўсяго яна так пяшчотна да мяне прытулілася і кажа: «Спі, Алежка, спі. Мой баран яшчэ не хутка прыйдзе. Ён зараз для нас грошыкі зарабляе. Заробіць, а мы з табой іх возьмем — і на мора. Праўда, мілы?».

Яна задрамала. А я ляжаў бы абліты кіпенем. Устаў асцярожна, каб яе не патрывожыць, ціха апрануўся і пайшоў на кухню — дзіка захацелася есці. Па дарозе зазірнуў у люстэрка ў прыхожай: ці я гэта? На кухні адчыніў лядоўню, адламаў кавалак сыру — і мяне ледзь не званітавала. Толькі цяпер я пачаў адчуваць лютасць. Не шаленства, не прагу раўці і трушчыць усё навокал, як раз’юшаны бык, а халодную разважлівую лютасць. Я зірнуў на нож, які сам апынуўся ў маіх руках. Вось гэты самы нож. Павольна, ведаеце, як бывае ў сне, вярнуўся назад у спальню. Па дарозе зноў зазірнуў у люстэрка. Гэта ўсё ж быў я, у паліняльных сямейных майтках, з нажом. Я стаў каля ложка, думаў. Куды ўдарыць: па горле, пад сэрца, у жывот? Як гэта правільна робіцца там, у кіно? Мабыць, трэба па горле. Яна не зможа закрычаць. Яна толькі захрыпіць, а навокал па прасцінах распаўзецца мокрая чырвоная пляма.

Раптам на кухні завурчэў халадзільнік. Такі дамашні будзённы гук. Зусім не кіношны. Гэта было як крык пеўня. Я ўбачыў сябе: худы, сутулы, у паліняльных сямейных майтках, з нажом. Стаю і збіраюся забіць жонку. Кухонным нажом — па горле. Абсурд.

Мне стала сорамна, што Шура прачнецца і ўбачыць мяне, такога. Быццам выходзіш з душа — і раптам заўважаеш, што ты на людным праспекце. Я стрымгалоў вылецеў у прыхожую, нацягнуў на сябе, што трапілася пад руку — хутчэй прэч! І вось я сяджу тут і чакаю, можа, хто згодзіцца мяне забіць, бо сам… Не магу, ну аніяк… Абсурд…

Было холадна. Я адчуваў, як холад, нібы брудны вычварэнец, запускае свае ледзяныя пальцы пад маё адзенне. З кожнай хвілінай гэтых абдымкаў маё чалавекалюбства марнела і чэзла. П’яная лухта кранала ўсё меней.

— Паслухай, паважаны, — сказаў я, ледзь хаваючы раздражненне. — Самагубства — гэта куды прасцей, чым здаецца. Скокні з якога мосту, ці з даху высоткі, а калі застрашна — проста наглытайся таблетак. Аптэкі, дарэчы, яшчэ працуюць.

Не зважаючы, што ён мармытаў у адказ, я падхапіўся і шпарка пакрочыў прэч, расціраючы задубелыя рукі.

I быў вечар, і быў ранак. I быў дзень, звычайны працоўны дзень. Андрэіч, які ніколі не хварэў і таму лічыў бальнічныя лухтою і гультайствам, загрузіў мяне па самую шыю. I дзень скончыўся, як заўсёды — роўна ў пяць. I быў вечар. Пяльмені, кава, канапа, тэлевізар. Вячэрні выпуск «Панарамы».

— Да іншых навінаў, — дзелавіта сказала дыктарка. — Супрацоўнікамі правапарадку быў затрыманы серыйны забойца, які вось ужо тры месяцы арудаваў у парках сталіцы. На яго рахунку больш за дзесяць крывавых спраў. Толькі ўнікальная спецаперацыя дазволіла пакласці канец ягоным злачынствам.

Далей — кадры аператыўных відэаздымкаў. Казённы кабінет, за сталом — скурчаная постаць. Твар — схаваны, у інтарэсах следства. На ўсе пытанні — адзін адказ: «Гэта памылка, зноў памылка… Абсурд…». Мардасты палкоўнік, сурова насупіўшыся, самазадаволена расказвае падрабязнасці, дэманструе запакаваную ў празрысты пакет прыладу злачынства — нож. Звычайны кухонны нож, не вельмі новы, з крыху сточаным лязом і пачарнелай ручкай.

— Як вам удалося выйсці на след гэтага няўлоўнага садыста? — спрытная журналістка суне мікрафон у твар міліцыянеру.

— Спачатку дзяжурная частка прыняла званок ад невядомага свядомага грамадзяніна. А затым — справа тэхнікі, — палкоўнік аж прыжмурыўся, грэючыся ў прамянях славы. — У ходзе тэрміновых аператыўна-росшукавых дзеянняў злачынец быў затрыманы. Сведкі і адна ахвяра яго апазналі. Так што справа хутка будзе перададзена ў пракуратуру.

— Міліцыя просіць грамадзяніна, чый званок дапамог вызваліць горад ад маньяка, звярнуцца па ўзнагароду, — мікрафон вярнуўся да журналісткі. — Тым часам пракуратура…

Я не даглядзеў сюжэт, пераключыўся на іншы канал, дзе пачынаўся чарговы серыял. Нецікава. Яшчэ адна асечка карнай машыны. Яшчэ адна недарэчнасць чалавека-памылкі. Апошняя, я ведаю. Я ўсё ведаю. Каму ведаць, як не мне.

А за ўзнагародаю я не пайду…

Гляджу на свае пальцы. Чыстыя, далікатныя. Яны яшчэ ў думках абдымаюць пачарнелую ручку, зліваюцца з ёй у адно ў дакладным удары — знізу ўверх, пад рэбры, пад сэрца. I чужое жыццё барвовымі кроплямі сцякае па лязе нажа, ужо не звычайнага кухоннага хлебарэза, а сакральнага ахвярнага клінка… Яны дохнуць, а я жывы!

Паскакаў па каналах. Адно і тое ж. Усё звычайнае, а я люблю іншае.

Выключыў. Сяджу ў змроку, палю. Адзін. Змрок, адзінота — мы, маньякі, гэта любім…

► ВЕРШЫ

# ГЭТА ЗАВЕЦЦА — НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Макс ШЧУР



## Статыстычная справаздача

*Найшыкоўнейшы гатэль свету*
*Найстарэйшая дзейная сынагога*
*Найвялікшая конная статуя*
*Найбольшая колькасць прывідаў і курваў на метар квадратны*
*Найвышэйшы працэнт друкаваных выданняў на чалавека*
*Найменшая адлегласць між барамі*
*Найвузейшая вулічка кантыненту*
*Найніжэйшы век полавай сталасці —*
*места крайнасцяў, у якія лепш не ўдарацца*
*(я не ведаў пра гэта, калі вышаў тут*
*з цягніка,*
*тады яно здавалася мне*
*шматразова складзеным*
*аркушам Менску, на які я быў прымяраў*
*тэмп хады й шырыню свайго кроку*
*правінцыяла),*
*многія яшчэ называюць яго цэнтрам свету,*
*многія іншыя — прамачахай гарадоў;*
*яго (не)аднойчы нават хацелі зраўняць*
*з зямлёю,*
*ды калі пагроза (крый бог) канец канцоў*
*спраўдзіцца —*
*спадзяюся, яго будуць памятаць не за гэта.*

* * *

*Хварэць вясной. Па-халасцяцку.*
*Адліга запаўзае ў нос.*
*У цэнтры свету. Быццам цацкі*
*вакол — газет і кніжак стос.*

*Ад цела не прасіць экстазу,*
*а быць удзячным, што яно*
*не хоча прызнаваць паразу,*
*маўляў, яму не ўсё адно.*

*А з вечарам надыдзе ўчора,*
*нібы той «заяц», што крадком*
*дурыць спрабуе кантралёра*
*прабітым раз ужо квітком.*

* * *

*Вокам, нікому не прыязным,*
*паўтор гульні жыцця глядзі*
*накшталт хакейнага суддзі —*
*штосьці між карнікам і вязнем.*

* * *

*Сыходзяць вечары. Больш іншых*
*шкада пазначаных самотай,*
*кампаніяй людзей няісных,*
*калі а пятай (ці а шостай)*

*ізноў прыходзіш у прытомнасць,*
*зноў ловіш гаманец на нітцы*
*ў далоні часу патаёмнай,*
*што ўсё жыццё нам толькі сніцца,*

*і разумееш пакрысе, не*
*наўгад, што прабуджэнне — дзіва,*
*не меншае за ўваскрасенне.*
*Ці нават большае, мажліва.*

## Сміхаў

*З П1 на П5 — добры шахматны ход,*
*зрух у часе наперад на сто-дзвесце год;*
*там гадзіна залічваецца за тры,*
*і пластычна з'юнелы Шаўчэнка стары*
*там не чуе знаёмых нязмушаных «блях»*
*(побач мову ягоную гвалціць зямляк);*
*там цвінтар нагадае сылюр ці дэвон,*
*(акіян, што смарагдам пакрыты здавён),*
*як і тое, што ў свецкае славы й красы*
*не бываюць аднолькавымі адрасы,*
*бо адзіна закінутасць ёсць прыгажосць,*
*як твая адзінота цяпер ёю ёсць.*
*Там святло дробкай попелу ў шклянцы плыве*
*(падабенства не ўкладваецца ў галаве),*
*сілай звычкі ільга настальгію адчуць*
*па раскепіне ў куфлі, што ўраз прыбяруць;*
*там вядуць, бы п'янюгу, плячыстым шыхтом*
*шараговыя гмахі абшарпаны дом,*
*што адным з нешматлікіх мог бога туліць...*
*Па дарозе дамоў між сучасных куліс*
*трапіш у Ратэрдам праз шмат вёснаў і зім*
*і ўваскрэснеш — шчаслівы, той самы, адзін.*

* * *

*Залевай пад лінейку стрэх*
*раён падзелены на зоны.*
*Цяплынь зняла вясновы стрэс.*
*Шум ліўня ловяць парасоны,*

*нібы антэны — сатэліт.*
*Агонь бэтлемскі цыгарэты*
*аберагае сатаніст*
*на доўгім шляху да Лярэты.*

*Ноч больш бяспечная ў дажджы.*
*Адно спадужніцы-скульптуры*
*блішчаць алеем, ды смаўжы*
*паўзуць на лужын амбразуры.*

*Вось так, квартал цераз квартал,*
*ад самалюбства адурэлы,*
*ты Менск упэўнена гартаў,*
*нібы старонкі «Ражуэлы»*.*

* «Rayela» — раман Хульё Картасара (1914–1984).

## Malovanka

*Дзесяць гадоў яна чакала,*
*застаўшыя ў дзеўках, дакладней — у вёсках.*

*Што змагла — захавала, не лічачы*
*дробязяў:*
*касметычная аперацыі, выпаленыя*
*татуіроўкі шыльдаў.*

*Дрэва па-ранейшаму спрабуе*
*перарасці касцёл.*

*Вечар ператварае цагляныя муры*
*крэпасці*
*ў сонечныя батарэі,*
*тэрасы гатэлю — у аранжэрэі*
*па развядзенні рысу.*

*Нетры будынку памятаюць кінасеансы,*
*як вантробы манашкі — грэх.*

*Травень: падаткавыя вакацыі,*
*рэшту году мы будзем працаваць на сябе,*
*як дагэтуль адпачывалі для іншых.*

* * *

*...Ты ў іншым часе. Гаспадар краёў,*
*куды, бы ў сон, Бог шлях нам запавёў.*
*Борхэс, «Аднаму кату».*

*Я — сумны кот. Яму ўсяго хапае:*
*насельнік не адной, а дзвюх кватэр,*
*адной — належыць, у другой — дрымае,*
*схаваўшы кіпцюры й зубоў ашчэр.*

*Ён любіць цішыню, паспаць удосыць,*
*такі ж, як я, рахманы дамасед,*
*і тым не менш, на дзверы вухам косіць,*
*ці не вярнуўся гаспадар, сусед.*

*Уражвае ягоная адданасць:*
*хоць ад суседзяў мы не адстаём,*
*кот памятае, кім любімы да нас*
*ён быў, калі яшчэ быў кацянём.*

*Ён спіць сабе. Мне аднаму вядома,*
*што мой драпежны госць — нідзе не дома.*

*Паўсюль яму патрэбнае адно:*
*адчыненая фортка. Лепш — вакно.*

* * *

*Наш дом — наняты намі пансіён.*
*Мы госці ў ім, прыстанку летняй зморы.*
*Нішто не перарве наш дзённы сон.*
*Фіранкі гойдаюць арэлі, як на моры.*

*Крык пеўня, пах пасечанай травы —*
*з любога месца блізка да Карэліч,*
*паўсюль у нас — нязначныя правы.*
*Фіранкі гойдаюць далей свае арэлі.*

## Котка

*Цягам апошніх дзесяці гадоў*
*да нас ніхто інačай, як праз дзверы, не ўваішоў,*
*як і пакуль не выйшаў. Не сказаць каб*
*мы не чакалі гэтага зусім. Але ўначы*
*ты стала ўрэшце першаю, знянацку*
*ўвайшла ў вакно, нібы забыўшыся ключы,*
*агледзела кватэру з разуменнем чалавечым,*
*нібыта ўжо калісьці тут жыла.*
*Хоць насамрэч ты*
*шукала іншага вакна, і іншых жыхароў —*
*ды толькі ці не ўсё адно табе, драпежы,*
*хто дасць табе талерку з малаком?*
*Ты памятаеш добра, дзе твой дом:*
*не там, дзе гаспадар, а там, дзе досыць ежы.*
*У вас гэта завецца — незалежнасць,*
*а як быць нам, табой прыручаным зверам?*

## «Beverly Hills»

*Лета — пара кактэйляў,*
*малочных і генетычных.*
*Бойкі алкакартэляў*
*у вуліцах субтрапічных.*

*Боязна выйсці вонкі*
*з засені абрыкоснай,*
*з палубы саду-джонкі*
*скочыць паўголым, босай.*

*Ці ж не цудоўна ў раі*
*белых стандартных крэслаў?*
*Велічна дагарае*
*на даляглядзе крэйсер.*

*Толькі паблізу недзе,*
*тоячы ціш кватэраў,*
*сталі дамы на рэйдзе*
*яхтамі мільянераў.*

* * *

*Халодным жніўеньскім днём...*
*Анемпадыстаў*

*Гарыць зрання*
*да схілу дня*
*ліхтар. Імгнення даўжыня*

*ўвагнала клін*
*у бег хвілін.*
*Мы прайграем, таму й фалім —*

*стары прыём.*
*Дажджлівым днём*
*арыштаваны акаём.*

*Надвор'е кпіць.*
*Кацейка спіць.*
*Субота. Застаецца піць.*

* * *

*Апошні месяц у Стакгольме*
*заўжды быў лепшым, чымся першы.*
*Хоць прэч ніхто нас не прыспешваў —*
*Ад'езд лунаў у наваколлі.*

*Прэч не хацелася, ды ў цэнтры*
*больш не было дзе заставацца —*
*шчаслівa, сумны «Густаў Ваза»*,*
*плывец ля берагу-плацэнты,*
*пакуль, дармовыя канцэрты*
*і тусінг чатырохпрацэнтны —*

*і мы вярталіся на вёску,*
*а нам зайздросцілі: у Прагу!..*
*Пазней «пашчасціла» бадзягу:*
*я ўсё ж прапіскай абзавёўся*

*з тваёй адрэсаю. І хоць там*
*не быў, не бачыў той кватэры —*
*і я калісьці быў стакгольмцам.*
*Прынамсі ў думках. На паперы.*

* Карабель-музей у Стакгольме.

## Цішыня

*Цяжкія каласы фантану*
*пад корань верасень падцяў,*
*адбыўся пострыг у нірвану*
*зімы — на тле паўзабыцця*

*я мкнуся прыгадаць кватэру,*
*дзе быў гадзіннік як абраз,*
*што пацвярджаў маё «не веру»*
*перыядычным сонным «бразь»,*

*яму пад колер піяніна*
*гуло затоенай струной,*
*бы закаханае наіўна*
*ў ягоны вымушаны бой,*

*над алтаром Мадона Літа*
*душыла цыцкай дзіцяня,*
*што перачытвала сярдзіта*
*назовы кніжныя штодня.*

*Партрэт, калісьці цудадзейны,*
*у цішыні старэў, і мы*
*сям'ю нагадвалі ўсё меней,*
*а больш — адлеглыя шумы...*

*Я так люблю яго, халера —*
*свой дом — і крэпасць, і прыгон...*
*І хай пад хвост мяне Палерма**
*ўзасмок цалуе наўздагон.*

* Раён Буэнас-Айрэсу.

ПЕРАКЛАД

# ХТО ЗАБІЎ ПАЛАМІНА МАЛЯРО?

## ФРАГМЕНТЫ АПОВЕСЦІ НОБЕЛЬСКАГА ЛАЎРЭАТА 2010 ГОДА

«Пісьменнік быў, ёсць і заўсёды будзе незадаволеным — справа ідзе менавіта так і ніяк інакш. Чалавек здаволены, згодны, прыміраны з рэчаіснасцю не здольны пісаць...» — такую думку, выказаную яшчэ ў 1967 годзе пры ўручэнні яму прэміі Ромула Гальягоса, Льёса з тых часоў падкрэсліваў і вар'іраваў у многіх сваіх выступах і паўтарыў амаль літаральна ў адным з інтэрв'ю: «Галоўным стымулам пісьменніцкай творчасці заўсёды быў і застаецца бунт супраць рэальнасці, які нараджае імкненне стварыць новую, вербальную рэальнасць». Сапраўды, дух мяцяжу, праяўлены і ў плане эстэтычным — у адважных фармальных эксперыментах, — адчувальны ва ўсіх творах Варгаса Льёсы…

Ён ніколі не хаваў сваёй прыхільнасці да авантурнага рамана і займальнага сюжэта; за два гады да з'яўлення аповесці «Хто забіў Паламіна Маляро?» Варгас Льёса казаў: «...Мне заўсёды хацелася напісаць авантурны раман, але не такі, дзе сюжэт адарваны ад гістарычнай рэальнасці, а іншы, што расце з блізкай мне рэчаіснасці і які ў той жа час паказвае экстраардынарныя падзеі, якія выходзяць за межы чалавечага...». Якраз менавіта такога тыпу твор і ўяўляе сабой аповесць, чыё дзеянне працякае на фоне дэталёва прапісанай, знаёмай аўтару да дробязяў жыцця перуанскай правінцыі…

Аповесць Варгаса Льёсы незвычайная тым, што парадыйныя элементы ў ёй затушаваныя: аўтар «гуляе» ў радыёнавэлу «сур'ёзна», часам як бы сам забываючы аб гульні, уводзячы ў зман шэраговага чытача. Падобная «сур'ёзная гульня» ў масавую літаратуру, вядома, цікавая; але ці не ўтойвае яна ў сабе небяспеку?..

**А. Кофман**

**Марыё Варгас ЛЬЁСА**



Фота www.nobilit.ru

## I

— Даўбаць мяне ў лоб, — асільваючы прыступ млосці, сказаў Літума. — Распісалі на славу.

Цела юнака, павешанага і пасаджанага на востры сук ражковага дрэва, і напраўду было знявечанае так, што больш нагадвала мяккую ляльку альбо пудзіла, якое спальваюць на масленіцу. Лютасць забойцаў была бязмерная: яны спаласавалі яго нажамі, адрэзалі нос і вушы, на целе, пакрытым згусткамі засохлай крыві, заўважныя ліловыя сінякі, сляды рэзаных ранаў і апёкаў.

Тыкалі цыгарэтай, сцяміў Літума. У дадатак да ўсяго юнака збіраліся аскапіць. Забіты — зусім юны, асмуглы, далікатны, кашчавы — быў босым і апранутым у адну толькі кашулю, разадраную ў жмуты. Над дробнымі колцамі чорных блішчастых валасоў віліся мухі. Вакол па камяністай пустцы блукалі козы, паскубвалі чэзлую траўку, і Літума раптам падумаў, што яны вось-вось пачнуць грызці ступакі забітага. Зноў падкаціла млоснасць.

— Хто ж гэта яго так? — прамармытаў ён.

— Адкуль я ведаю?! — адазваўся пастух. — Мяне ў гэтую справу не ўблытвай. Скажы дзякуй, што я паведаміў на пост.

— Ніхто цябе і не ўблытвае. Проста ў галаве не ўкладваецца, што ёсць на свеце такія ка́ты.

Так, калі сёння раніцай перад вачыма пастуха, які прыгнаў сюды сваіх козаў, паўстала гэтая карціна, можна было і заікай застацца, аднак ён паказаў сябе свядомым грамадзянінам: кінуў козаў, а сам панёсся ў Талару паведаміць у паліцыю. Малайчына пастух — да Талары ходу хуткім крокам не меней гадзіны.

Літума ўспомніў, як прасунуўся ў дзверы заліты потам твар і перарыўны голас сказаў:

— Тамака, на дарозе ў Лабітас, зарэзалі кагосьці! Калі хочаце, праведу, пакажу, толькі збірайцеся хутчэй. Я пакінуў козаў без нагляду, як бы не пакралі.

На шчасце, на козаў ніхто не пакваліўся; калі прыбылі на месца, Літума, якога ад жудаснага відовішча прабіла дрыготка, чуў, як пастух, пералічыўшы статак, уздыхнуў з палёгкай: «Усе тут».

— Матка божая! — крыкнуў за спіной Літумы таксіст. — Што ж гэта робіцца?

Хоць па дарозе пастух распавёў ім, у якім выглядзе выявіў ён труп, але адна справа чуць, і зусім іншае — зірнуць уласнымі вачыма ды яшчэ і запашок адчуць. Смурод ішоў такі, што ў галаве каламуцілася, ды і нядзіўна: ад сонца, здавалася, камяні расплавяцца, мазгі расцякуцца. Труп пачаў раскладацца.

— Дапамажы мне выняць яго з пятлі, — папрасіў Літума.

Таксіст пераржагнаўся і сплюнуў.

— Вось пашанцавала… — прабубнеў ён. — Знаў бы раней, на што спатрэбіцца мой «Форд», не купіў бы. Вечна вы з вашым лейтэнантам карыстаецеся маёй дабрынёй.

Дон Хераніма быў у Талары адзіным таксістам. Лейтэнант Сільва і Літума карысталіся яго паслугамі кожны раз, калі да месца здарэння было не дабрацца конна або на ровары — адзіным транспарце, які знаходзіўся ў распараджэнні мясцовай паліцыі, — і кожны раз таксіст лаяўся, бурчэў і казаў, што з-за іх ён пазбаўляецца законнага заробку, хоць лейтэнант плаціў за бензін…

— І хто ж гэта?

— Навабранец з авіябазы! Ну вядома! Родам ён, здаецца, з Піуры. У яго яшчэ голас быў выключны. […]

## II

— Голас быў выключны? Можа, гэта той самы, аб кім я табе распавядаў, — сказаў Мона.

— Ён і ёсць, — кіўнуў Літума. — Мы праверылі. Ён. Звалі яго Паламіна Маляро, жыў на вуліцы Кастыліі. Толькі ад гэтага не становіцца ясней, хто яго і зашто.

Гутарка адбывалася ў маленькім кафэ Чунгі, непадалёк ад спартовай залы, адкуль даносіліся крыкі заўзятараў: у гэтую хвіліну пачыналіся спаборніцтвы па боксе. Літума, у якога сёння быў выходны, прыехаў у Піуру на грузавіку нафтавай кампаніі, а апоўначы збіраўся на ім жа вярнуцца назад, у Талару. Наязджаючы ў Піуру, Літума абавязкова ішоў пабачыцца са сваімі стрыечнымі братамі — Хасэ і Мона — і са старадаўнім прыяцелем Хасэфіна з квартала Гальінасэра. Сам Літума і браты нарадзіліся ў квартале Мангачэрыя, які здаўна супернічаў з Гальінасэрай, аднак сяброўства, што злучала чацвярых мужчынаў, здолела ўзвысіцца над квартальнай розніцай. Літума, браты і Хасэфіна жыць не маглі адзін без аднаго; члены гэтага саюза, якія называлі сябе «непераможнымі», мелі свой уласны гімн.

— Разблытай гэтую справу, Літума, і цябе ўзвядуць у генералы, — не без яхіднасці сказаў Мона.

— Ага, паспрабуй разблытай: ніхто нічога не ведае, ніхто нічога не бачыў. І горш за ўсё тое, што ад уладаў ніякай дапамогі чакаць не даводзіцца.

— Слухай, няўжо не ты ў нас у Талары галоўны? — здзівіўся Хасэфіна.

— Мы з лейтэнантам Сільвай — прадстаўнікі закона, а спрыяць нам павінна камандаванне авіябазы: забіты ж быў вайскоўцам. Але ад ВПС дапамогі хрэн дачакаешся. — Літума садзьмуў пену і, разявіўшы, як кракадзілаву пашчу, рот, глынуў піва. — Даўбаць іх усіх у лоб! Калі б вы бачылі, што засталося ад гэтага небаракі, і ў вас бы настрой сапсаваўся, і да дзевак таксама б дарогу забылі. Тады вы ўкемілі б, чаму я ні аб чым іншым і думаць не магу.

— Ды мы зразумелі, Літума, — сказаў Хасэфіна, — усё зразумелі. Толькі годзе аб гэтым. Ты ўжо нам усе мазгі прадзяўбаў.

— Твая служба дарма не праходзіць, — сказаў Хасэ. — Крыху пашкодзіўся ты ў паліцыі, вось што, Літума. Або зусім не падыходзіш ты для гэтага: у сапраўднага паліцыянта сэрца каменнае, ён у выпадку чаго родную маці не пашкадуе. А ты ўжо моцна адчувальны і мяккацелы: ледзь што — соплі распускаеш.

— Што ёсць, тое ёсць, — скрушна прызнаў Літума. — Ніяк не магу забываць гэтага хлопца. Нават у сне сніцца. Адцягнулі небараку ледзь не да каленаў усю гаспадарку ды яшчэ і расціснулі.

— Дарэчы, аб гаспадарцы: як твой лейтэнант? Дала яна яму нарэшце? — спытаў Хасэ.

— Так! Дакладна! Зусім ты нас задурыў! — падхапіў Хасэфіна. — Распавядзі пра лейтэнанта Сільву. Як рухаюцца яго справы з таўстухай?

— Ніяк не рухаюцца. Жыцця не хопіць, каб яе ўлашчыць, — уздыхнуў Літума.

Хасэ ўстаў з-за стала.

— Не ці схадзіць нам пакуль у кіно? Да ночы тут з нуды здохнеш. У «Вар'едадэс» сёння круцяць нешта з мексіканскага жыцця, з Расітай Кінтанай. Пайшлі! Начальнік нас частуе.

— Грошай няма, — сказаў Літума. — Нават за піва не расплаціцца. Адпусціш у доўг, Чунгіта? Я аддам.

— Матулі сваёй залівай, — змрочна адазвалася з-за стойкі гаспадыня.

— Іншага адказу і не чакаў. Не хвалюйся, заплачу. Гэта я так, жартам.

— З матуляй сваёй жартуй, — пазяхнула Чунга.

— Два-нуль у карысць Чунгі! — выгукнуў Мона.

— Не сярдуй, гаспадынька, — сказаў Літума. — Вось, атрымай. І не чапай больш маю бедную маму — яна ўжо даўно спіць у Сімбіле вечным сном.

Чунга, жанчына высокага росту, суровага выгляду і нявызначанага веку, спрытна згрэбла крэдыткі, пералічыла іх і выклала на стойку рэшту, калі паліцыянт, браты і Хасэфіна ўжо накіроўваліся да дзвярэй.

— Даўно хачу цябе спытаць, Чунгіта, — павярнуўся да яе Хасэфіна. — Як дагэтуль за тваю дабрыню і ветласць ніхто не шарахнуў цябе бутэлькай па башцэ?

— Вельмі ты цікаўны, — не ганаруючы яго поглядам, адказала тая.

— Ну, не адчайвайся, яшчэ шарахнуць, вельмі ты ўжо мілая.

— Як бы цябе самога не шарахнулі, — пазяхнула гаспадыня, зноў вяртаючыся за стойку — тоўстую дошку, пакладзеную на шэраг бочак.

Чацвёрка «непераможных», буксуючы ў пяску, дайшла да шашы, абмінула Клуб і рушыла да помніка Грау. Ноч была ціхая, цёплая, зорная. Пахла салодкімі ражкамі, казінай поўсцю, чымсьці смажаным, і Літума, які ўсё ніяк не мог забыць знявечаны труп Паламіна Маляро, спытаў сябе, а ці не дарма пайшоў ён на службу ў паліцыю, пакончыўшы з вольным жыццём «непераможнага»? Не, не дарма. Хоць круцішся як вавёрка ў коле, але затое сыты кожны дзень і ў будучыню глядзіш без боязі. Хасэ, Мона і Хасэфіна насвістваў вальс, а ён спрабаваў уявіць сабе мурлычны голас забітага хлопца і чароўную мелодыю яго балеро — у гэтым мастацтве ён, па агульным меркаванні, не ведаў сабе роўных. Ля ўваходу ў кінатэатр Літума развітаўся з прыяцелямі, нахлусіўшы ім, што сёння грузавік нафтавай кампаніі вяртаецца ў Талару раней звычайнага і ён баіцца спазніцца. Яны паспрабавалі было выцыганіць у яго грошай у доўг без аддачы, але Літума забіў іх намер у корані.

Скрай пляца Армас ён заўважыў паэта Хаакіна Рамаса — уставіўшы ў вачніцу манокль, ён абдымаў казу, завучы яе газэллю. Пляц быў, як на свята, запоўнены народам. Літума, ні на кога не звяртаючы ўвагі, хуткім крокам, нібы спяшаўся на спатканне, перасёк Стары Мост і выйшаў да вуліцы Кастыліі. А раптам яе няма дома? Думка гэтая ахінула яго, яшчэ калі яны пілі піва. А раптам яна вырашыла пакінуць горад, дзе ўсё нагадвала ёй аб няшчасці, і пераехаць яшчэ куды-небудзь?

Аднак жанчына, лузгаючы кукурузіну, сядзела на ўслончыку перад домам — мусіць, выйшла падыхаць вячэрняй прахаладай. Дзверы ў глінабітную халупу былі адчыненыя, і газавая лямпа асвятляла ўбогае ўбранне: прадраныя саламяныя крэслы, стол, скрыню, якая служыла, верагодна, буфетам.

На сцяне вісела каляровая фатаграфія. «Паламіна», — сцяміў Літума.

— Вечар добры, — вымавіў ён, падыходзячы бліжэй. Жанчына — яна была басанож і ў той жа чорнай сукенцы, у якой ён яе бачыў раніцай у паліцыі, — адказала напаўголасу і зірнула на Літуму, відавочна не пазнаючы яго. Непадалёк бурчалі і церліся худыя сабакі. Аднекуль данёсся гітарны перабор.

— Ці не дазволіце перамовіцца з вамі словам, донна Асунта? — з усёй паважнасцю спытаў Літума. — Я наконт вашага сына Паламіна.

У прыцемку ён ледзь адрозніваў яе маршчыністы твар, недаверлівыя вочы пад азызлымі вейкамі. У яе заўсёды былі такія вочы ці апухлі ад бясконцых слёз, разлітых за апошнія дні?

— Не пазнаеце? Я — Літума, паліцыянт з Талары. Мы з лейтэнантам Сільвай здымалі з вас паказанні. Памятаеце?

Жанчына нешта невыразна прамармытала і пераржагналася. Літума ўбачыў, што яна з цяжкасцю паднімаецца на ногі і ідзе ў хату, несучы талерку з кукурузнымі зярнятамі і ўслончык. Ён рушыў следам, ступіў праз парог, зняў фуражку. Думка аб тым, што ён знаходзіцца ў бацькоўскім прытулку забітага юнака, хвалявала і прыгнятала яго. Літума з'явіўся сюды не па загадзе, а па ўласнай ахвоце, так што наракаць трэба было на сябе.

— Знайшлі яе? — спытала жанчына, і голас яе дрыжаў і перарываўся, як падчас допыту ў Талары. Яна апусцілася на крэсла і, бачачы, што Літума глядзіць на яе неўразумела, паўтарыла гучней: — Гітару сыночка майго? Знайшлі?

— Яшчэ не, — адказаў Літума, успомніўшы, што на допыце донна Асунта, адказваючы на пытанні лейтэнанта і заліваючыся слёзамі, настойліва патрабавала

аддаць ёй гітару забітага. Аднак, калі яна сыйшла, яны абодва адразу забыліся аб тым. — Ды вы не трывожцеся. Адшукаем абавязкова, я вам яе асабіста дастаўлю.

Жанчына зноў перажагналася, нібы адганяючы нячыстага. «Я ёй нагадваю аб яе бядзе», — падумаў Літума.

— Ён хацеў тут яе пакінуць, а я казала: «Нясі, нясі», — спеўна загаварыла яна, крывячы беззубы рот. — «Не, мама, на службе гуляць мне няма калі, і трымаць яе мне тамака няма дзе. Хай тут ляжыць, прыйду ў звальненне, пайграю». А я яму: «Забяры яе, сынок, хай яна з табой будзе, усё весялей, падыграеш сабе, як станеш спяваць. Не разлучайся са сваёй улюбёнкай, Паламіна». Ай, бедны мой сыночак!..

Яна заплакала наўзрыд, і Літума зноў пашкадаваў, што сваім прыходам раз'ятрыў ёй рану. Збянтэжана чухаючыся, ён замармытаў нейкія словы суцяшэння, спрабуючы справіцца з няёмкасцю, сеў на крэсла. Так, на фатаграфіі быў Паламіна пасля першага прычасця. Літума доўга глядзеў на доўгі, худы твар асмуглага, дбайна прычэсанага хлопчыка ў белым гарнітурчыку, з ладанкай на грудзях, са свечкай у правай руцэ і з малітоўнікам — у левай. Фатограф падмаляваў на здымку шчокі і вусны. Якое захапленне застыгла ў вачах гэтага заморка — сапраўды сам Хрыстос немаўля паўстаў яму.

— Ён ужо і тады наўздзіў добра спяваў, — вымавіла донна Асунта, паказваючы на здымак. — Падрэ Гарсія яго аднаго паклікаў спяваць у царкоўным хоры. Людзі яму пляскалі прама пасярод службы.

— Так, усе кажуць, голас быў выключны, — адзначыў Літума. — Хто ведае,можа, з яго выйшаў бы сапраўдны артыст — спяваў бы па радыё, ездзіў бы па ўсім свеце. Усе так лічаць. Тых, у каго такі талент, нельга ў войска забіраць.

— Паламіна прызыву і не падлягаў, — сказала донна Асунта. — У яго было вызваленне.

Літума зазірнуў ёй у вочы, а яна зноў перажагналася і заплакала.

— Варажэя сказала, калі знойдзецца гітара, то і забойцаў схопяць, — скрозь слёзы казала донна Асунта. — У каго гітара, той і забіў майго хлопчыка.

Літума паківаў. Нясцерпна хацелася курыць, але лезці па цыгарэты ў прысутнасці гэтай расціснутай горам жанчыны было ніякавата.

— Дык вы кажаце, Паламіна быў вызвалены ад вайсковай павіннасці? — нерашуча спытаў ён.

— Закон такі ёсць: адзінага сына ў войска не забіраюць. Я ж удава. Паламіна адзін у мяне застаўся: двух старэйшых пахавала.

— Закон жа, выходзіць, парушылі. — Літума зноў зашкробся, упэўнены, што донна Асунта расплачацца яшчэ мацней. — Выходзіць, яго не мелі права прызываць. Не забралі б, быў бы жывы.

Донна Асунта, выціраючы слёзы краёчкам спадніцы, пахітала галавой. Удалечыні па-ранейшаму звінелі струны гітары, і Літума, выдатна ўсведамляючы ўсю недарэчнасць гэтага, падумаў раптам, што гэта Паламіна Маляро сядзіць цяпер у цемры на беразе ракі, глядзіць на месяц ды іграе на гітары.

— Ніхто яго не забіраў, — ледзь вымавіла донна Асунта. — Ніхто не прымушаў. Ён сам пайшоў, добраахвотна. Хацеў у авіяцыі служыць. Вось сам і адшукаў сабе пагібель.

Літума моўчкі глядзеў на яе. Донна Асунта была малая ростам, босыя ногі яе ледзь даставалі да падлогі.

— Сеў у аўтобус, паехаў у Талару, на базу, і сказаў, што хоча служыць у авіяцыі. Сам напрасіўся, бедненькі мой сыночак, сам да смерці пайшоў. Сам! Сам!

— Чаго ж вы не распавялі аб гэтым лейтэнанту? — спытаў Літума.

— А хіба ж ён пытаў? Пра што пыталі, аб тым і распавядала.

Дакладна. Яе пыталі, ці былі ў Паламіна ворагі, ці пагражаў яму хто-небудзь, ці не здаралася яму пасварыцца або сашчапіцца з кім-небудзь, ці не было ў кагосьці падставы помсціць яму, ці не казаў ён маці, што збіраецца збегчы з авіябазы. І на ўсе пытанні яна ціхім голасам адказвала: не, ніхто, ніколі. Лейтэнант насамрэч не спытаў у яе, ці добраахвотна пайшоў Паламіна ў войска.

— Што ж, яму хацелася быць вайскоўцам? — здзівіўся Літума. Паламіна стаў зусім не падобны да таго хлопчыка з гітарай, якога ён сабе ўяўляў.

— Сама ў толк ніяк не вазьму! — заплакала донна Асунта. — Навошта ты гэта зрабіў, сыночак? Куды табе ў лётчыкі?! Навошта табе ў Талару? Самалёты ж разбіваюцца, хочаш, каб я ні днём, ні ўначы супакою не ведала? І як ты мог рашыцца на такое, слоўцам не абмовіўшыся? «Калі б я раней сказаў, ты б мяне не пусціла, мама». Дык навошта табе гэта, Паламіна? «Мне трэба жыць у Талары, мама. Гэта вельмі для мяне важна. Пытанне жыцця, мама».

«Хутчэй смерці», — падумаў Літума.

— А чаму, сеньёра, яму было так важна патрапіць у Талару?

— Цяпер ужо я ніколі аб тым не даведаюся, — у чацвёрты або ў пяты раз перажагналася яна. — Ён мне растлумачыць не захацеў, і панёс гэтую таямніцу з сабой. Ай, Паламіна, сынок! На каго ж ты мяне пакінуў?!

Пярэстая каза прасунула галаву ў дзверы і ўтаропілася на жанчыну вялікімі жаласлівымі вачыма. Хтосьці тузануў за вяроўку, галава схавалася. […]

## VIII

[…] Донна Адрыяна зноў засмяялася, і Літума падумаў, што тыя грандыёзныя падзеі, над якімі плакала і вохкала ўся Талара, у яе выклікаюць толькі смех. Вось ужо тры дні была яна такая. Гэтым смехам яна частавала іх з лейтэнантам на сняданак, абед і вячэру ўчора, заўчора і пазапазаўчора.

Лейтэнант Сільва, наадварот, усе гэтыя дні быў хмурным, відавочна пачуваўся не ў сваёй талерцы і выгляд меў такі, нібы ў жыцці яго здарылася нейкая буйная гадасць. У пятнаццаты, мусіць, раз за гэтыя тры дні Літума спытаў сябе: «Што з імі абодвума дзеецца?». Званілі званы да імшы, і донна Адрыяна, усё яшчэ смеючыся, ахінула сябе хросным знакам.

— Ну а што, па-вашаму, зробяць з гэтым лейтэнанцікам, з Дуфо? — спытаў дон Хераніма.

Быў час абеду. Акрамя Літумы, лейтэнанта і таксіста ў харчэўні сядзела яшчэ маладая пара, якая прыехала з Сорритоса на хрэсьбіны.

— Пойдзе пад трыбунал, — змрочна адказваў лейтэнант, упёршыся позіркам у сваю пустую талерку.

— Ну а будзе яму што-небудзь? — настойваў дон Хераніма. Ён еў сальтадыта з рысам і адначасова абмахваўся газетай. — Я так лічу, за тое, што ён вытварыў з бедным Паламіна, па галоўцы не пагладзяць, а?

— Правільна лічыце, — з набітым ротам адказваў лейтэнант, і ў голасе яго гучала просьба даць яму паесці спакойна. — Будзе, будзе. Што-небудзь ды будзе.

Літума заўважыў, што лейтэнант увесь унурыўся, скурчыўся на крэсле. Гаспадыня набліжалася да іх. На ёй была моцна адкрытая сукенка ў кветачку, пад якой так і хадзілі яе грудзі й сцёгны. Уся яна выпраменьвала дастатак, здароўе і відавочна была ў поўным ладзе са светам і з самой сабой.

— Выпіце глыточак вадзіцы і не спяшайцеся так, а то ежа ў вас пойдзе не туды, куды трэба, — са смехам сказала яна і гулліва папляскала лейтэнанта па спіне.

— Вас у апошні час і не пазнаць, — сказаў Літума, разглядаючы яе.

Яна і напраўду вельмі змянілася, стала вясёлая і какетлівая незразумела з чаго.

— Значыць, ёсць на тое прычыны, — адказвала гаспадыня, склала посуд з суседняга століка і захіралася на кухню. Зад яе пры гэтым рухаўся так выразна, нібы пасылаў ім усім развітальнае прывітанне. «Госпадзі божа», — падумаў Літума.

— Не ведаеце, чаго яна так ззяе? — спытаў ён лейтэнанта.

Замест адказу той кінуў на яго забойны погляд праз шкельцы сваіх цёмных акуляраў і зноў утаропіўся на вуліцу, дзе юны пеўнічак азлобленa дзёўб зямлю. Потым ён раптам замахаў крыламі і ўзляцеў.

— Жадаю вам сёе-тое сказаць, лейтэнант, вы не пакрыўдзіцеся? — сказаў дон Хераніма.

— Лепш не трэба, — прабурчэў той. — Не той настрой.

— Зразумеў. Маўчу, — адазваўся таксіст.

— Ну што, будуць новыя ахвяры? — са смехам азвалася з кухні донна Адрыяна.

[…] «Смяшынка ёй у рот патрапіла, — падумаў Літума. — Трэба мне адведаць дзяўчатак кітайца Лао, а то хутка развучуся». Паміж ім і таксістам стаяў стол парачкі з Сорритоса, і тыму перагаворвацца даводзілася праз іхнія галовы. І ён, і яна былі маладыя, апранутыя як на свята і з цікаўнасцю круцілі галовамі, прыслухоўваючыся да гутаркі Літумы, лейтэнанта і дона Хераніма.

— Не, усё ж скажу, хоць вам і не спадабаюцца мае словы. Хачу, каб вы ведалі, — рашуча загаварыў таксіст, у такт сваім словам пастукваючы скручанай газетай па стале. — Ні адзін сабака ў Талары не верыць у гэта. Нават вунь той пеўнік — і той не верыць.

Кураня-перарастак ужо вярнулася на ранейшае месца і цяпер з панурым выглядам раздзірала заціснутую ў дзюбе яшчарку. Лейтэнант працягваў есці, ні на што не звяртаючы ўвагі, цалкам пагружаны ў свае невясёлыя думкі.

— Пра што ты, дон Хераніма? — спытаў Літума.

— Аб тым, што палкоўнік Міндро застрэліў сваю дачку, а потым паканчыў з сабой, — цвыркаючы зубам і сплёўваючы, адказаў таксіст. — Які ідыёт паверыць у такую байку?

— Я. Я — той ідыёт, які верыць у тое, што палкоўнік забіў Алісію і паканчыў з сабой, — сказаў Літума.

— Не трэба прыдурвацца! — разрагатаўся дон Хераніма. — Абодвух прыкончылі, каб не прабрахаліся і каб зваліць забойства Паламіна на палкоўніка. Так што давай не будзем!

— Ах, вось якое цяпер плёткарства ідзе? — падняў галаву лейтэнант. — Значыць, палкоўніка забілі? І хто ж, дазвольце даведацца?

— Важныя птушкі, я лічу, — развёў рукамі таксіст. — Хто ж яшчэ? І вы, лейтэнант, не круціце, не трэба, тут усе свае. Ясна, што вы не маеце права казаць. Усе ведаюць, што вам заткнулі рот, каб, не дай бог, не ўсплыла праўда. Справа вядомая.

Лейтэнант пацiснуў плячыма, даючы зразумець, што ўсе гэтыя здагадкі не цікавяць яго ніколькі.

— Яны нават пусцілі чутку, што палкоўнік быццам бы жыў з Алісіяй, — сплюнуў чарговае зярнятка рысу дон Хераніма. — Вось жа набрыдзь. І мерцвякоў у спакоі не пакідаюць. Набрыдзь. Табе не здаецца, Адрыяначка?

— Мне многа чаго здаецца, — разрагаталася жонка дона Маціяса.

— Значыць, усе думаюць, што гэта выдумкі, — кісла прамармытаў лейтэнант, зноў прымаючыся за ежу.

— Зразумела, выдумкі. Гэта ўсё таму, каб схаваць сапраўдных забойцаў.

Завыла сірэна цукровага завода, і кураня, падняўшы галаву, натапырылася, на некалькі імгненняў застыгла ў напружаным чаканні. Потым схавалася, падскокваючы.

— Ну а за што, па-твойму, разабраліся з Паламіна? — спытаў Літума.

— За кантрабанду. Шматмільённая справа, — упэўнена адказаў Хераніма. — Спачатку яго прышылі — ён нешта знаў. А калі палкоўнік Міндро даведаўся аб забойстве, і яго прыкончылі, а за ім і дачку. А потым распусцілі чутку, быццам бы палкоўнік, прырайнаваўшы дачку да Паламіна, забіў салдаціка. Вось яны і навялі цень на ясны дзень ды дамагліся, чаго хацелі: цяпер пра галоўнае — пра мільёны — ніхто і не ўспамінае.

— Госпадзі, чаго толькі не прыдумаюць людзі, — уздыхнуў лейтэнант, так люта скрабучы па талерцы відэльцам, нібы хацеў зламаць яе. […]

— А яшчэ кажуць, ва ўсім вінаватыя педэрасты, — сказаў Панчыта.

— Так? — аблізваючы вусны, заміргаў дон Хераніма. — Можа быць.

— Цалкам магчыма, — сказаў Панчыта. — У казармах заўсёды квітнеюць такога роду справы. А суб'екты гэтыя, самі ведаеце, рана ці позна скатваюцца да злачынстваў. Прабач, Марысіта, што мы завялі пры табе гэтую гутарку.

— Нічога, Панчыта. Жыццё ёсць жыццё.

— Цалкам магчыма, — разважаў над пачутым таксіст. — А як была справа? Хто з кім жыў?

— Ніхто не верыць у самагубства палкоўніка, — рэзка змяніла тэму донна Адрыяна.

— Чую, — прамармытаў Літума.

— Я і сама не вельмі-та веру.

— Не верыце? — Літума, падняўшыся з-за стала, падпісаў рахунак за абед. — А я вось у вашую гісторыю паверыў, а гэта меней праўдападобна, чым самагубства палкоўніка Міндро. Будзьце здаровыя, донна Адрыяна.

— Эй, Літума, — паклікала яна і, калі ён вярнуўся да стала, паглядзела на яго зіхоткімі хітраватымі вачыма ды, моцна паніжаючы голас, сказала: — Перадай свайму лейтэнанту, што сёння ноччу, мабыць, дам яму замясіць мучыцы ў маёй дзежцы. Так што хай зменіць гнеў на літасць.

Яна зазыўна засмяялася. Не ўтрымаўся і паліцыянт.

«Чорт іх разбярэ, гэтых жанчын», — думаў ён, накіроўваючыся да дзвярэй.

Наўздагон яму даляцеў голас таксіста:

— Гэй, Літума, чаму б табе не сказаць нам, колькі адслюнявілі тваймy начальніку, каб ён прыдумаў гэтую гісторыю з самагубствам?

— Мне не падабаюцца такія жарты, — адказаў ён не паварочваючыся. — А лейтэнанту яны спадабаюцца яшчэ менш. Глядзі, дон Хераніма, яны могуць табе дорага абысціся.

Ён пачуў, як таксіст вылаяўся скрозь зубы, і памарудзіў на парозе: не ці вярнуцца? Аднак вырашыў не вяртацца.

Выйшаў на распаленую вуліцу. Пакрочыў па гарачым пяску, міма хлапчукоў, што ганялі анучны мяч, — цені іх дрыготкім мудрагелістым узорам клаліся яму пад ногі. Ён змакрэў, кашуля прыліпла да лапатак. Ці можна паверыць донне Адрыяне? Давудзіцца верыць. Цяпер зразумела, чаму лейтэнант з той начы як аплёваны. Вось як сур'ёзна яго заела. Вакол такое дзеецца, а ён усё пра таўстуху думае.

Нельга так распускацца. Вось і паплацяўся. Але хто б мог чакаць ад донны Адрыяны? Бой-баба.

Літума ўявіў сабе, як гаспадыня ў чым маці нарадзіла, вагаючы дароднае цела, здзекуецца з лейтэнанта, а той, разгубіўшыся, вушам сваім не верыць. Дык хто ж тут не разгубіцца? Тут ужо ні да чаго, давай бог ногі. Ён засмяяўся.

У паліцыі ён заспеў лейтэнанта: той сядзеў за сваім сталом па пояс голы, абліваючыся потам. […]

— Кепскія навіны, друг Літума, — сказаў лейтэнант. — Цябе пераводзяць у дэпартамент Хунін, да чорта ў зубы. Прыбыць належыць неадкладна. Аўтобус табе аплоцяць.

— У Хунін? — перапытаў Літума, зачараванa гледзячы на тэлеграму. — Мяне?

— Мяне таксама пераводзяць, толькі пакуль не ведаю куды. Мусіць, быць, да такой-та маці.

— Гэта, мабыць, далёка, — прамармытаў Літума.

— Вось што я табе скажу, ёлупень ты мой Літума, — з запалам загаварыў лейтэнант. — Вось хацеў ты разблытаць справу аб забойстве Паламіна Маляро. Гатова, разблытаў! І што ж? Заместа ўзнагароды цябе пасылаюць у горы, далей ад гэтага сонейка і ад тых, да каго ты прывязаўся. Вось як табе аддзячылі за бездакорную службу ў грамадзянскай гвардыі, куды ты меў дурасць паступіць. Цябе пераводзяць, куды крумкач костак не данясе. Толькі падумаю аб тамтэйшай сцюжы, завыць хочацца.

— У лоб іх усіх даўбаць, — задуменна прамовіў Літума.

**Пераклад Ксеніі Задарожнай.**

**На правах перад'інаўгурацыйнай рэкламы зроблены паводле сеціўнай публікацыі аповесці.**

ДЭБЮТ

# АПОВЕСЦЬ ПРА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ

◂ **Заканчэнне. Пачатак у N37 (213) на стар. 22.**

Сяргей ЕГАРЭЙЧАНКА

…Месяц схаваўся за хмарамі, нават снег, падавалася, перастаў блішчаць за агароджай. Мне зрабілася няўтульна.

Хвілін дзесяць я ішоў, нічога не заўважаючы навокал. Было зусім ціха, нават снег пад нагамі рыпеў неяк прыглушана, нібыта не хацеў парушаць трывожнай цішыні.

Потым пачуўся грукат рухавіка. Я спыніўся і прыглядзеўся ў цемру.

У адчыненую браму заязджалі некалькі грузавікоў. Фары ў іх былі ўключаныя, і я міжволі прыціснуўся да дошак, каб промні не склізнулі па мне.

Машыны спыніліся. Паміж мной і імі было метраў сто пяцьдзесят, і я вырашыў асцярожна прабрацца як мага бліжэй. Я поўз, як мне падавалася, вельмі ціха. Метрах у дваццаці да бліжэйшага грузавіка я спыніўся за чарговай елкай і падняў галаву.

Акурат за машынамі зямля нібыта разгарнула сваю пашчу няроўна разрытай траншэі. Адвалы былі адкіданы роўнымі валамі ўбок, напэўна для таго, каб потым было лягчэй закопваць. Улічваючы прамерзласць зямлі ў гэты час году, было нескладана ўявіць, колькі працы было прыкладзена, каб выкапаць яміну.

Побач з грузавікамі стаялі дзве легкавушкі. Крыху далей — чалавек дзесяць у форме НКУС. Яны палілі і аб чымсьці размаўлялі паміж сабой. Я напружыў слых, але здолеў разабраць толькі нязвязаныя абрыўкі размовы. Некалькі разоў да мяне даляцелі словы «першая партыя» і «Раманаў». Пару разоў яны пачыналі рагатаць, гучна, у голас.

Потым на дарозе паказалася яшчэ адна легкавушка. Яна спынілася побач з першымі дзвюма. З пасажырскага месца выскачыў афіцэр... старшы лейтэнант Звягінцаў...

Пры ягоным з'яўленні ўсе пакідалі цыгарэткі ў снег і выцягнуліся перад ім у струнку.

— Вольна. Здароў, хлопцы, — ён падышоў да кожнага асабіста і кожнаму паціснуў руку. Голас у яго быў вельмі гучны, мне было чуваць яго куды лепш, чым астатніх. — Ну што, сёння напружаная ноч, вельмі буйная партыя. Заўтра кожнаму з вас я даю дзень адпачынку. Астатняе як звычайна. Боекамплекты праверылі? На ўсіх хапае?

Шэраг нястройна пацвердзіў.

— Выдатна. Прапаную ўдарна папрацаваць і хутчэй скончыць, мне самому не вельмі хочацца сядзець у гэтым клятым лесе да раніцы. Усё, разыйшліся.

Сінхронна чэкісты адчынілі кузавы грузавікоў, па два чалавекі нырнулі ў кожны з іх, яшчэ па адным засталося звонку.

Я затаіўся, баючыся нават варухнуцца. Нечакана мне стала вельмі страшна. Нельга, канечне, сказаць, што дагэтуль я быў абсалютна спакойны, але зараз мяне ахапіў проста панічны страх. Пакуль яшчэ нічога не здарылася, а мяне ўжо фактычна паралізавала гэтым брыдкім і ліпкім пачуццём.

З грузавікоў я пачуў гукі нейкай валтузні. Праз імгненне з першай машыны паказаліся чэкісты, пад рукі яны валаклі чалавека... Толькі ў гэты момант я зразумеў, што мусіць зараз адбыцца. Як пацвярджэнне маіх горшых здагадак, чэкіст, які стаяў каля ямы, падняў рэвальвер...

Грукнуў стрэл. Ён гучна пранёсся па начным лесе. Цела небаракі, нібыта падштурхнутае куляй, само звалілася ў яміну. Канваіры адразу ж падаліся назад, да грузавіка.

Ля суседняй ямы адбывалася тое ж самае. Асуджанага — а ці былі гэтыя людзі асуджанымі? — падвалаклі да выканаўцы, ударылі пад калена...

Стрэл.

Стрэл.

Стрэл.

Я сплю? Божа, які страшны сон!!! Божая маці, анёла панскі, пан Езус, дайце мне прачнуцца!!!

Стрэл.

Стрэл.

Я не прачынаўся.

Мне падавалася што гэтая нечалавечая оргія доўжылася ўжо некалькі гадзінаў, хоць на самой справе прайшло толькі хвілін з сорак. Ямы запоўніліся. Я страціў лік забітым…

І раптам усё скончылася. Стрэлаў і плачу больш не было, толькі размаўлялі паміж сабой чэкісты. Звягінцаў гучна аддаваў загады.

З'явіўся бульдозер. Ён пачаў засыпаць забітых зямлёй з адвалу, потым трамбаваць ямы. Усё гэта адбывалася нерэальна павольна, быццам хтосьці з садысцкай упартасцю не жадаў, каб сёння гэты кашмар скончыўся...

## Ясік

У школу мы пайшлі разам. Дзяцей яшчэ не было.

Раніца прыгожая, сонечная.

У дзверы нечакана пастукалі.

— Заходзьце, — выгукнула Таня.

Я нават не здзівіўся і не спалохаўся, калі ўбачыў Звягінцава. Апошнім часам ён з'яўляўся ў школе занадта часта — няглedзячы на тое, што Валя даўно ведала дарогу і не было аніякай патрэбы яе суправаджаць.

— Добрага ранку, — са сваёй звычайнай халоднай усмешкай павітаўся лейтэнант.

— І вам добрага ранку, — з лёгкай напружанасцю адказала Таня. Я прамаўчаў. Звягінцаў зрабіў выгляд, быццам бы не заўважыў гэтага.

— Я сёння да вас па справе.

Я напружыўся.

— Наколькі ведаю, Максім Віктаравіч, маёр Раманаў размаўляў з вамі ў свой час наконт хлопчыка Яся Самахвалава, сына мясцовага партыйнага кіраўніка.

— Была такая размова. Штосьці здарылася?

— Ды як вам сказаць... пакуль яшчэ нічога не здарылася, але можа здарыцца ў бліжэйшы час. Мне прыйдзецца сёння забраць малога з сабой.

У размову нечакана ўмяшалася Таня:

— Можа, вы ўсё ж скажаце нам, на якой падставе і куды забіраеце хлопчыка?



— Можа быць і скажу, Таццяна Віктараўна, — ён зноўку халодна пасміхнуўся.

У школу паціху падыходзілі дзеці. Яны — сярод іх і Ясік — глядзелі на нас, нічога не разумеючы.

— Ясік, табе прыйдзецца пайсці са мной. На жаль, заняткі ты сёння прапусціш.

Я не вытрымаў. Схапіўшы Звягінцава за руку, пацягнуў яго да выхаду. Лейтэнант рэзка вырваўся, але пайшоў за мной. Грукнулі дзверы, і жонка выйшла за намі.

— Спадар Звягінцаў, я не адпушчу хлопчыка з вамі. Мне патрэбная папера ад таварыша Самахвалава...

Чэкіст расплыўся ў шырокай усмешцы.

— Папера, кажаце? Ну-ну. Дык вось, таварыш Савіцкі, я не хацеў бы нічога тлумачыць, больш таго, я фактычна не маю на гэта права, але калі вы так настойліва гэтага патрабуеце... Таварыша Самахвалава сёння арыштавалі мае калегі па абвінавачванні ў... ды няма ніякай для вас розніцы, у чым яго вінавацяць, гэта вас зусім не датычыцца. Скажу толькі адно: калі вы не жадаеце сабе праблемаў, вы павінны адпусціць хлопчыка са мной.

Таня спахмурнела і раптам злосна зашаптала:

— Вы калечыце сем'і і ломіце лёсы!

— Таня!

— Ідзіце прэч, лейтэнант, хлопчыка мы не адпусцім.

Звягінцаў са злосцю сплюнуў пад ногі.

— Вы здаецца не разумееце, Таццяна Віктараўна, з кім і як размаўляеце.

Рэзкім рухам ён штурхнуў Таню, але яна засталася на месцы.

Я замахнуўся, каб ударыць падонка, але чэкіст дасведчанай рукой перахапіў мой кулак і заламаў руку так, што ў мяне пацямнела ў вачах. Ён каленам стукнуў мне па жываце. Я паваліўся, а неўзабаве за мной – і Таня.

— Паляжыце так троху, можа, зямля мазгоў дасць троху, — лейтэнант зайшоў у школу. Я асцярожна падняўся і дапамог падняцца Тані. Яна ціха плакала. Мы прыхінуліся да сценкі, каб не зваліцца зноўку.

…Лейтэнант забраў Яся. Малы ўпіраўся і плакаў, але Звягінцаў не звяртаў на гэта аніякай увагі.

Больш мы ніколі не бачылі ні Ясіка, ні ягонага бацьку.

## «Кахаю»

Дзверы былі адчыненыя, калі я вярнуўся дадому. Я не здзівіўся — мы зрэдку зачынялі хату. Але штосьці было не так, як звычайна...

— Таня! Таня-я-я-я!

Ты не адгукнулася.

— Та-а-а-а-ня!

Шкло. Бітае шкло пад нагамі. Абрус, скінуты са стала, перагорнутая шафа з кнігамі.

— Паненку забралі, Максім Леанідавіч, — я раптам пачуў асцярожны голас за спіной. За дзвярыма стаяла наша суседка — суханькая бабка, якая заўжды прыносіла нам яйкі і малако. Яна стаяла, прыцісьнуўшы тонкія рукі да грудзей, і вачыма, поўнымі слёз, глядзела на мяне.

— Хто забраў? Куды?

— Тыя самыя, з Камісарыяту, якія да вас прыходзілі некалькі разоў. Іх было чалавек пяць, і Звя… Звягінцаў...

Я ўжо не слухаў, я бег да ўпраўлення НКУС, якое месцілася праз дзве вуліцы ад нашага дома. Людзі спалохана глядзелі мне ўслед, але мне было не да іх. Хутчэй, хутчэй...

У дзверы я ўламаўся не спыняючыся, наўпрост наляцеўшы на іх локцем. Адшукаў дзяжурнага. Мне падалося, што ён не пазнаў мяне, але праз секунду ўжо расплыўся цынічнай пахмылкай.

— А, гэта вы, Максім Леанідавіч! Чым магу быць карысным?

— Звягінцаў! Дзе ён?

— Капітан Звягінцаў, вы маеце на ўвазе?

— Як… капітан?! Мне патрэбны старшы лейтэнант… Звягінцаў.

— Ну, у нашым аддзеле Звягінцаў толькі адзін, і ад учорашняга дня ён капітан, так што, мяркую, вы шукаеце менавіта яго. На жаль, яго няма на месцы, ён з'ехаў па працы.

— Мая жонка, ён сёння арыштаваў маю жонку! Я хачу ведаць, на якой падставе і дзе яна зараз!

— А, Таццяна Віктараўна, калі не памыляюся? Так-так, сёння сапраўды арыштавалі такую. Прашу прабачэння, не магу вам нічога сказаць. Службовая тайна, вы ж разумееце, — і гэтая курва зноўку агаліла свае жоўтыя зубы ў крысінай пасмешцы.

— Дзе яна? Дзе мая жонка?!

— Вашая жонка, шаноўны настаўнік, этапавана па рашэнню пазасудовай тройкі для прыняцця пакарання згодна з артыкулам… Эй! Эй! А ну вярніся!

Я зноўку бег, не спыняючыся ні на секунду, але ўжо не адчуваў шалёнага сэрца. Тройка? Пакаранне? Таня! Танечка!!!

Побач са сваёй хатай я спыніўся. Этапавалі… Канечне, яе адправілі кудысьці адсюль, але з ёй усё будзе добра, яна вернецца, жывая і здаровая. Этапавалі. Ці не ў лес?!

Я застагнаў ад гэтай думкі. Не-е-е! Канечне, не. За што?!

…Лаз, той самы лаз. Хутчэй!

У лесе гучалі стрэлы. Што калі я спазніўся? Што калі яна тут?

Не-е. Яна не тут… яна не тут. Не тут!

Я ўпаў на зямлю, папоўз, як змяя. Канечне ж, яна не тут, але я мушу сам, на свае вочы праверыць гэта, інакш мне ніколі не будзе спакою.

Я спыніўся толькі за дваццаць метраў ад расстрэльнай каманды. Падпаўзці бліжэй было б шаленствам нават для мяне. Мяне й так не заўважылі толькі дзякуючы таму, што чэкісты былі цалкам занятыя выкананнем.

Я адшукаў вачыма Звягінцава. Гэтая курва, як і ў мінулы раз, не прымала ўдзелу ў самім расстрэле, ён толькі аддаваў загады, флегматычна назіраючы за працэсам. Ягоныя рукі пацідалі элегантны нямецкі вальтэр.

Яма была поўная ўжо амаль напалову. Нават са свайго месца я мог бачыць, што сярод расстраляных не было аніводнай жанчыны. У мяне нібыта скала звалілася з плячэй.

Мае вусны лічылі кожнага забітага. Іх колькасць блізілася ўжо да трыццаці. Па ўсім, хутка партыя павінна была скончыцца, яшчэ чалавек пяць, не больш. Божачкі, Божа, яе няма?

— Усё, таварыш капітан, — старэйшы з групы хутка адрапартаваў Звягінцаву. Ён казаў штосьці яшчэ, але я не чуў ягоных слоў. Яе няма тут! Няма! Яна жывая, яна будзе жыць! Будзе жыць, мая мілая, мая каханая!

— Застаўся толькі адзін кліент, — старшы панізіў голас. — Той самы.

Па маіх вушах нібыта молатам грукнулі халодныя словы Звягінцава.

— Вывадзіце.

Цябе нават не вывалаклі — выштурхнулі з машыны. Ты білася, білася, як кацяня, на якое навалілася зграя шалёных сабак!

Маё цела адмаўлялася падпарадкавацца мне. Перад вачыма паплылі чырвоныя плямы. Я сплю! Сплю! Гэтага проста не можа быць. Та-ня!

Капітан павольна падышоў да цябе, паглядзеў зверху ўніз, падняў нагу, нібыта з лянотай піхнуў. Ты пакацілася па бруднай зямлі, прыціскаючы свае маленькія ручкі да жывата. Ты нават не крычала ўжо, толькі ледзьве чутна ўсхліпвала, але я чуў усё.

Звягінцаў зноўку наблізіўся. Ён схапіў цябе за валасы і пацягнуў да ямы.

Раптам ты паглядзела ў мой бок. Вочы, твае самыя прыгожыя ў свеце зялёныя вочы, злавілі мяне пасярод высокай травы і маладых дрэваў і сачылі за мной.

Раптам сілы вярнуліся да майго цела. Я паспрабаваў падняцца на ногі, але твой спужаны погляд зноўку прыкаваў мяне да зямлі. Ён крычаў мне: «Не! Не!»...

— Таццяна Віктараўна, вы ж верыце ў бога? Памаліцеся яму, я дазваляю! У вас роўна паўхвіліны, — ён падняў «вальтэр» і рэзка ўзвёў курок.

Ты не чула яго. Ты не чула ані слова з таго, што ён казаў — ты толькі глядзела на мяне і моўчкі развіталася са мной.

Хлоп!

# НЕ ХАЦЕЎ БЫЦЬ БОГАМ

Твае веі ўздрыгануліся, і я застаўся ў іх на секунду, толькі на секунду, каб застацца там на вечныя стагоддзі.

— Як твой бог, сука? Да сустрэчы ТАМ!

— Кахаю, — прашаптала ты і заплюшчыла вочы.

Палец у скураной пальчатцы пацягнуў курок.

І не было ні болю, ні надзеі. У свеце панавала чорная цішыня.

* * *

Дзень. Ноч. Дзень. Ноч. Дзень? Не, здаецца, ноч.

Ціха. Да звону ў вушах ціха. Ні стрэлаў, ні галасоў, ні спеву птушак… Нічога. Ноч. Толькі ноч бязгучна размаўляла са мной.

Мяккая трава пад пальцамі раптам змянілася халоднай зямлёй. Гэта яшчэ што такое? Зямля? Чаму зямля?

Я падняў галаву і азірнуўся.

Я не крычаў, не. Я толькі плакаў.

Я стаяў на магіле.

На тваёй магіле.

Затым я бег прэч. Сілаў мне даў страх, ён даў мне нават больш, чым магло змясціцца ў маім хворым целе…

Я натыкаўся на дрэвы, я не бачыў іх, біўся аб іх і, не адчуваючы болю і крыві, зноўку бег.

Далёка наперадзе загараўся світанак. Ноч, якая падавалася бясконцай і бязмежнай, блізілася да сканчэння. Я ішоў да сонца, нібы я ішоў да цябе, падаючы і баючыся міргнуць вачыма, нібыта ад гэтага сонца магло знікнуць.

Сонца не знікала. Яно з лянотай цягнула з-за гарызонту свае тонкія промні, і яны абуджалі ўсё на зямлі.

Прачнуўся і загаманіў лес. Зноўку заспявалі птушкі. Недзе далей забрахалі сабакі. Забрахалі сабакі? Забрахалі сабакі!!

Брэх гучаў дзесьці наперадзе, метраў у двухстах ад мяне. Што за?..

Я занадта позна зразумеў, што іду па ветру. Калі ў мінулыя разы я ішоў убок ад брамы супраць ветру, сабакі не адчувалі чужога паху. Зараз жа…

Нечакана я ўбачыў лаз. Убачыў нібыта ў тумане — зрок адмаўляўся мне падпарадкоўвацца, ногі таксама, але я ўсё роўна ішоў нібыта ў сне туды, дзе чарнела прагаліна на месцы праламаных дошак.

Стрэлу я нават і не пачуў. Куля раструшчыла дрэва на ўзроўні галавы справа ад мяне. Да лазу заставалася яшчэ нейкіх метраў пяць, калі я пачуў крыкі вартаўнікоў.

На бліжэйшым кусце яшчэ адна куля зрэзала галінку… Я кінуўся на зямлю і папоўз на жываце да ратавальнага лазу.

Брэх сабак зноўку нагнаў мяне каля хаты дзеда Юрася. Пагоня дакацілася да вёскі, і зараз пачыналі абшукваць хаты.

— Што за… — Стары пачаў было сварыцца з-за таго, што яго паднялі на досвітку, але на паўслове яго скарга абарвалася. — Максім? Што з табой? Што здарылася? Дзе Таня?

— Tania nie zyje!!!

— Co… O co ty, kurwa, mowisz?! Што ты нясеш?!

Я не адказаў. Я проста пераваліўся за парог і ўпаў на падлогу.

— Хто? Хто забіў?! Хто забіў яе?!

Я адказаў адным толькі словам.

— Звягінцаў.

Стары закрычаў. Ён крычаў у ранішнюю неба, ён слаў праклёны гэтаму небу, сонцу, Звягінцаву і ўсяму свету.

З боку расстрэльнага лесу ў вёску ўварваліся чатыры чорныя варанкі. Хату абкружылі.

Стары зачыніў дзверы на замок, схапіў лом і адарваў ад падлогі чатыры дошкі. Пад імі была неглыбокая яма, у якой ляжала штосьці доўгае, загорнутае ў тканіну. Пад тканінай я ўбачыў тры вінтоўкі.

Цішыня стаяла з хвіліну. Потым на двары мы пачулі хуткія і ўпэўненыя крокі.

— Ад імя савецкай улады я загадваю вам адчыніць дзверы і даць супрацоўнікам Камісарыята арыштаваць злачынцу, — добра знаёмы голас адразу прабраў марозам да самых касцей.

— Тваё імя! — прагрымеў голас Старога.

— Я паўтараю…

— Тваё, курва, імя!!!

— Капітан Камісарыята ўнутраных спраў Звягінцаў.

Гэтага было дастаткова. Дзед выбіў ствалом вінтоўкі шкло ў вакне і стрэліў.

— Па вокнах плі!

Я нават не паспеў націснуць на курок, як рэзкі боль адкінуў мяне ад вакна. Пляцо было прастрэлена, з яго біла кроў. Было балюча і прыкра ад таго, што ўсё заканчвалася ТАК.

Дзед Юрась высунуўся ў акно, каб адшукаць Звягінцава, і раптам схапіўся за грудзі ды апляў на падлогу.

— Вось… і ўсё, сынку… — ён расцягнуў вусны ў змучанай усмешцы. — Я б… хацеў быць… богам… каб іх… — ён зайшоўся ў кашлі, на вуснах з'явілася кроў. — Іх… на нашае месца…

### Спадчына ад'ютанта генерала

Дні ў раённым аддзяленні Камісарыята нічым не адрозніваліся ад начэй. Тут заўжды было цёмна, пахла сырасцю, крывёй і дымам. А яшчэ тут былі пацукі. Шмат пацукоў — цэлае пацучынае войска маршыравала па падлозе падземных камераў. Пацукі не нападалі на жывых вязняў — яны былі сытыя, бо заўжды маглі пачаставацца тымі, каму было ўжо ўсё роўна.

Допыты цягнуліся бясконца, адзін за адным. Змяняліся следчыя, змяняліся ахоўнікі. Нязменным было толькі пачуццё поўнай пустэчы. Так, я не адчуваў абсалютна нічога: ні болю, ні страху, ні жалю. Мяне білі, а я не заўважаў гэтага. Часам мне падавалася, што я памёр, і мая душа аднекуль зверху назірае за тым, як нястомныя каты чамусьці працягваюць здзекавацца над мёртвым целам.

Я згубіў лік часу. Для мяне было абсалютнай тайнай, колькі я быў тут ужо — дзень, месяц, год, альбо стагоддзе.

Памятаю, калі я ўпершыню абудзіўся тут, я папрасіў следчага — маладога хлопца маіх гадоў з абыякавым выразам на твары — паклікаць маёра Раманава. Той падняў галаву ад сваіх папераў і крыху здзіўлена запытаўся:

— Раманава? Маёр Раманаў выбыў ужо два тыдні таму.

— Выбыў? Што гэта значыць?

— Выбыў зняты з пасады і расстраляны…

Увесь час мне задавалі нейкія пытанні, сэнсу якіх я не мог зразумець. Здаецца, мяне вінавацілі ў злачынствах супраць Саветаў, шпіянажы...

Я не чакаў смерці як вызвалення. Я нічога не чакаў, як нічога не адчуваў. Бог быў там, наверсе, і ён назіраў за ўсім, што са мной адбывалася. Я не хацеў быць богам. Я б не змог быць такім бессардэчным, якім павінны быць Бог.

Праз тыдзень — ці тысячагоддзе? — мяне ў чарговы раз вывалаклі з камеры, каб адвесці на допыт. Кабінет следчага, у якім я ведаў кожны міліметр падлогі, у якім на кожнай сцяне былі сляды маёй крыві, быў незачынены. За сталом сядзеў хтосьці, каго я яшчэ ні разу не бачыў на сваіх допытах. Гэты чалавек, апусціўшы галаву, чытаў нейкія дакументы, якія ляжалі перад ім.

Канваіры пасадзілі мяне на жорсткі стул, старшы з іх адрапартаваў:

— Савіцкага прывялі, таварыш капітан.

Ах вось яно што! Чарговы следчы быў нікім іншым, як самім Звягінцавым. Прывітанне, курва, даўно не бачыліся!

Забойца падняў галаву і з усмешкай паглядзеў на мяне.

— Ну як вашыя справы, Максім Леанідавіч? Чуў, што вы ніяк не жадаеце праявіць разуменне і пасупрацоўнічаць са следствам. Гэта нявветліва з вашага боку! Бачыце, нават мяне ад працы адарвалі, каб з вамі паразмаўляў… Мне тут казалі, што ты, сука, нібыта, не баішся болю і біць цябе не мае аніякага сэнсу. Можа быць, я не буду правяраць, мне ўсё роўна. Хачу, каб ты разумеў — у мяне вельмі мала часу, сам ведаеш, палігон чакае, — ён зноўку ўсміхнуўся. — З гэтай нагоды я не буду расцягваць бясспрэчную радасць ад размовы з табой, ты падпішаш пратакол, які павінны быў падпісаць яшчэ тыдзень таму, і мы з табой назаўжды развітаемся. Як табе такі варыянт?

— Паршыва. Твае, капітан, выблядкі за тыдзень так і не змаглі мне растлумачыць сутнасць усіх абвінавачванняў. — Я закашляўся.

Капітан схапіў мяне за валасы і прыпячатаў галавой да сталешніцы. На шэрым метале расплылася цёмна-чырвоная пляма.

Звягінцаў схапіў са стала дакументы, якія ён вывучаў да майго з'яўлення, і падсунуў мне пад нос:

— Распавяду табе адну цікавую гісторыю. Наколькі я ведаю, ты ўсюды казаў, што не ведаеш свайго бацьку, табе пра яго ніколі не распавядалі і сам ён памёр яшчэ да тваёго нараджэння. Гэтым казкам верылі, праверыць усё роўна не было аніякай магчымасці. А некалькі месяцаў таму я ўздельнічаў у арышце аднаго старога, якога вінавацілі ва ўзброенай барацьбе супраць савецкай улады. У ягонай хаце мы знайшлі досыць цікавыя дакументы і фотаздымкі. Паглядзі сюды, — і ён ткнуў пальцам у нейкую паперу.

Я прагледзеў дакумент. Наколькі зразумеў, гэта было штосьці накшталт узнагароднага ліста. Дзясятым у спісе стаяла прозвішча… Савіцкага Леаніда Мікалаевіча!

— Той дзед быў асабістым ад'ютантам вядомай гніды, якую ягоныя шаўкі звалі генералам Булак-Балаховічам!.. — капітан гагатнуў. — Цэлы шэраг дакументаў гэтага злачынца захаваўся ў схроне, які дзед зладзіў наўпрост у сваёй хаце. А зараз глянь сюды, — і Звягінцаў падштурхнуў да мяне жоўты фотаздымак. На ім я ўбачыў шмат людзей у вайсковай форме, якія абкружылі маладога мужчыну з чорнымі вусамі, георгіеўскім крыжом і яшчэ нейкімі ўзнагародамі, якія я не пазнаў. Звягінцаў ткнуў пальцам у самы кут фотаздымка, на аднаго з вайскоўцаў, які стаяў асобна. — Паглядзі! Не пазнаеш?

Я пазнаваў. З фотаздымка на мяне глядзеў… нібыта я сам!

…Перада мной ляжалі паперы, якія я мусіў падпісаць. Я адсунуў пратакол.

— Ну і як гэта разумець? — спакойна спытаў капітан.

— Падавішся ты, сука. Колькі б ты мяне не біў, колькі б не ламаў касцей і не зрываў скуры з мяса, я нічога не падпішу. Якая мне розніца, калі ты ўсё роўна загадаеш расстраляць мяне. Можа быць там, наверсе, я зноўку буду з маёй Тацццянкай? Хто ведае, можа быць, мы вернемся на зямлю, вернемся, каб адпомсціць табе і такім. Даставай свой вальтэр, забі мяне, як забіў яе.

Звягінцаў сапраўды дастаў вальтэр. Але ён не стаў страляць. Ён толькі размахнуўся і ўдарыў мяне па галаве. Я праваліўся ў цемру…

А калі праз дзве гадзіны адкрыў вочы, капітан сядзеў насупраць і з нязменнай усмешкай разглядаў паперы, якія я адмовіўся падпісаць.

— Добрай раніцы, Максім Леанідавіч! Паглядзі сюды, — і ён зноў сунуў мне пратакол. Я не верыў сваім вачам: мой подпіс стаяў пад дакументам. — Цікава, праўда? Ну вось што перашкаджала мне адразу самому паставіць за цябе твой подпіс? Узор у мяне быў, а разбірацца ніхто не будзе, гэта я гарантую. Мог бы не марнаваць некалькі гадзінаў, — ён зарагатаў. — Ты ведаеш, я ж хацеў табе аказаць адну паслугу. Калі б ты падпісаў паперу сам, ты б сапраўды атрымаў па-хуценькаму кулю ў патыліцу. Хто ведае, а раптам ТАМ, ты б сапраўды сустрэў сваю суку, а? — Ён зноўку зайшоўся рогатам. — А так… ты не пажадаў супрацоўнічаць, гэта заўжды караецца вельмі жорстка. Шмат хто лічыць, што самае страшнае пакаранне, якое можа прызначыць Камісарыят, гэта расстрэл. Глупства.

У мяне тут ёсць два аркушы. На іх два варыянты прысудаў для цябе. Абодва яны могуць быць правамоцнымі пасля таго, як я пастаўлю свой подпіс. Такім чынам… — ён выцягнуў адзін аркуш. — Першы прысуд: «Савіцкаму Максіму Леанідавічу прызначыць пакаранне ў выглядзе расстрэлу». Другі прысуд…так, так, а вось, тое што трэба: «…прызначыць пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення ў сістэме папраўчых лагераў Савецкага Саюза, без права амністыі, без права ліставання, без права…». Тут яшчэ шмат без якога права, прасцей для цябе будзе зразумець, што ад гэтага моманту ў цябе няма права ні на што абсалютна. Такім чынам, што ж мне абраць… — Ён тэатралізавана задумаўся. — Думаю, што такога лёгкага пакарання, як расстрэл, ты не заслужыў, — ён парваў першы аркуш. Пад другім жа паставіў подпіс і адклаў яго ў планшэт.

— Сука… Сука!!! — Я не мог стрымаць сябе.

— Падабаецца? Што ж, цябе чакае жыццё, поўнае ўспамінаў пра тваю жонку і яе цудоўныя вочкі. У цябе будзе шмат часу, каб падумаць над сваімі памылкамі. Доўгіх гадоў жыцця вам, Максім Леанідавіч! Канвойны!

Мяне падхапілі пад рукі і пацягнулі.

Халодная падлога камеры прыняла мяне пахам магілы.

— О, мая каханая Танечка, — прашаптаў я. — Я буду з табой! Абавязкова буду! Буду…

### Эпілог

Вагон быў халодны і сыры. Як і ў камеры, тут было шмат пацукоў. Але ў адрозненне ад тых, турэмных, гэтыя былі галоднымі...

Нам не казалі, куды рухаецца этап. Мы не павінны былі гэтага ведаць. Адгэтуль мы не павінны былі ведаць нічога. Мы былі нікім, і імя нам было ніхто. Адзінае, што мы ведалі — мы больш не людзі. Нам нельга было размаўляць, нельга было скардзіцца, нельга прасіць.

У вагоне нас такіх было чалавек семдзесят. Як шапнуў адзін з вязняў, нам яшчэ пашанцавала: чэкісты перавозілі ў такіх вагонах і па дзвесце чалавек.

Але мне было ўсё роўна. Для мяне навокал не было больш нікога — толькі душы пакутнікаў, яшчэ не мёртвых, але ўжо й не жывых.

А яшчэ са мной побач былі мае анёлы. Ты, мая мілая, і дзед Юрась. Вы кожны вечар былі са мной, вы шапталі мне ласкавыя словы, вы суцяшалі мяне. Толькі вы былі рэальнымі, усё ж астатняе, што я бачыў навокал: сцены вагона, канвойных, вязняў — яны былі прывіднымі, ілюзорнымі, ненатуральнымі. Я нібыта бачыў гэта ўсё ў сне і, як і ў сне, спакойна назіраў, нібыта ведаючы, што сон рана ці позна скончыцца, што я расплюшчу вочы, а навокал мне будуць зычыць добрай раніцы мае родныя, мае дарагія, мае светлыя. І хоць сон будзе доўжыцца шмат страшных гадоў, я не хваляваўся.

Усё ж такі Звягінцаў не перамог. Ён хацеў, каб я пражыў доўгае жыццё, поўнае пакутлівай рэальнасці і балючых успамінаў. Ён пралічыўся толькі ў адным: больш не было жыцця. Было існаванне, быў толькі сон, а без жыцця пакуты не маюць аніякага сэнсу — іх нельга адчуваць. І я ўсміхаўся начамі, калі мяне ніхто не бачыў, усміхаўся ад адной гэтай думкі — што хоць у чымсьці я перамог д'ябла.

Я бачыў наперадзе доўгія дзесяцігоддзі, бачыў гэтак жа ясна, нібыта ўжо пражыў іх і ведаў, што чакае маю краіну. Я не баяўся нічога. Я толькі чакаў.

Ты зноўку была са мной, твая душа не пакідала мяне ні на хвіліну. Нават уначы ты глядзела сваімі цудоўнымі вачыма на мяне, і мне больш не было патрэбна нічога, каб дыхаць далей.

Ты толькі чакай, толькі вер, мілая мая, каханая Танечка. Хутка мы будзем разам. Я абяцаю.

АПАВЯДАННЕ

# ПЛЫВЕЦ

Алесь ТАРАНОВІЧ



Што гэта было за лета!

Чэрвень прынёс тры падзеі.

Спякоту, ад якой плавіўся асфальт, гурбы тапалевага пуху і чэмпіянат свету па футболе…

Мужчынская частка Нямеччыны, якая пакутуе на душэўную пустэчу, перастала прачэсваць галёркі фотапамыяў у Сеціве, злезла з порнасайтаў, села на стадыёны і да экранаў тэлевізараў.

Берлін, які нагадвае расхінутую ракавіну, прымаў плыні турыстаў, нібы тут чакалася бітва народаў.

Што гэта было за лета!

Градуснік прымусіў людзей зняць нават саколкі.

Ён пагрузіў іх у расол гарачага марыва з сонца, пуху, колераў і сцягоў. Рэкі сцягоў, моры, акіяны. Турэцкія і арабскія дзеці размахвалі самаробнымі, размаляванымі ад рукі нямецкімі сцяжкамі. Нават «шызік» Вілі, які сядзеў пры любым надвор'і на раздарожжы ў Prinzenstrasse ў шлеме на трохколавым ровары — і той трымаў сцяжок…

Бумерангам скакалі пачуцці. Вакол Olimpia Stadion круціліся завеі тапалевага пуху, пакідаючы пад сценамі гурбы. Сам стадыён знемагаў пад прэсам гарачага і шчыльнага, як шкло, паветра…

Усе «хварэлі» за немцаў.

І немцы выйгравалі, выйгравалі, выйгравалі…

Падчас гэтых перамог буянства моладзі на Fannmiele не мела мяжы. У горадзе ішла такая страляніна, нібы рускія ў чацвёрты раз намерваліся ўзяць Берлін. У газетах круціліся фантасмагорыі пад назовам «Weltmanschaft»...

Што гэта было за лета!

З вуграмі і судакамі была нейкая невязуха.

Раніцай, калі сонца высоўвалася з-за платанаў, я ішоў правяраць пакінутыя на ноч донныя вуды. Рака парыла, зберагаючы ў сабе астанкі перапуджанай паліцэйскай сірэнай цішыні. Штораз я браўся з трапятаннем за лёску, каб адчуць пругкія штуршкі рыбы, і штораз атрымоўваў расчараванне. У лепшым выпадку прынада або была сарваная, або былі абарваныя павадкі. Я ставіў таўсцейшыя лёскі, і іх абрываў невядомы супернік. Заставалася слухаць плёскат рыбы, карміць пражэрлівых качак і лебедзяў ды назіраць, як пяшчота струменіцца скрозь празрыстыя кроны дрэў.

У той дзень неба брала самую высокую сінюю ноту…

Раптам маю ўвагу прыцягнуў дзіўны плывец у басейне.

Ён плыў павольна, але ўпарта. Грэб толькі адной рукой, не, грэб і другой, але гэта была …кукса. Ён плыў на спіне. Зваротна — на жываце. Неверагодна!

Я стаў назіраць за ім… Вось ён сыйшоў з дыстанцыі, узлез на лесвіцу і, упэўнена варочаючы рукой, выйшаў на бераг. Быў ён немаладым чалавекам, карчакаватым і дужым, як дуб.

Надзеўшы халат, ён сеў на складное крэсла.

Задумаўся.

Я перамясціўся бліжэй.

Халат яго расхінуўся, агаліўшы магутныя пліты грудных цягліцаў, спіна была дужай, як драўляная калода. Старэчыя плямы на паліраваным чэрапе, месцамі праступаў вожык серабрыстых валасоў. Просты, няхітры, адкрыты твар, — ён быў пазбаўлены мімікі.

Нашыя вочы сустрэліся…

— Хто ты?

— Хачу ведаць пра тваё мінулае.

— Навошта табе гэта? Ты жадаеш прачысціць аўгіевы стайні маёй памяці? Я замкнуў свае ўспаміны на ключ. Я выкінуўся з уласнай памяці, як наркаман з акна…

З басейна выйшла німфа.

Іканапіснае аблічча спелай і ўпэўненай у сабе прыгажосці. Звыклым рухам зняла гумовую шапачку. Плаўную завершанасць яе фігуры дапоўніў лівень залатых валасоў. Яе суседка, дама з плоскаступнёвасцю і плоскагруддзем, ускінула зайздросны погляд…

— Прыгожым жанчынам не на карысць усведамленне ўласнай прыгажосці. Яно накладвае на твар нейкі невынішчальна-пахабны адбітак самаўлюбёнасці.

Ён завесіў шэры смутак усмешкай:

— Ты хочаш ведаць, ці быў я на вайне і дзе страціў руку?..

— Мне было пятнаццаць.

Мы мылі твары ў мігатлівых маладых днях, як у жывой вадзе. Нас атачала рамантычная завіруха слоў, і мы рваліся служыць вялікай Нямеччыне.

Фашызм быў для нас марай аб ідэальным свеце. Мы рыхтаваліся абараняць гэты наш свет, развівалі свае цела і дух, каб стаць падобнымі да герояў. Гераічнасць складалася ў адрачэнні ад сябе ў імя веры і праўды…

Ён паганяў жаўлакі на скулах.

— Гітлер перанёс статую Перамогі ад Рэйхстага ў Тыргартэн, і мы не зазначылі, што Нямеччына стала шалёна круціцца вакол яе, як цыркулярная піла. Вайна пазбаўляе ад неабходнасці думаць. Калі ён гаварыў: «Мне не патрэбныя вашыя розумы і сэрцы, мне патрэбная вашая маладосць» — мы былі ў захапленні…

Мы не паспелі прачнуцца ад выдатнага сну дзяцінства, як нас прапусціла скрозь сябе горкая ісціна. У руках была зброя, а загад пазбаўляў ад неабходнасці думаць… Ахоўная грамата дзяцінства парвалася... Прыйшоў 45-ы год. Мяне заклікалі ў «гітлерюгенд».

Апавядальнік замоўк.

Я паглядзеў яму ў твар, ён быў як студня без дна.

— Бітва за Берлін пашыралася. Гром «сталінскіх арганаў» ператвараўся ў аркестр. Бездань бушавала над горадам. Ішоў шосты год вайны, шосты год бамбаванняў… Берлінцы сталі ценямі, якія слізгаюць па вузкім карнізе жыцця. Яны, як статысты, прысутнічалі на карнавале заблытаных лёсаў, пакінутай Богам краіны.

Страх смерці ўвайшоў ва ўжытак, да яго прывыклі. Памерці было лёгка, цяжка застацца жыць.

Проза жыцця загнала паэзію ў вугал і намотвала яе кішкі на кулак. Мне падавалася: усе разумеюць, што адбываецца, акрамя мяне. Мая душа была маленькай і цеснай, у ёй не магло размясціцца ніякае чалавечае пачуццё, у сярэдзіне быў туман, знадворку туман, на зубах — тоўчанае шкло…

Ён перайшоў на жэстыкуляцыю, плаўную і размашыстую, як у святара. Яго прамова стала падавацца гульнёй гукаў, якія імкнуцца выцесніць з сябе небяспечную музыку.

Мы, хлопцы з «гітлерюгенд», не хацелі паміраць. Але эсэсаўцы з розных краінаў, а тут былі французы, галандцы, датчане, нарвежцы, латышы і эстонцы, сабраліся тут, каб сустрэць сваю смерць. Рускія атакавалі, мы ішлі ў контратакі. Птушкі пераймалі свіст куль, а кулі — спевы птушак...

Мы ішлі пад дажджом з серы, агню і сталі. Ішлі паблізу трамвайных рэльсаў, выгнутых, як хвалі бушуючага мора, паблізу стогадовых, зрэзаных снарадамі ліпаў.

Мы ведалі аб паразе. Мы прымалі паразу, але мы шукалі надзею, як шукаюць яе шахцёры ў заваленай шахце.

Хвіліны, гадзіны, дні цяклі ў нікуды. Насамрэч яны зрываліся ў прорву. Я адчуваў, што ў паветры ідзе буйнае пасяванне катастрофы…

У той дзень агонь рускіх быў асабліва моцны.

Разрывы іх снарадаў скалыналі ўсё вакол. Я намацаў у кішэні медальён, які дала мне маці. Я захоўваў яго, як талісман, верыў, што ён абароніць мяне. Нервы былі напружаны.

Раптоўны выбліск, грукат… што гэта? Не стала чуваць залпаў, выбухаў, крыкаў. Запанавала цішыня…

Хтосьці стаіць як у тумане, зіхаціць белым…

Спроба ўстаць ні да чаго не прывяла, відаць, кантузія… вушы быццам заткнутыя чымсьці. Свет стаў бязгучны… І раптам я ўбачыў маці, старэйшую сястру — яны стаялі трохі наводдаль, працягвалі да мяне рукі, нібы спрабавалі выцягнуць з-пад абломкаў…

Позна, занадта позна…

Я адчуваў сябе мураўём, прыціснутым небам. Рот забіты зямлёй, агнём пячэ руку.

Можа, я сплю, і гэта кашмарны сон? Можа, мяне катуюць распаленым жалезам? Бо толькі ў сне так бывае — хочаш паварушыцца, і не можаш. Адчуваеш, што дзесьці побач ёсць людзі, але нікога не турбуе твой лёс. Як страшна быць сляпым, глухім і нямым адначасова!

Раптам цемру прарэзала святло, данёсся глухі гук. Ад яркага святла забалелі вочы. Хацелася стукнуць кулаком па тонкай перагародцы, якая аддзяляе яву ад небыцця, цемру ад святла. Але цела заставалася свінцовым. Я бачыў сябе збоку, бачыў усе свае 5300 дзён жыцця, яны яшчэ дыхалі, ляжучы пад абломкамі… Падумаў, што зараз гэтае жыццё скончыцца. На каго я пакіну маці і сястру, наш сад з вавёркамі і трусамі, музыку Ліста і гэтае зорнае неба?..

— Гэта твой апошні бой, Вольфі!

Абвалілася разам мітусня. Увесь гэты бурлівы, шумлівы, пульсуючы свет знік. Застаўся толькі чалавек у белым, твара не было відаць.

— Хто ты? Анёл? Дэман? Хто ж?

Я не чуў свайго голаса.

— Хто б ні выйграў гэты бой, ты яго прайграеш!

Гэта быў не голас. Гэта было гулкае рэха, фанетычны каркас слоў, усярэдзіне якіх плавала літара духу.

— Але чаму? Бо я нікога не забіваў. Я не парушаў дзесяць запаведзяў! Я ведаў, што сёстры Вагнер хаваюць на сваім лецішчы ў Нойкельне падлетка-габрэя, але я не выдаў іх. Калі оберлейтэнант Зільбер загадаў расстраляць старога Фрыца Цандэра з фольксштурма, я заступіўся за яго, сказаўшы, што ў таго чацвёра дзяцей.

— Але Зільбер усё роўна расстраляў яго.

— А што я яшчэ мог зрабіць?

— Усе салдаты забойцы, хіба ты не ведаеш аб гэтым?

Святло пачало цьмянець, я ўбачыў спіну, якая аддаляецца. Фармулёўка апошняй фразы была мне знаёмая. Хто гэта сказаў? Фігура мімікрывала, ператвараючыся то ў салдата, то ў афіцэра, то ў санітара…

Голас апавядальніка змоўк.

Ветрык мякка ткнуўся ў нашыя спіны, кроны дрэў адлюстроўваліся ў небе, лісце іх было лёгкім, як срэбныя Эльфы. Дзяўчынкі-купальшчыцы слізгалі ў гнуткіх струменях гарачага захаду. Сінія цені леглі на кусты і сталі сачыць за сонцам, выцягваючы доўгія насы…

Фашызм быў для нас марай аб ідэальным свеце. Мы рыхтаваліся абараняць гэты наш свет, развівалі свае цела і дух, каб стаць падобнымі да герояў

Мой суразмоўца сыйшоў у сябе, забыўшы на крэсле застылае цела і непатрэбны твар, падобны на спусцелую вітрыну. Жыццё, якое стаілася дзесьці ўнутры, нічым не выдавала сваёй прысутнасці. Раптам я пачуў:

— Цяжка быць анёлам у пекле… Я жадаю вярнуцца туды. У той час. Маё сапраўднае жыццё засталося там, дзе мяне забілі. Я так і не змог па-сапраўднаму прыстасавацца да новага жыцця. Дагэтуль выразна бачу начныя чэргі ў пякарнях, чую бухаючыя галасы зянітак… Я нібы адкрыў скрыню Пандоры, шукаю, на што вымяняць хоць бы адну хвіліну мінулага. Я змог бы многае змяніць у сваім жыцці.

Жыццё чалавека як раман.

Яго сюжэтны ход не ўзнікае ніадкуль, ён падрыхтоўваецца тысячамі папярэдніх дробязяў. Я бачыў канец ганебнага пакалення, нашая краіна развалілася, таму што была толькі падробкай пад краіну.

Але я шукаю прычыны няўдачаў у сабе. Апраўданне — доля няўдачнікаў, самакапанне заводзіць у багну.

Тады мы разумелі, што ў нашым жыцці адбылася катастрофа. Гэта мы адчувалі. Але не разумелі, не маглі зразумець, што гэта не толькі нашая бяда. Гэта будзе бядой нашых дзяцей і ўнукаў. Яны таксама будуць апраўдвацца…

Пасля паўзы ён прадоўжыў:

— Усё ў жыцці чалавека залежыць ад выпадку. Толькі смерць ніколі не бывае выпадковай. Таксама як і нараджэнне. Усё астатняе — кароткая адлегласць паміж імі. Я выпіў сваё жыццё, але не стаў мудрэй. Гады змяняюць свае нумары з кулямётнай хуткасцю. Прыйшла восень жыцця. Сыходзяць у нябыт сябры і сваякі, іх галасы з кожным годам становяцца цішэй. Я бачыў, як яны плакалі, назіраючы, як змяняецца іх твар і цела. Я не плакаў ніколі, нават тады, пасля аперацыі, убачыўшы, што рукі ў мяне няма…

Ён зноў замоўк.

Я падняў галаву. Празрыстае кола дня круцілася ўсё павольней скрозь бяздонны ўльтрамарын, ліпы ўжо рыхтаваліся да сваіх духмяных метамарфозаў. Іх кроны распавядалі ветру ўсё, што ім прыснілася за доўгае стагоддзе. Сонца сыходзіла, каб зліцца з цішынёй на зыходзе дня…

— Ты ведаеш, што такое гукі цішыні? Цяпер цішыня іншая, а тады яна падавалася цудам. Я аддаў бы ўсё, каб пачуць тую цішыню. Мы не паспелі і не маглі да яе правыкнуць. Падавалася, што хтосьці стаіўся побач, каб зноў стралянінай, выбухамі і смерцю развеяць і растаптаць асалоду цішыні, адняць гэтую апошнюю надзею… Потым пачаўся зваротны адлік часу. Кожная хвіліна, кожная гадзіна і дзень былі як алмазныя кроплі, якія падаюць травеньскай раніцай…

Я ніколі больш не адчуваў такое. Я хадзіў у лес і слухаў яго зялёны шум гадзінамі. Я не ведаў, што ішоў найкароткім шляхам да Бога. Але па пераламанай лініі. Вайна дапамагла мне знайсці сябе.

Я — пастар. Я самотны.

Але я цалкам асвоіўся ўнутры сваёй адзіноты. Я служу людзям… А цяпер — бывай! — І ён працягнуў мне руку. Поціск быў цяжкім, як у камандора.

Затым ён дадаў:

— Кожны чалавек рана або позна пройдзе тэст на выпрабаванне… стане Іовам…

І раптам:

— Ці зразумеў ты, што я табе... толькі прысніўся?..

Так, я зразумеў.

Толькі зараз зразумеў, чаму ягоная прамова так нагадвала маю...

Што гэта было за лета!

Але і яно скончылася.

Немцы ўсё такі прайгралі.

Мы са Стасам злавілі такіх судакоў, што ледзьве змаглі іх данесці да хаты…

Памяць схавала ўсё лішняе з гэтага лета, але ў ім застаўся чалавек, які плыў, рассякаючы мутную тоўшчу часу…

УРОК

# РАДЗІВІЛЫ

Уладзімір АРЛОЎ

**Найбольш багатыя і магутныя роды ў Вялікім Княстве называліся магнатамі. Гэта была нашая арыстакратыя. Вельмі часта жыццё дзяржавы залежала ад яе нават больш, чым ад вялікага князя і караля. Шмат хто з магнатаў меў княжскія або графскія тытулы: Сапегі, Гальшанскія, Хадкевічы, Астрожскія, Слуцкія, Друцкія, Тышкевічы, Алелькавічы, Гаштольды.**

Да самай багатай і ўплывовай арыстакратыі не толькі ў нашай краіне, а і ўва ўсёй Еўропе належаў ліцвінскі род князёў Радзівілаў. Траплялiся сярод іх людзі хцівыя і жорсткія, але больш было іншых. Радзівілы далі шмат выдатных палітыкаў, палкаводцаў, дзеячоў культуры.

## Карані роду

Пачынальнікам роду стаў Радзівіл Осцікавіч, старэйшы сын баярына Осціка.

Осцік паходзіў з-пад Вільні і быў хаўруснікам гаспадара Вітаўта ў змаганні за незалежнасць Вялікага Княства. Осцікаў подпіс стаіць пад Тарунскай мірнай дамовай, у якой тэўтонцы прызналі сваю паразу пад Грунвальдам.

Вітаўту паспеў паслужыць і Радзівіл Осцікавіч. Ён займаў пасаду гаспадарскага маршалка, гэта значыць, кіраваў вялікакняжскім дваром. Пазней першы з роду Радзівілаў здабыў сабе славу як таленавіты пасол і ваявода. Ён адваяваў у маскоўцаў і вярнуў у склад Вялікага Княства гарады Бранск, Старадуб, Ноўгарад-Северскі і Пуціўль.

За службу дзяржаве вялікія князі шчодра адорвалі Радзівіла і ягоных нашчадкаў. У XVI—XVII стагоддзях яны валодалі некалькімі сотнямі гарадоў і мястэчак і 10 тысячамі вёсак. Радзівілы гаспадарылі ў Нясвіжы, Слуцку, Клецку, Міры, Койданаве, Шчучыне, Копысі, Капылі, Любчы... Род меў уласныя збройныя сілы, а ў агульнадзяржаўнае войска пасылаў 1000 коннікаў і больш за 1500 пяхотнікаў.

Сталіцаю Радзівілаў некалькі стагоддзяў лічыўся горад Нясвіж, які часам называлі «маленькім Парыжам».

Магутнасць гэтага роду засведчыла тагачасная прымаўка: «Кароль у Варшаве, а Радзівіл у Нясвіжы». Кажучы іншымі словамі, Радзівілы былі для дзяржавы не менш важныя за каралёў.

## Літоўскі Геркулес

Праўнук першага з Радзівілаў, князь Юрай застаўся ў гісторыі як абаронца Айчыны ад захопнікаў з усходу і поўдня. Ён перамог маскоўцаў і татараў у трыццаці бітвах. Сучаснікі так і называлі яго — Віктар (Victor), што ў перакладзе з лацінскай мовы азначае «пераможца».

У 1511 годзе ён разам са слуцкім князем Юр'ем уначы напаў на лагер татарскіх наезнікаў і разбіў вялікі варожы загон. Нашыя ваяры вызвалілі тады тысячы палонных. Праз год разам з Канстанцінам Астрожскім Юрай Радзівіл атрымаў перамогу над стэпавікамі пад Вішняўцом.

Надзейным памочнікам гетмана Астрожскага Юрай быў і ў славутай Аршанскай бітве. Там князь Радзівіл камандаваў ліцвінскай конніцай на левым крыле нашага войска. Спачатку ён адбіў атаку маскоўцаў, а потым пагнаў ворага прэч. З узнятым над галавой мячом князь, як быццам не кранаючыся зямлі, ляцеў наперадзе сваіх вершнікаў, і маскоўцы ў жаху кідаліся ў Дняпро альбо прасілі літасці.

Пазней Юрай спыніў пад Крэвам паход маскоўскага войска на Вільню. Тады ж ён дапамог палякам у вайне з Тэўтонскім Ордэнам. Рыцарскі аддзел князя Радзівіла ўзяў Брандэнбург і яшчэ пяць варожых замкаў. Не вытрымаўшы такога напору, крыжакі папрасілі міру.

Пасля скону гетмана Астрожскага Юраю Радзівілу перадалі вялікагетманскую булаву. З новым правадыром беларускае войска вызваліла ад маскоўскіх захопнікаў Гомельскую і Старадубскую зямлю.

Вы, напэўна, ведаеце пра старажытнага героя Геракла, якога называлі таксама Геркулесам. Ён вылучаўся незвычайнай сілаю і здзейсніў дванаццаць славутых подзвігаў. Юрая Радзівіла часта параўноўвалі з гэтым героем і далі яму ганаровае імя «Літоўскі Геркулес».

Не будзем забывацца, што Літвой тады звалася ўсё Вялікае Княства і ягоная галоўная частка — Беларусь.

У Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску вы можаце ўбачыць вялікі партрэт Літоўскага Геркулеса ў поўным рыцарскім узбраенні.

Дачка Юрая Радзівіла Барбара стала жонкаю вялікага князя Жыгімонта Аўгуста, а сын Мікалай, названы Рудым, як і бацька, увайшоў у гісторыю выдатным ваяводам.

## Гетман Мікалай Руды



Мікалай Радзівіл Руды

Мянушку Руды яму далі за рыжыя валасы. Існавала прыкмета, што людзі з такімі валасамі часцей за іншых робяцца знакамітымі.

Мікалай хутка пацвердзіў гэта. Ягоныя вялікі розум і кемлівасць сваякі ўбачылі яшчэ ў дзяцінстве.

Хлопец вучыўся ў бацькоўскім палацы, але ад ліцвінскіх і замежных настаўнікаў атрымаў адукацыю не горшую, чым ва ўніверсітэце. Гэтаксама добра, як і па-беларуску, Мікалай гаварыў па-польску і на лацінскай мове. Потым некалькі гадоў ён назапашваў патрэбны дзяржаўнаму чалавеку досвед пры двары польскага караля ў Кракаве.

Бацька, вялікі гетман Юрай, з юных гадоў пачаў браць сына ў паходы. У дваццаць адзін год Мікалай ужо сам камандаваў аддзелам кавалерыі. Гэты аддзел праславіўся ў новай вайне з Масковіяй, якая пачалася ў 1534 годзе. Конніца маладога Радзівіла асабліва вызначылася ў штурме горада Старадуба.

Пасля бацькавай смерці князь Мікалай застаўся ўладальнікам багатых земляў і маёнткаў, а таксама апекуном малодшай сястры Барбары, у якой памёр муж. Каб аўдавелая сястра не засталася без спадчыны, Радзівіл напісаў ліст вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту.

Вялікі князь і княгіня Радзівіл спадабаліся адно аднаму. Яны пачалі сустракацца, а затым пабраліся шлюбам. Тады ўплыў Мікалая Рудога на палітыку Вялікага Княства зрабіўся яшчэ большым. Ад'язджаючы з Вільні ў Кракаў, Жыгімонт Аўгуст прызначыў Радзівіла Рудога сваім намеснікам. Але найбольшую славу князь Мікалай здабыў, калі стаў вялікім гетманам.

Неўзабаве зноў распачалася вайна з Масковіяй, якая прагла захапіць суседнюю з Вялікім Княствам Лівонію. Даведаўшыся, што сабранае гетманам Мікалаем войска перайшло Дзвіну і рушыла на дапамогу лівонцам, маскоўскія ваяводы загадалі сваім стральцам адступаць. Ліцвіны гналі іх ажно да Балтыйскага мора.

Пасля таго, як войскі цара Івана Жахлівага захапілі Полацак, над Вялікім Княствам навісла смяротная пагроза. Але ўзімку 1564 года на беразе ракі Ула, паблізу вёскі Іванск, беларуская конніца Радзівіла раптоўным ударам разбіла ў тры разы большае 25-тысячнае маскоўскае войска. Пасля гэтага захопнікі ўжо не адважваліся ісці ўглыб Беларусі.

Пазней войска гетмана Мікалая ўдзельнічала ў вызваленні Полацка. Вялікі князь і кароль Сцяпан Батура шмат разоў дзякаваў Радзівілу за добрыя парады і ставіў у прыклад ягоную конніцу.

Адзін тагачасны паэт з захапленнем напісаў пра Мікалая Рудога: «Нават калі б у мяне было сто языкоў і сто вуснаў, я не змог бы пералічыць усе бітвы, якія вёў гэты пераможца на варожых палях».

## Канцлер Мікалай Чорны

Надзейным хаўруснікам Мікалая Рудога ва ўсіх справах быў стрыечны брат Мікалай Чорны, які — таксама за колер валасоў — атрымаў мянушку Чорны. Ён займаў высокія пасады, кіраваў вялікакняжскай Радай і паседжаннямі Соймаў, дапамог брату выдаць замуж за Жыгімонта Аўгуста сястру Барбару.

У 1550 годзе Мікалай стаў канцлерам — другім у краіне чалавекам пасля гаспадара. Сябры і непрыяцелі называлі яго некаранаваным уладаром Княства. Пра тое, што ніхто не мог аслухацца канцлера,



Мікалай Радзівіл Чорны



Барбара Радзівіл

казала тагачасная прымаўка: «Дзе Чорны прывяжа карову ў Літве, там яна і стаяць будзе».

За заслугі перад дзяржавай вялікі князь зрабіў канцлера Мікалая віленскім ваяводам і дазволіў захоўваць у нясвіжскім замку Радзівілаў архіў Княства. Амаль кожную пастанову Жыгімонт Аўгуст прымаў толькі са згоды канцлера. За гэта злыя языкі распускалі чуткі, нібыта князь Мікалай сябруе з нячыстай сілаю і навёў на вялікага князя чары.

Мікалай Чорны меў шмат ворагаў, але асабліва ненавідзелі яго каталікі. Канцлер, а ўслед за ім амаль усе іншыя магнаты перайшлі з каталіцтва ў новую веру, якая называлася кальвінізмам. Кальвіністы былі хрысціянамі, але не прызнавалі ўлады рымскага папы і выступалі супраць велізарнага багацця каталіцкай царквы. Яны хацелі зрабіць веру больш простай і чыстай — такой, як у часы Ісуса Хрыста і ягоных вучняў. Чорны адчыняў кальвінісцкія школы, храмы, друкарні. У Нясвіжскай друкарні выдаваў кнігі паслядоўнік Францішка Скарыны асветнік Сымон Будны. На сродкі Радзівіла выйшла і славутая Берасцейская Біблія.

Канцлер і ягоныя аднадумцы хацелі, каб ліцвіны-каталікі і ліцвіны-праваслаўныя злучыліся ў адной царкве. Гэта абараняла б Вялікае Княства і ад каталіцкай Польшчы і ад праваслаўнай Масковіі. Мікалаю Чорнаму не хапіла часу, але, як вядома, праз некалькі дзесяцігоддзяў ягоны намер ажыццявілі прыхільнікі Берасцейскай вуніі.

Шырокую славу заваяваў Радзівіл Чорны і як мужны рыцар. Пры канцы XVI стагоддзя аўстрыйскі герцаг Фердынанд вырашыў стварыць музей еўрапейскай славы. Ён разаслаў у розныя краіны лісты з просьбаю прысылаць панцыры і зброю найзнакамітшых рыцараў. З Вялікага Княства герцаг папрасіў узбраенне братоў Радзівілаў — Чорнага і Рудога. Цяпер іхнія парадныя панцыры захоўваюцца ў сталіцы Аўстрыі ў Венскім гістарычным музеі.

## Лёс Барбары Радзівіл

Родная сястра Мікалая Рудога Барбара была жонкаю гаспадара Жыгімонта Аўгуста. Гэтай жанчыне вялікага розуму і чароўнай красы выпаў дзіўны і цяжкі лёс.

Калі прыгажуня Барбара адзначыла сямнаццаты дзень нараджэння, бацькі выдалі яе замуж за нашмат старэйшага навагрудскага ваяводу Станіслава Гаштольда. Ваявода хутка памёр, і маладая ўдава засталася адна ў родавым мужавым замку ў Геранёнах. Калі скончылася жалоба, Барбара пачала прыязджаць у сталічную Вільню. Аднаго разу на балі яна і пазнаёмілася з вялікім князем. Прыдворныя заўважылі, якімі замілаванымі вачыма глядзеў на Барбару Жыгімонт.

Неўзабаве ён прыехаў на дзянёк у Геранёнскі замак і прагасцяваў у княгіні ажно некалькі тыдняў. Жыгімонт патлумачыў, што хаваўся там ад чумы, якая забрала шмат жыццяў у сталіцы. Аднак у сапраўднасці ён закахаўся ў Барбару.

Сталася так, што вялікі князь праз нейкі час таксама зрабіўся ўдаўцом. Тады Барбара жыла з маці ў Вільні. Жыгімонт Аўгуст загадаў пабудаваць патаемны пераход са свайго палаца ў дом Радзівілаў.

Барбарына маці спрыяла маладым, бо марыла ўбачыць дачку ў кароне вялікай князёўны і каралевы. А вось ейныя браты Мікалай Руды і Мікалай Чорны папрасілі гаспадара Вялікага Княства, каб ён «не чыніў іх дому няславы». Князь паабяцаў больш не прыходзіць, але ўжо страціў ад кахання волю. Кожны дзень расстання з Барбарай, якую Жыгімонт Аўгуст ласкава называў Басяй або Басенькай, быў для яго пакутай.

Аднойчы ўначы ён зноў выправіўся на спатканне, але яго сустрэла не каханая, а яе браты. Яны запатрабавалі альбо ажаніцца з іхняй сястрою, альбо ніколі больш з ёю не бачыцца. Жыгімонт адважыўся на адчайны крок, і ў тую ж ноч таемна абвянчаўся з Барбарай.

Чутка пра гэта дайшла ў Кракаў да бацькоў вялікага князя — караля Жыгімонта Старога і каралевы Боны. Яны былі супраць шлюбу, бо лічылі, што род Радзівілаў хоць і надзвычай знатны, але ўсё роўна ніжэйшы за вялікакняскі і каралеўскі. Каралева Бона залілася слязамі і адразу ўзненавідзела нявестку.

Аднак Жыгімонт Аўгуст і ягоная абранніца перамаглі ў барацьбе за сваё каханне. Барбара Радзівіл атрымала ў Кракаве каралеўскую карону.

На вялікі жаль, шчасце было нядоўгім. Ужо праз некалькі дзён Барбара, якой толькі што споўнілася трыццаць гадоў, цяжка захварэла і не падымалася з ложка. Муж бавіў каля яе дні і ночы, ды нішто ўжо не магло дапамагчы. Хадзіў почут, што каралева Бона падаслала да нявесткі свайго сакратара з атрутай.

Выконваючы жончыну волю, Жыгімонт пахаваў Барбару ў любай яе сэрцу Вільні. На памяць пра каханую ён загадаў пабудаваць там касцёл святой Барбары.

І праз шмат гадоў Жыгімонт Аўгуст не мог забыць сваёй Басі. Паданне апавядае, што ён паклікаў да сябе знакамітага чараўніка-чарнакніжніка пана Твардоўскага, каб той паказаў яму ў люстэрку хаця б цень Барбары.

Працяг на стар. 20 ▸

УРОК

# РАДЗІВІЛЫ

Працяг.
Пачатак на стар. 19.



Гравюра Тамаша Макоўскага





Помнік Тамашу Макоўскаму

Убачыўшы яе аблічча, вялікі князь у роспачы закрычаў: «Басенька мая!». Люстэрка разбілася, пакой напоўніўся дымам. Ад таго часу прывід Барбары, які называюць Чорнай дамай, нібыта з'яўляецца ў Нясвіжскім замку і яго ваколіцах.

Кароткае, але такое незвычайнае жыццё Барбары Радзівіл і сёння ўражвае суайчыннікаў. Свае творы прысвячаюць ёй пісьменнікі, мастакі і кампазітары.

## Мікалай Сіротка

Гэты князь быў сынам Мікалая Радзівіла Чорнага, а мянушку атрымаў ад самога гаспадара Жыгімонта Аўгуста. Выпраўляючыся да вялікакняжскага двара, бацькі аднаго разу ўзялі з сабою і зусім маленькага сыночка Мікалая Крыштопа. Калі Жыгімонт Аўгуст падышоў да яго, Міколка жаласна плакаў на маленькім ложачку. Гаспадар ласкава загаварыў з ім і назваў сіроткам.

У гады дзяцінства Сіроткі ў Нясвіжы жылі і працавалі вядомыя еўрапейскія вучоныя, якіх сабраў да сябе Мікалай Чорны. Яны і сталі для хлопчыка першымі настаўнікамі. Потым ён спасцігаў навуку ва ўніверсітэтах далёкіх Страсбурга і Цыбінгена.

З юнацтва Мікалай Сіротка любіў вандраваць. Ён пабачыў італійскія гарады Рым, Мілан і Падую, быў у швейцарскім Цюрыху. Знатнасць роду і багацце дазвалялі яму сустракацца з рымскім папам і каралямі, выступаць на самых славутых рыцарскіх турнірах.

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, князь Мікалай на чале ўласнага аддзела ваяваў з маскоўскімі захопнікамі. Пры вызваленні Полацка войскам Сцяпана Батуры Радзівіл быў паранены, а пад час аблогі Пскова атрымаў яшчэ адну цяжкую рану. Каб хутчэй ачуняць, Сіротка намерыўся здзейсніць вандроўку ў Святую Зямлю і памаліцца там, дзе калісьці навучаў людзей Ісус Хрыстос.

З Нясвіжа Сіротка накіраваўся ў італійскі горад Венецыю, а далей паплыў на караблі морам. Па дарозе ў Ерусалім і назад падарожнік наведаў астравы Крыт і Кіпр, а таксама Сірыю і Егіпет. Ён аглядаў старажытныя гарады і помнікі, цікавіўся прыродай, звычаямі і гаспадаркай тамтэйшых краінаў і народаў. Паўсюль князь занатоўваў назіранні ў дзённіку.



Помнік Мікалаю Сіротку

На зваротным шляху карабель, на якім плыў Сіротка, трапіў у страшны шторм. Князевыя спадарожнікі вырашылі, што Бог гневаецца, бо Радзівіл вязе з сабой для нясвіжскай музейнай калекцыі егіпецкія муміі. Муміі давялося выкінуць за борт, але дзве з іх князь усё ж прыхаваў.

У Нясвіж ён прывёз шмат іншых старажытных рэчаў, а таксама дзіўных для нашых краёў жывёлін і птушак — малпаў, леапардаў, чыюкоў-папугаяў. Аднак самым галоўным багаццем былі падарожныя нататкі. Дзякуючы ім князь напісаў на лацінскай мове кнігу, якая скарочана называлася «Пэрэгрынацыя» («Падарожжа»). Кніга атрымалася такой цікавай і карыснай, што дваццаць разоў выдавалася на розных еўрапейскіх мовах, у тым ліку і на беларускай.

Мікалай Сіротка адмовіўся ад бацькавай кальвіністкай веры і стаў каталіком. Ён нават скупляў і загадваў паліць выдадзеную бацькам Берасцейскую Біблію. Але князь заставаўся патрыётам роднай краіны. Ён быў паслом вялікага князя на царкоўным з'ездзе ў Берасці і спрыяў царкоўнай уніі. Каля Нясвіжа ён заснаваў уніяцкі манастыр.

Землякі найперш памятаюць і шануюць Радзівіла Сіротку за тое, што ён перабудаваў родны Нясвіж і зрабіў яго адным з найпрыгажэйшых гарадоў дзяржавы.

Добра распараджаючыся сваім велізарным багаццем, князь запрашаў да сябе таленавітых дойлідаў, мастакоў і майстроў розных спецыяльнасцяў. Якраз у тыя часы ў Нясвіжы з'явіліся славутасці, якія і сёння прываблівають туды тысячы турыстаў. Гэта Радзівілаўскі замак, ратуша, Фарны касцёл, які пабудаваў по ўзор аднаго з самых знакамітых рымскіх храмаў архітэктар-італіец Ян (Джавані) Марыя Бернардоні.

У Сіроткі плённа працаваў таленавіты мастак Тамаш Макоўскі. Ягоныя творы дапамагаюць нам сёння ўявіць, як чатыры стагоддзі таму выглядалі Нясвіж, Вільня, Горадня, Клецак. Макоўскі быў і выдатным картографам — майстрам у складанні геаграфічных картаў. На замову Сіроткі ён стварыў першую дакладную карту Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Гэты Радзівіл мае і шмат іншых заслугаў перад родным горадам і Бацькаўшчынай. Ён будаваў вучэльні і шпіталі, павялічыў заснаваную бацькам бібліятэку, стварыў у Нясвіжскім замку вялікую партрэтную галерэю. Калі вы прыедзеце на экскурсію ў радзівілаўскую сталіцу, абавязкова знайдзіце ў старым парку помнікі Мікалаю Сіротку, а таксама дойліду Яну Бернардоні і мастаку Тамашу Макоўскаму.

## Гетман Януш Радзівіл

Князь Януш, як і ягоныя продкі, быў патрыётам Вялікага Княства і змагаром за яго незалежнасць ад Польшчы. Яшчэ ў юнацтве ў спрэчцы з польскімі пасламі ў Вільні Януш сказаў ім, што прыйдзе час, калі ліцвіны будуць выкідаць хцівых палякаў у вокны.

Князь вучыўся ва ўніверсітэтах Нямеччыны, Францыі, Галандыі і Англіі. Апрача глыбокіх ведаў у розных навуках, ён меў надзвычайны вайсковы талент. У сорак гадоў стаў віленскім ваяводам, а затым і вялікім гетманам. «Спачатку хачу Айчыну шчаслівай бачыць, а потым дом родны»,— казаў князь Януш.

Якраз тады Расея зноў напала на Рэч Паспалітую. Уся дзяржава глядзела на Януша Радзівіла з надзеяй, бо на яго плечы лёг цяжар галоўнага абаронцы. У гетмана было толькі 10 тысячаў жаўнераў, на якіх ішло амаль 100-тысячнае расейскае войска. Першую бітву ворагу Януш даў у жніўні 1654 года пад Шкловам. Ліцвіны святкавалі бліскучую перамогу: яны страцілі 700 ваяроў, а маскоўцы ледзь не ў дзесяць разоў болей. Але ўсё роўна на аднаго ліцвіна прыпадала па дзясятку захопнікаў. Царскім ваяводам удалося ўзяць корпус Радзівіла ў ціскі. Блізу тысячы нашых жаўнераў палегла, а сам гетман быў паранены.

Царскія войскі захапілі большую частку Беларусі разам з Вільняй. Трэба было ратаваць Бацькаўшчыну. Не маючы дастатковай збройнай сілы, каб змагацца з расейцамі, у 1655 годзе Януш Радзівіл падпісаў пагадненне пра вунію Вялікага Княства са Швецыяй. Такім чынам ранейшая вунія з Польшчай зрабілася несапраўднай. З дапамогаю шведскай арміі князь Радзівіл разлічваў разбіць маскоўцаў і ўмацаваць самастойнасць Княства. Але супроць гетмана ўзбунтавалася частка ягонага войска. Вунія не ажыццявілася, а сам Януш падазрона хутка памёр — напэўна, пастараліся ворагі.

З удзячнасцю князя згадвалі не толькі верныя паплечнікі-ваяры. Студэнтам-ліцвінам ён даваў стыпендыі на навучанне ў Еўропе. На сродкі Януша Радзівіла будаваліся храмы і школы. Мужавы асветніцкія клопаты працягвала ягоная жонка Соф'я, якая паходзіла са слуцкіх князёў. Цяпер праваслаўныя беларусы шануюць Соф'ю Слуцкую як святую.

## Багуслаў Радзівіл

Пра гэтага Радзівіла можна было б напісаць раман не менш цікавы, чым «Тры мушкецёры» Аляксандра Дзюма. Багуслаў не горш за мушкецёраў валодаў шпагаю, біўся на дуэлях, і за тое нават трапіў у французскую турму Бастылію. Праўда, хутка выйшаў на волю. Дапамагло добрае знаёмства і сваяцтва з каралём Францыі, у войску якога наш зямляк займаў пасаду палкоўніка.

Жыццё Багуслава Радзівіла зaўсёды было поўнае прыгодаў. Неяк ён выратаваў жыццё шведскаму каралю. Ангельскі ж кароль з нагоды прыезду нашага суайчынніка наладзіў у яго гонар баль і вялікае паляванне.

Аднойчы князь трапіў у палон да татараў, але хутка выкупіўся за невялікія грошы, бо змог прыкінуцца бедным шляхцічам.

Князя ведалі і як чалавека, які захапляўся мастацтвам. Ён пісаў рэлігійныя песні, збіраў карціны ліцвінскіх і замежных мастакоў. Багуслаў і сам нядрэнна маляваў і меў здольнасці архітэктара. Ён зрабіў праект гарадскіх умацаванняў Слуцка, у якім уладарыў. Пасля іх пабудовы гэты горад пачалі называць «бастыёнам Літвы».

Нядрэнна валодаў Багуслаў і пяром. Князь пакінуў цікавае апісанне свайго жыцця — аўтабіяграфію. Нядаўна яна выйшла асобнай кніжкай па-беларуску.

У сабранай князем бібліятэцы захоўваліся вельмі рэдкія рукапісныя і друкаваныя кнігі на дзясятках моваў. Асабліва падабаліся гаспадару выданні, прысвечаныя мастацтву, архітэктуры і геаграфіі. У гэтым кнігазборы знаходзіўся і старажытны летапіс з мноствам каляровых малюнкаў-мініяцюраў. Ён збярогся, і вельмі цікавіць сучасных вучоных. На старонках летапіса шмат малюнкаў з гісторыі нашай зямлі. Там можна ўбачыць выявы Рагнеды і Рагвалода, бітву на Нямізе, захоп у палон полацкага князя Усяслава Чарадзея. Па імені былога ўладальніка летапіс так і называюць — Радзівілаўскі.

Трэба дадаць, што імя Багуслава Радзівіла добра ведаюць жыхары Жодзіна. Яны лічаць князя заснавальнікам свайго горада.

### Пытанні і заданні

1. Якімагнацкі роды у нашай дзяржаве быў самым магутным? Раскажыце пра яго пачынальніка.
2. Які горад лічыўся Радзівілаўскай сталіцаю? Назавіце гарады і мястэчкі, якія таксама належалі Радзівілам.
3. Чаму Юрая Радзівіла назвалі «Літоўскім Геркулесам»? У якіх бітвах ён перамог?
4. За што мы памятаем гетмана Мікалая Радзівіла Рудога?
5. Хто такі Мікалай Радзівіл Чорны?
6. Дзе захоўваецца цяпер рыцарскае ўзбраенне Мікалая Рудога і Мікалая Чорнага? Як яно туды трапіла?
7. Раскажыце пра незвычайны лёс Барбары Радзівіл.
8. Як князь Мікалай Крыштоп Радзівіл атрымаў мянушку «Сіротка»? Чым ён праславіўся?
9. Як Мікалай Сіротка падарожнічаў у Святую Зямлю?
10. Што зрабіў князь Мікалай Сіротка для роднага Нясвіжа?
11. Як бараніў Вялікае Княства Літоўскае гетман Януш Радзівіл? Чаму ён вырашыў падпісаць дамову пра вунію з Швецыяй?
12. У якія прыгоды трапляў Багуслаў Радзівіл?
13. Што вы даведаліся пра Радзівілаўскі летапіс? Чаму яго так назвалі?

ПАМЯЦЬ

# БАЛЮЧАЯ СТРАТА

Яўген ЛЕЦКА

**Мікола Дзяшкевіч нарадзіўся ў патрэбны для Беларусі час і мог стаць волатам нацыянальнага Адраджэння, але, на жаль, ягонае жыццё раптоўна абарвалася на трагічна-гераічным маладым узлёце.**



Мікола Дзяшкевіч

Было яму тады ўсяго 24 гады. Але здолеў ужо яскрава і грунтоўна заявіць пра сябе як удумлівы пошукавік-навуковец, пранікнёны тэатральны і літаратурны крытык.

Мы з Міколам — блізкія землякі. Ягоная вёска Пагора знаходзіцца ў трох кіламетрах ад Шчорсаў, кудою я сотні разоў мінаў, едучы з Мінска ў родныя мясціны.

Нарадзіўся Мікола 11 траўня 1947 года. Змалку выявіў незвычайныя здольнасці да ведаў. Старэйшы ад яго на дзесяць гадоў брат Аркадзь сведчыў: калі Міколку было чатыры гады, да іх прыехалі сваякі і вельмі здзівіліся, убачыўшы, што малы трымае ў руках газету і нібыта чытае. «А што тут такое, — пацісну плячыма бацька. — Ён ужо даўно вывучыў літары, а цяпер шпарыць хоць бы што...».

Мікола меў цвёрды намер паступаць у колішні тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Акадэмія мастацтваў) у Мінску. Здаў экзамены на выдатна, але яго не залічылі па той прычыне, што ад нараджэння меў дрэнны зрок і ўвесь час хадзіў у акулярах. На падставе здадзеных адзнак без экзаменаў прынялі на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Вучыўся ахвотна і без натугі. Здольнага хлопца заўважыла пільнае вока колішняга камандзіра партызанскай разведкі, а тады загадчыка кафедры беларускай мовы прафесара Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага. Вось як пра той момант згадваў гэты найцудоўнейшы чалавек і педагог, які падтрымаў не адзін дзясятак таленавітых хлопцаў і дзяўчат, дапамогшы ім стаць сапраўднымі беларусамі:

«...Была нечаканая сустрэча, нечаканае знаёмства. На вечары студэнцкай самадзейнасці група студэнтаў, у тым ліку Мікола, выступалі з літмантажом. Побач са мною ў зале сядзеў дэкан бібліятэчнага факультэта. Я і распытаўся ў яго пра таго студэнта, роля якога ў літмантажы была больш складаная, чым у іншых. Яго выкананне сваёй ролі мне вельмі імпанавала. Дэкан паклікаў Міколу, пазнаёміў. Вечар скончыўся, а мы ўтрох сядзелі ў актавай зале. Я пацікавіўся, адкуль ён, як здаваў і здае літаратурныя і літаратуразнаўчыя курсы, як у яго з веданнем беларускай літаратуры, беларускай гісторыі... І ён расказаў: "Гісторыя беларускай літаратуры? Не, увесь націск на савецкую пасляваенная часу. І аднае гадзіны не чыталі гісторыі Беларусі... За чатыры гады вучобы на бібфаку і аднае гадзіны роднай мовы не было...».

Менавіта Фёдар Міхайлавіч, ведаючы, што з'явілася вакансія ў музеі Янкі Купалы, параіў Міколу пайсці туды на працу. Дырэктарам музея тады працаваў яшчэ адзін руплівец беларушчыны, крытык і літаратуразнаўца Уладзімір Юрэвіч, які многім жыхарам Беларусі запомніўся як выдатны вядучы радыёпраграмы «Роднае слова». Працаваць у такога кіраўніка для маладога хлопца было сапраўднай знаходкай, радасцю і шчасцем. Цяга да ведаў узмацнялася. «Здаецца, каб было трохі больш гадзінаў у сутках, — прызнаваўся аднойчы мне, як дырэктару Купалаўскага музея, — прачытаў бы ўсё... Асабліва Купалава і пра Купалу...»... Купала быў яго захапленнем змалку, з верша «Хлопчык і лётчык». (...) Ён жыў Купалавымі вобразамі, марыў яго марамі, дзейнічаў як Янка Купала, як бы сплочваючы свой доўг сціплага экскурсавода перад людзьмі, перад народам», — успамінаў У. Юрэвіч.

Не пераставаў Мікола захапляцца і тэатрам. Ён, як сведчыць прафесар Аляксей Пяткевіч, абавязкі навуковага супрацоўніка музея Я. Купалы сумяшчаў з працай у тэатральнай студыі ў Мінску. Ён дзейна цікавіўся тэатральным жыццём, часта бываў на спектаклях, быў асабіста знаёмы з многімі артыстамі і пісаў у друку пра іх і пра тэатр увогуле, найбольш пра самы блізкі і яму найраднейшы, Купалаўскі.

Ва ўнісон з Уладзімірам Юрэвічам, але дадаючы ад сябе істотныя моманты ў асэнсаванне ўзаемасувязі М. Дзяшкевіча з беларускім тэатрам, піша ва ўспамінах доктар мастацтвазнаўца, слынны навуковец і пісьменнік Арсень Ліс:

«Міколу, як ні кароткамаланкавы быў яго чалавечы ранак, век, пашанцавала на тэатр. Сапраўдную сцэну. Міколава ранняе сталенне, узыходжанне амаль супалі з прыгожым захадам Купалаўскага тэатра. Цэлае сузор'е вялікіх талентаў яшчэ дзеяла-чарадзеіла на яго сцэне. Уладамірскі, Глебаў, Платонаў, Ржэцкая, Дзядзюшка, Пола, Бірыла, Рахленка... Кожны — постаць з нейкімі асабліва адметнымі рысамі артыстычнага таленту і разам гарманічны ансамбль, мастацкая цэльнасць, адна плеяда. Ужо тады не было ў тэатры пастаяннага, свайго рэжысёра. Даводзілася запрашаць на асобны спектакль, сезон. Перасталі рэпецірваць на сваёй сцэнічнай мове — па-беларуску. А слова беларускае ў старэйшага пакалення тэатра гучала арганічна, натуральна, мілагучна. Маладосць купалаўцаў прыпала на дваццатыя гады — час маладога энергічнага ўзлёту нацыянальнай культуры. Вытокі духоўнай сілы магікан-купалаўцаў былі менавіта ў 20-х гадах, атмасферы таго часу.

Гэту загадку нацыянальнай культуры Мікола яшчэ не паспеў разгадаць. Але адчуваў яе інтуітыўна. Шмат над чым задумваўся. Жыццё падказвала. Сустрэчы з людзьмі. І ў першую чаргу — з людзьмі мастацтва».

Усё гэта бачыў і скрушна перажываў малады Мікола Дзяшкевіч, у якога рамантыка праявралася жыццёвай практыкай. І ў яго спаквала выспявала рашэнне здзейсніць на новым жыццёвым вітку колішнюю тэатральную мару, але цяпер ужо не ў ролі артыста, а рэжысёра...

Быў у Міколы Дзяшкевіча і яшчэ адзін талент — пісьменніцкі. Адчуць здольнага літаратара найперш можна па тым, як ён валодае словам, стылем, умее весці нязмушаную гаворку, маляваць вобраз. І гэта добра адчуваецца там, дзе ён піша пра артыстаў. Наш вядомы пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч, які на той час працаваў у часопісе «Полымя» ў аддзеле крытыкі і рыхтаваў да друку адзін з найбольш значных артыкулаў М. Дзяшкевіча «Ад вытокаў радаводных», пакінуў нам вось такое сведчанне:

«Калі імя Міколы Дзяшкевіча стала сустракацца на старонках газет і часопісаў, многія лічылі, што гэта будзе прынцыповы крытык, чулы да слова, што ў яго добры густ і аналітычны розум.

Прыблізна гэта я і сказаў Міколу, і ён успрыняў мае словы не як хлопчык, а як сталы мужчына. Відаць, ён і сам ужо ведаў сабе цану. І гэта, па яго словах, не галоўнае ў яго рабоце. «Хутка я пачну пісаць прозу», — сказаў ён.

Я радаваўся за яго, ён мне спадабаўся з першага разу, гэты юнак з інтэлігентным тварам і разумнымі вачыма. Я верыў у яго словы і казаў сабе: «Проста выдатна, што мы будзем мець яшчэ аднаго перспектыўнага празаіка».

Пра Міколу мне расказаў наш агульны старэйшы сябар Алесь Траяноўскі, чалавек шчодрай душэўнай дабрыні, рамантык, які, будучы надзвычай пагляднным мужчынам, так сваёй сям'і і не прыдбаў, бо заставаўся па донкіхоцку верным сваёй першай каханай. Свой бацькоўскі клопат і ласку аддаваў тым хлопцам, якія праяўлялі цікавасць ці былі аддадзеныя беларушчыне. Мяне найбольш зацікавіла і ўзрушыла, што мы з Міколам землякі і, зусім верагодна, маглі сустракацца на гуляннях у Шчарсоўскім клубе, куды я зрэдзь часу наведваўся, а ён, напэўна, бываў там і часцей. Алесь Пятровіч падмеўся нас пазнаёміць, але нешта адкладвалася, напэўна што па маёй віне, бо я тады вучыўся ў аспірантуры, быў вольным казаком і, на жаль, не такім уседлівым за кнігамі, як Мікола. Бо яшчэ з другога курса ўніверсітэта захапіўся працай гіда-перакладчыка і вандраваў з замежнымі турыстамі ўздоўж і папярок былога Савецкага Саюза. Быў ад Міколы далёка і тады, калі адбылося тое трагічнае здарэнне на Нёмане, пра якое мне цяпер падрабязна распавёў ягоны брат Аркадзь Аляксандравіч, які на той час выконваў абавязкі старшыні калгаса.

Раскашавала лета, і Мікола прыехаў на адпачынак у родныя мясціны. У першы ж дзень патэлефанаваў брату і папрасіў абавязкова вечарам прыехаць у бацькоўскую хату, паабяцаўшы пачаставаць арыгінальным півам. Яны разам з бацькамі выпілі тую пляшку «Пасольскай», потым браты выйшлі на двор, крыху пастаялі, і Мікола ўзрушаным голасам прамовіў:

— Слухай, Аркадзя! У мяне да цябе просьба. У цябе падрастаюць дзве дачкі, слаўныя разумныя дзяўчынкі. Я даю табе слова, што зраблю ўсё, каб дапамагчы ім стаць на ногі. Але паабяцай мне, братка, што ты, калі што са мною здарыцца, не пакінеш без дапамогі маёй дачушкі Ірынкі...

— Што ты, Коля, кажаш! — спачатку зніякавеў, потым устрапянуўся ад пачутага Аркадзь. — Што ты чаўпеш, што з табою здарыцца!..

— Я і сам не ведаю — нейкі цяжар на сэрцы...

На тым яны ў той вечар развіталіся, а назаўтра Мікола зноў патэлефанаваў і папрасіў падвезці яго разам з братавай (Аркадзевай жонкай) і пляменніцамі на Нёман. Аркадзь папрасіў прабачэння, што вельмі заняты, але паабяцаў прыслаць шафёра з машынай. Той адвёз, як і папрасіў Мікола, пад шчорсаўскі мост, які яшчэ за царскім часам меў стратэгічнае значэнне, але ў апошнюю вайну яго ўшчэнт разбамбілі немцы, застаўся толькі высозны насып-пад'езд да колішняга высачэннага моста, замест якога пабудавалі так званы плывучы з дошак, які ляжаў на вадзе...

Шафёр круцянуўся на Нёман і праз якое паўгадзіны вярнуўся назад, падаў Аркадзю Аляксандравічу скамечаныя грошы. Той здзівілена лыпнуў вачыма.

— Брат прасіў узяць бутэльку і, як стане менш клопату, прыехаць да яго.

Аркадзь сумеўся. Нейкае насланнё ці што: Коля ж выпівохам ніколі не быў. Прыгадалася ўчарашняя размова вечарам на панадворку, і невыразная цяжкая трывога апанавала душу. Бараздэжэй уходаўся і загадаў шафёру ехаць на Нёман.

Тое, што адбылося, можа стаць асновай для мастацкага твора, навэлай пра апошнія дні і гадзіны Міколавага жыцця.

Як пад'ехалі да насыпу, Аркадзь зразумеў, што здарылася непапраўнае...

Як заўжды, калі надаралася вольная хвіліна, Мікола дастаў кнігу і засяродзіўся ў чытанні.

Братавая з дачкою Оляй тым часам увайшлі ў раку і пачалі купацца. А потым пачуліся крыкі, лямант, і Мікола ўскочыў на ногі. Маці з дачкою неяк неўзаметку адплылі ад берага на быстрыню, і плынню іх аднесла ў бухту, дзе заўсёды віравалі вадакруты-віры, у якіх, дарэчы, на памяці старажылаў загінулі 22 чалавекі...

Ён нырнуў, вынырнуў і імкліва пачаў рэзаць плынь у накірунку да той бухты. Выратаваў дзяўчынку, абхапіў яе адною рукою за стан, падплыў да берага, выпхнуў дзіця з вады, а сам зноў кінуўся туды, дзе віравала вада. Але на гэты раз з бухты не вынырнуў. Міліцыянер, які адпачываў непадалёку на беразе, таксама кінуўся ратаваць тапельцаў і выцягнуў з вады жанчыну. Яе адратавалі. А Міколу ў той дзень так і не знайшлі.

Можна ўявіць, што перажылі ў той дзень і ў тую ноч родныя. А назаўтра, як развіднела, на Нёман пабегла Міколава мама. Яе адгаворвалі, не пускалі, але нікога не паслухала і пабрыла па Нёмане галосячы: «Ах маё ж ты дзіцятка родненькае, а мой дарагі сыночак, а чаму ж я цябе не ўпільнавала, не ўратавала... А дзе ж ты падзеўся, а выплыві, родненькі. Ці ж мне самой тапіцца...»

І здарылася неверагоднае: выплыла набрынялае за ноч сынава цела.

Працяг на стар. 23 ▸

ЛІТАГЛЯД

# ЧЫСТАЧЫТАННЕ

ЛеГАЛ

**Калі надарылася нагода рэцэнзаваць «ДЗЕЯСЛОЎ», то найперш зажадалася вось гэтай шчырай размовы — агляду, абмеркавання яго публікацый, погляду збоку…**




Падумалася, што аўтарам часопіса не хапае зваротнай крытычнай сувязі, што яны варацца ў сваім соку, пакінутыя самі на сябе. Маўляў, надрукаваўся ў такім салідным выданні — і ўжо гэтым будзь задаволены, калі не шчаслівы. Таму — па прынцыпу бумеранга — паспрабуем вярнуць аўтарам уражанні ад кінутых імі на волю лёсу іх мастацкіх твораў і літаратурных тэкстаў…

Бадай, адразу вызначымся з найбольш важнымі, на мой погляд, публікацыямі апошняга па часе 47-га (чацвёртага за гэты год) нумара «Дзеяслова». Такіх чатыры: пачатак новага рамана Людмілы Рублеўскай «Сутарэнні Ромула», нізка вершаў Ігара Кулікова «Закон узаемнае невылечнасці», прэзентацыя інтэрнэт-часопіса «ПрайдзіСвет» ды прадстаўленыя Міхасём Скоблам вершы і ліставанне Ларысы Геніюш.

Цягам усяго часу свайго выдання часопіс стварае ўражанне аднастайнасці, як стрыжнёва-канцэптуальнай, так і тэматычнай ды, можна сказаць, і аўтарскай. Дрэнна гэта ці добра? Адназначнага адказу быць не можа. Такім некалі быў «Новый мир». Тут і ўхвала і папрок разам. Ухвала за нацыянальна-ідэйную і грамадзянскую вытрыманасць. Але і адчувальнае ігнараванне паправак на час, які, між іншым, і ў мастацкім вызначэнні застаецца рухомым.

Пачну з даволі таленавітай, амбітнай, дастаткова раскручанай і пазнавальнай літаратурнай дамы. Людміла Рублеўская піша ў вельмі запатрабаваным цяперашнім гіблым часам нацыянальным накірунку і ў той прымальнай маладой чытацкай аўдыторыяй манеры, як гэта рабіў трыццаць-сорак гадоў таму У. Караткевіч. Іншая справа, як пры сённяшнім ладзе беларускага грамадства такую літаратуру прапагандаваць… Але ж ці было тое лягчэй і тады? (Што праўда, аднатыпнасць тэматыкі твораў Л. Рублеўскай, дзе гістарычна-нацыянальны матыў уплятаецца ў кантэкст сучаснага твора як нейкая рэтра-прышчэпка ў прычоску сённяшняй модніцы, нярэдка трывожыць.) Адчуваецца, што супраца пісьменніцы з вядомым літаратуразнаўцам і архівістам Віталем Скалабанам дае ёй шмат дакументальнай, невядомай шырокай публіцы, гістарычнай фактуры для новых творчых задум… Раман «Сутарэнні Ромула» напісаны ў стылі фэнтэзі: галоўная гераіня Арсенія, рэдактарка і адначасна маладая літаратарка, пераносіцца з цяперашняга часу ў пачатак мінулага стагоддзя. Пераход ад рэальнага да «гульні» выпісаны хоць і не зусім пераканаўча, але на дабротным мастацкім узроўні. У тканіну змысленага літаратурнага твора «ўшываецца» дакументальная падкладка з рэальнага жыцця, але белыя ніткі, на жаль, застаюцца бачнымі. І ўсё ж пачатак твора пакідае ўражанне майстравіта напісанай рэчы, чытаецца лёгка, хоць яму і бракуе той высокай ідэйнай і псіхалагічнай (драматычнай) напругі, якая захоплівае ўсю чытацкую істоту, робіць яго (чытача) не назіральнікам, як у дадзеным выпадку, а саўдзельнікам, як, скажам, у лепшых творах А. Федарэнкі ці Ю. Станкевіча.

У рамане супрацьпастаўлены беларусы: усходнікі і заходнікі, праваслаўныя і каталікі, шляхта і прасталюдзіны, паны і прыслуга… Менавіта іх узаемаадносіны ў грамадстве паўплывалі на палітычнае і грамадскае становішча беларускай рэспублікі (ды і на жыццё сённяшняй краіны таксама яшчэ ўплываюць). Вельмі добра, адметна і пры гэтым ненавязліва выпісаныя фактура і партрэты герояў, хоць сам сюжэт развіваецца адстаронена, неразўнуючы як у эсэ (некаторыя апісанні, скажам, знарочыстыя ўстаўкі пра А. Блока і М. Горкага, не адыгрываюць ніякай ролі). Кантрастна выпісваецца (нават візуальна прачытваецца) наш сённяшні час з яго характэрнымі рысамі і тыпажамі (паэт Анатоль Сыс, гістарычны літаратар Вітаўт Чаропка падаўся мне прататыпам Вячкі Скрыніча, галярэя «Падземка» і г.д.). Праўда, часам пачынаецца міжвольная фрывольная гульня ў само пісанне: сур'ёзны фрагмент раптам перарываецца нейкай жаночай сентыментальнасцю, якая разбівае чытацкае суперажыванне абарванага эпізода. Але што да чыстага гладкапісу, то ён як бы нівеліруе высокамастацкае і чыста літаратурнае ў Л. Рублеўскай — бо ўсё ж пісьменніцы бракуе жыццёвага вопыту, таго, што яна іранічна называе «тварам аб асфальт» (у гэтым устаўным пасажы, дарэчы, я нечакана пазнаў сам сябе: «стары паэт, які пакінуў пісаць вершы».).

Падчас ствараецца ўражанне, што не пісьменніца вядзе рэй (стварае сюжэт) твора, а здабытыя (прачытаныя ёй) архіўныя матэрыялы выпроствацюь закручаную канву раманнай інтрыгі… Такі пасаж. Студэнт П'янкоў выклікаецца ў наркамат замежных спраў для правядзення з ім агентурнай работы. Узнікае пытанне, чаму ён выкліканы ў гэтую дзяржаўную ўстанову, а не ў ГПУ? Адтуль яшчэ дзве дэталі. Сеўшы, «П'янкоў страсянуў галавой і, каб адагнаць морак, аддана ўтаропіўся ў мудрыя вочы намаляванага Леніна — вялізны партрэт у цяжкой багетнай раме вісеў, як мае быць,на сцяне за спіной гаспадара кабінета…». А напрыканцы аўдыенцыі той самы гаспадар "блаславіў" студэнта, «падпусціўшы належнага пафасу ў голас, і Сталін на сцяне, здавалася, ухвальна зірнуў мудрым прыжмураным вокам». Зрэшты, па тым часе вісела ў высокіх кабінетах і па два партрэты. І ўсё ж, чытаючы наступнае, пачынаеш разумець аўтарскую алюзію: «Яе перасмыкала ад адчування, што насамрэч трапіла ў тую эпоху, калі на сцяне віселі вусатыя партрэты, а навуковыя дыскусіі заканчваліся расстрэламі. Нават нейкая даўжынёй з глыток паўза ўзнікла ў асэнсаванні рэалій…». Вось гэтая паўза асэнсавання рэалій і вартая, каб скасаваць увесь мой негатыўны крытычны сверб…

Партрэт галоўнай гераіні, які ў чытача асацыіруецца з аўтарскім (у нашым часе) і Алеся Вяжэвіча (родзіча Арсеніі ў мінулым) падаецца не толькі ў ружовых фарбах, а ў некаторых момантах негатыўна і нават асуджальна. Шкада толькі, што нярэдка ў Л. Рублеўскай цэнтральная ідэя твора (у дадзеным выпадку нацыянальная) ПАЎСТАЕ над ідэяй мастацкай. Таму часта даводзіцца спыняць сваю чытацкую ўвагу менавіта на асобных кантрапунктах твора. Да прыкладу, на фармуліроўцы, якая зрываецца з вуснаў Данілы Раманавіча Корб-Варановіча ў дачыненні Вячкі Скрыніча:«Усе вашы раманы чытаў. Вунь у гэтай шафе стаяць. Мой улюбёны — апошні… Пра князя Глінскага. Вядома, з гістарычнымі фактамі вы абыходзіцеся гэтак вольна, як гусар з пейзанкамі, але… Я заўсёды згаджаўся з думкаю, што нам трэба найперш ствараць прымальны рамантычны нацыянальны міф…».

Гучыць як аўтарскае крэда, з якім, прызнаюся, я цалкам згодны. Таму будзем з цікавасцю чакаць працягу рамана. У Л. Рублеўскай ёсць свой інтэлігентны, даволі грамадска-актыўны чытач. І гэта значыць, што пісьменніца сваёй заўважнай плённай творчасцю і надалей пашырае кола нацыянальна заангажаванай беларускай аўдыторыі.

Ігар Кулікоў, нізкай вершаў якога «Закон узаемнае невылечнасці» адкрываецца нумар «Дзеяслова», мае шырокі інтэлект, добры кніжны досвед і несумненны дар версіфікацыі, але — зноў жа! — вобмаль жыццёвага вопыту, адсюль — «словы, словы, словы» ў адмыслова змысленым і выверана выстаўленым парадку. Чалавек, безумоўна, таленавіты, самасны і, здаецца, зусім малады, таму мае вялікі патэнцыял. А як ён выявіцца праз якіх дзесяць гадоў, Бог ведае.

Прачытаўшы яго нізку да канца, «скруціўшыся эмбрыёнам», не мог даўмецца: пра што і дзеля чаго, бо мне, чытачу, як і паэту, патрэбная творчая эвалюцыя дзеля яго высокасці мастацтва, якое трымаецца не на пустапарожнім слове, а на слове, напоўненым жывым трагічным зместам зямнога чалавечага жыцця. Да ўсяго стылістыка І. Кулікова аддае А. Хадановічам, а мысленне І. Бродскім. Аўтар гэтага асабліва і не хавае, а падчас нават выстаўляе напаказ, як бы парадыруючы згаданых паэтаў, альбо ўрэшце цэнтонна «сцябаецца» ад лішніцы іх умоўнага, але назойлівага куратарства:

*Ад усяго чалавека табе*
*застаецца ўсё.*
*Ўсё абсалютна.*
*За выняткам чалавека.*

Альбо гэтыя, пазнавальныя па іх бацьку, маскультурныя сімвалы, што, як лакмусавыя паперкі, выяўляюць прадаўжальнікаў роду яго паэзіі: Чычэн-Іцу, Паца-ваца, Лах-Нэсы, Тытыкала, Мацу-Пікчу… Агулам, нестае жывых чалавечых пачуццяў: болю, радасці, перажыванняў натуральнага жыцця. Але што дзіўна, гэтыя па-свойму арыгінальныя парасткі вершаў, напоеныя сокам з каранёў сапраўднай паэзіі, не выклікаюць чытацкай алергіі. Гэта абнадзейвае. Што ж, будзем чакаць ад даравітага маладога паэта творчага і мастацкага ажыўлення…

Прэзентацыя інтэрнэт-часопіса «ПрайдзіСвет» атрымалася больш чым удалая. Цэльнае ўражанне пакінула прадстаўленне партугальца Фэрнанду Пэсоа, які пісаў на роднай і англійскай мовах, пры гэтым хаваючыся пад рознымі псеўданімамі. Гэта творца высокага парадку і даўно быў варты знаёмства з беларускім чытачом.

*Што да мяне, то я пішу*
*прозу сваіх вершаў*
*І задаволены,*
*Бо ведаю, што спасцігаю*
*Прыроду звонку*
*І не спасцігаю знутры.*
*Таму што ў прыроды*
*няма нутра.*
*Інакш яна б не была Прыродай.*

**(Пераклад Кацярыны Мацiеўскай.)**

З прыемнасцю прачытаўся і парадыйны Макс Бірбам са сваім «Энохам Сомсам» у перакладзе Юліі Цімафеевай. Думаю, у далейшым чытачоў варта знаёміць з жыццём і творчасцю аднаго-двух замежных творцаў (лепш было б, каб аднаго класічнага і аднаго сучаснага). Карысці, часам, больш, чым ад сваіх, калі ведаць меру і прапорцыі.

Артыкул М. Скоблы, новыя вершы Ларысы Геніюш і яе лісты да Язэпа Найдзюка. … Ёсць проста цудоўныя, выдыхнутыя пакутным холадам жыцця, вершы пра нашую нацыянальную долю. Вось страфа з верша «Сыну»:

*Май сэрца дзіцяці,*
*любі свой народ,*
*будзь прыкладам брацціям,*
*будзь бацькам сірот,*
*у пекле — анёлам,*
*не толькі ў раю…*
*Я людзям для шчасця*
*цябе аддаю!*

Не ўпэўнены, што яшчэ ў якога паэта я сустракаў такую гранічна-непамысную метафару: будзь «у пекле — анёлам», гэта значыць, заставайся чалавечным і ў самай цяжкай сітуацыі. Але больш за ўсё ўразіла яе неймаверна шчырая перапіска з Я. Найдзюком, асабліва ў параўнанні з ліставаннем Я. Брыля і А. Адамовіча, якія змаглі-такі знайсці свае творчыя

нішы сярод камуністычнага паглуму і барабаннай рыторыкі. Яна, несавецкая беларуска, да канца не здае сваіх патрыятычных пазіцый у аточаным з усіх бакоў бальшавікамі нацыянальным акопе, дзе адно чалавеку застацца, і то — пашана і гонар. «Дарагія і родныя, зусім не клапацецеся, што малая рэнта! Неяк яно будзе. Я не належу да ССБП (маецца на ўвазе Саюз савецкіх пісьменнікаў Беларусі — *рэд.*), але мне запрапанавалі напісаць заяву ў Літфонд, толькі ж я не ўмею нічога прасіць… Таксама дрэнная «Міклашоўская» натура, але што зробіш, інакшай быць не магу»...

Як заўжды таленавіта і адметна піша Леанід Дранько-Майсюк. Хоць яго аповесць «У Вільні і больш нідзе» , як на мой погляд, усё ж жанрава выцягвае на эсэ. Зрэшты вартую рэч як ні назаві — калі яна чытаецца з задавальненнем, гэта галоўнае. Праўда, у запале, даючы парады і павучаючы маладых літаратурных «неслухаў», якія ганьбяць у сваіх «сцёбных» тэкстах класікаў нацыянальнай літаратуры, аўтар, услаўляючы свайго сябра і творцу У. Някляева, называе рэдакцыю (творчы калектыў колісь элітнага часопіса) «Крыніцы» «неразумнай камандай» (гэта значыць, А. Разанава, В. Акудовіча, У. Арлова, А. Сідарэвіча, Ю. Станкевіча ды Л. Галубовіча?!), якіх Уладзімір Пракопавіч, аказваецца, «песціў і карміў з рук». Трэба ў крытычных месцах усё ж быць адэкватным спадару эстэту і ў парыве высокапарных прызнанняў не забывацца на рэчаіснасць…

Што тычыцца завяршэння публікацыі вершаванай драмы Уладзіміра Някляева «Армагедон»... Сябар паэта, Л. Дранько-Майсюк, напісаў у сваёй дарожнай аповесці, што эсэсістыка У. Някляева пра Янку Купалу і Якуба Коласа — «райскае пісьмо», а драму «Армагедон» назваў чамусьці «вымысленай невераемна», магчыма гэта намёк на пісьмо пеклавае... Уласна я спашлюся тут на нядаўняе інтэрв'ю вядомага драматурга Аляксея Дударава, які сказаў, што цяжка разумее публікацыю драматургічных тэкстаў у мастацкіх часопісах, паколькі іх трэба бачыць у сцэнічным выкананні. Такія творы — спажыва (і выпрабаванне) для рэжысёраў. Ведаючы У. Някляева як аднаго з найлепшых нашых сучасных паэтаў, маю спадзеў, што і гэтая яго рэч вартая шырокай публічнай увагі. Думаю, неўзабаве дачакаемся (у чым ён падчас сваёй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі пастаянна запэўнівае) яе пастаноўкі на галоўнай сцэне краіны. А чытаць драму, прадзіраючыся праз церні курсіўных аўтарскіх рэмарак, занадта нярвовая праца (нераўнуючы, як у прадмове аўтара, біць кошку галавой аб сцяну)... Нават для маёй не зусім тонкай натуры, таму — прабачаюся.

Два аповеды Паўла Анціпава. Прачытаў першы. Ніякага ўражання. Падалося, што чалавек наўмысна піша безгустоўна ці насамрэч не выпрацаваў уласнага стылю. Скажу, на сваю рызыку, таўталагічна і блізка да арыгінала: літаратурны стыль П. Анціпава на дадзеным этапе знаходзіцца ў фазе зацвярдзелага цэменту. Другі аповед чытаць не стаў, і, можа, дарма... Таму пакуль ад прозы гэтага маладога пісьменніка мае «вочы шырока расплюшчаныя, душу вярэдзіць непрамоўленае». Пара, аднак, Павел!

Вершы Дар'і Ліс таксама не ўразілі. Набор неўпарадкаваных слоў і вывяржэнне эмоцый… Нешта падобнае да патухаючага вулкана — астыванне гарачай лавы і выпусканне пары…

А вось Анка Упала сям-там смешная (іранічна-саркастычная, правакацыйная, калі хочаце), асабліва ў «таўтаграмах». У некаторых месцах нават запала ў сэрца. Талент неардынарны, рэдкі для беларускай літаратуры, тым больш жаночай.

Дэбют Настассі Кухарэнка атрымаўся даволі прыстойным, у сэнсе — чытэльным. Неблагая заяўка на будучае. Разняволеная ў пачуццях і стылі, але не да стыхійнай аляпаватасці і віхурнасці Валерыны Куставай. Зрэшты і тое, што яшчэ разбэрсанае, з часам упарадкуецца. Было б што, а яно ёсць:

*Дамалюю табе крылы…*
*Каб ты лётаў асцярожна,*
*Каб жыццё насіў на крылах,*
*Бо ў далонях не ўтрымаць...*

Як сабе самой.

Эсэ Віталя Тараса — пра жыццё і смерць, атэізм і веру, Бога і д'ябла… Чытаецца з цікавасцю, але складваецца ўражанне, што цытавання больш, чым уласнага. Размова вядзецца па светапогляд позняга Льва Талстога, а заадно і ўласнага бацькі (Валянціна Тараса).

Цікавыя згадкі Ванкарэма Нікіфаровіча пра паэта Уладзіміра Дубоўку («Краса ніколі не памрэ на свеце: // Тваранні дзіўныя прыносяць плён»), штрыхі да творчага партрэта мастака Сяргея Рымашэўскага Юрася Барысевіча («Не шкадую, што я мастак, мне падабаецца мець грошы з жывапісу»), калядная сцэнічная прыпавесць Галіны Каржанеўскай («Лепей шчупальцы прыняць. // Я паненка, а не…»).

Якія ж напрошваюцца высновы з усяго прачытанага? Па-першае, што не дарма траціў час. Па-другое, што вартае пераважае шараговае. Што няма абсалютна бяздарнага. Што і без публікацый жывых класікаў часопіс не страціў саліднасці. Што бракуе аналітычнай чытэльнай крытыкі. Што хацелася б палемічнасці як паміж творцамі, так і ў саміх творах. Але ёсць тое, што ёсць — літаратура. Яна такая, якой я яе прачытаў. Жадаеце прачытаць па-іншаму — вазьміце ў рукі 47-ы нумар «Дзеяслова».

ПАМЯЦЬ

# БАЛЮЧАЯ СТРАТА



М. Дзяшкевіч — апантаны экскурсавод Купалаўскага музея. З архіва аўтара.

◂ Працяг. Пачатак на стар. 19.

***

Край наш урадлівы, і быў да нядаўна густа заселеным. А тая мясціна, пра якую тут размова, асабліва: вёска на вёсцы, хата на хаце. Ад Шчорсаў пачынаюцца Краскоўскія горы, а потым Пагора, Воўстухава, Вірышча, Лясок, Заполле, якое падыходзіць пад самыя Карэлічы. Краскоўскія горы падаравалі Беларусі чалавека магутнага: слыннага для 20-х гадоў эканаміста, доктара навук, пісьменніка, аўтара выдатных апавяданняў і рамана «Драпежнікі». Але і на долю Янкі Нёманскага (Івана Андрэевіча Пятровіча) знайшліся драпежнікі. У 1937 годзе ён быў арыштаваны і асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР да выключнай меры пакарання, і расстраляны 30 кастрычніка 1937 года.

Спытаеце: за што? Ды за тое, што быў свядомым беларусам, чалавекам таленавітым, выдатным арганізатарам і займаў у дзяржаве ключавыя пасады. І хіба гэтага было недастаткова для крывавэрнага сталінскага рэжыму?!.

Таму і заходзіцца сэрца шчымлівым болем, калі праязджаеш міма родных вёсак, якія ўсё больш абязлюджваюцца, дэмаралізуюцца і на вачах паміраюць...

Трагічны зыход з жыцця Міколы Дзяшкевіча стаўся балючай64 стратай для ўсёй нашай культуры. І маім асабістым болем таксама. Магло б, вядома, усяк скласціся, але падобнага на Міколу, роднасnага мне па поглядах, па разуменню свайго абавязку перад жыццём, маральна чыстага і па-грамадзянску мужнага сярод землякоў сустрэць не надарылася. А мо і ўвогуле. Мы душа ў душу жылі і сябравалі з Рыгорам Семашкевічам, але і яго ў маладым веку напаткаў трагічны лёс. Такім людзям, такім сябрам замены няма…

Я ўдзячны лёсу і асабіста светлай душы і яснага розуму чалавеку Міхалу Фёдаравічу Дубянецкаму, што ён падгаварыў мяне перайсці з Інстытута літаратуры АН БССР на працу ў выдавецтва «Мастацкая літаратура» і даў магчымасць, як загадчыку рэдакцыі крытыкі і драматургіі, выдаць каля сотні кніг, патрэбных нашаму нацыянальнаму Адраджэнню. І ён, і галоўны рэдактар выдавецтва Серафім Андраюк з поўным разуменнем паставіліся да маёй прапановы выдаць лепшае са спадчыны Міколы Дзяшкевіча разам з успамінамі пра яго блізкіх сяброў. У выніку быў складзены і выдадзены ў 1991 годзе томік «Ад вытокаў радаводных» — своеасаблівы вянок на магілу Міколы Дзяшкевіча, якая ў яго родным Пагоры.

**P. S.** Гэты тэкст быў напісаны ў 2007 годзе — для Міколы Дзяшкевіча юбілейным. 11 траўня 2007-га яму споўнілася б 60 гадоў. Можна толькі ўяўляць, чаго ён мог дасягнуць за непражыты час. І пакінуў ён гэтае жыццё на высокай ноце, ратуючы ад смерці іншых. Дык няўжо мы не павінны схіляць галаву перад ягонай светлай памяццю? Памятаюць родныя і шануюць гэтую памяць. Але такія, як Мікола, належалі не толькі сваёй сям'і, але і Беларусі...

Аднак артыкул, прымеркаваны да 60-годдзя Міколы, «адляжаўшыся» ў дзяржаўным выданні (часопіс «Маладосць»), публікуецца ўпершыню — аж праз тры з гакам гады.

У нас шмат гаворыцца і пішацца пра выхаванне моладзі, і нават дзеля гэтага створаны шматтысячныя моладзевыя структуры. Але, часцей, усё абмяжоўваецца дэкларацыямі, нібыта высокімі, але насамрэч пустымі словамі. А такія рэальныя ўзоры і прыклады высокага грамадзянскага абавязку, высакародналсці і маральнай чысціні, незвычайнай працавітасці, што былі праз усё кароткае жыццё ўласцівы Міколу Дзяшкевічу, застаюцца неасэнсаванымі і ў сапраўды выхаваўчых мэтах не скарыстанымі. Наколькі мне вядома, ні ў Дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, да якога раней належаў бібліятэчны факультэт, ні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, дзе ён цяпер функцыянуе, няма абсалютна ніякіх слядоў і адзнак, што тут навучаўся Мікола Дзяшкевіч… Нічога не зроблена для ўшанавання светлай памяці земляка і на мясцовым узроўні. Мо з-за таго, што ён нібы застаўся на памежжы дзвюх ВНУ, Навагрудскага і Карэліцкага раёнаў, а Воўстухаўскай дзесяцігодкі ўвогуле не існуе: купка пагорскіх дзяцей ходзяць вучыцца ў Запольскую СШ. І чалавек нібы загубіўся ва ўсіх гэтых пертурбацыях…

Аднак закончыць мне хочацца на больш светлай аптымістычнай ноце, звязанай з працягам роду, шанаваннем маральных і духоўных каштоўнасцяў, якія спавядаў і адстойваў Мікола, няхай сабе і на больш вузкім, але насамрэч вельмі важным, бо яны мацуюць трывалы грунт жыцця. Звяртаюся да ўспамінаў найбліжэйшага сябра Міколавай маладосці артыста Алеся Лабанка, на жаль, ужо таксама нябожчыка:

«Мікола размаўляў па-руску, па-польску, па-беларуску, і адно дома ён гаварыў толькі па-свойму: «Калі ласачка, тато, мамо». А якая шчырасць была ў тых словах, якая дабрыня і ласка!.. І колькі там было слоў, якія ўжо павыкарчоўвалі з нашай памяці і з нашай свядомасці! Адтуль, з дому, як я разумею, былі і яго душэўная дабрыня і нейкая безабаронная даверлівасць».

А вось сведчанне Уладзіміра Содаля:

«Апошняя мая сустрэча з Міколам была на плошчы Перамогі. Мікола быў у адпачынку і збіраўся ехаць у вёску да бацькоў. Гаварылі мы з ім падчас той сустрэчы шмат пра што. Раіўся, як зрабіць, каб яго дачушка аднолькава прыгожа размаўляла з маленства на беларускай і рускай мовах».

Ад той пары мінула 36 гадоў. Міколава дачка Ірынка, слава Богу, вырасла, выгадавалася, вывучылася, набыла вышэйшую адукацыю інжынера, закончыўшы Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

З Ірынай Мікалаеўнай я нядаўна ўпершыню размаўляў па тэлефоне і ціха, моўчкі радаваўся, што яна свабодна валодае нашай роднай мовай, мовай яе пагорскіх дзядоў і свайго бацькі, які рупіўся не толькі пра сваю сям'ю, але і каб жыла Беларусь.

▸ СУСТРЭЧЫ

# «ПАПУЛЯРНАЯ МУЗЫКА З ВІТУЛЫ» Ў МІНСКУ

**Пасольства Каралеўства Швецыя ў Беларусі сумесна з Цэнтрам шведскіх даследаванняў правяло прэзентацыю беларускага перакладу рамана шведскага пісьменніка Мікаэля Ніемі «Папулярная музыка з Вітулы». Яна адбылася 20 кастрычніка ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ.**

Раман Мікаэля Ніемі «Папулярная музыка з Вітулы» выйшаў у Швецыі ў 2000 годзе. Яго першапачатковы наклад складаў 4000 асобнікаў, праўда, сам пісьменнік лічыў, што такая колькасць была залішняй. Але кніга адразу зрабілася бестсэлерам, і на дадзены момант у Швецыі прададзена ўжо больш за 800 000 асобнікаў. Акрамя таго, раман быў перакладзены на 25 моваў свету. Па-беларуску ж «Папулярную музыку з Вітулы» перастварыла Вольга Цвірка.

Чытач трапляе ў 1960-70-ыя гады, у маленькі паўночны гарадок Паяла на мяжы Швецыі і Фінляндыі. Тут асфальтуюць дарогі, адмірае сямейнае земляробства і ў жыццё гарадка ўрываецца рок-н-рол. Аднак старэйшае пакаленне супрацівіцца навоўвядзенням, адцягваючы ўваход сваёй мясцовасці ў сучаснасць. Галоўныя героі рамана — Мацці і яго сябар Нііла — мараць зусім аб іншым жыцці, аб тым, якое магчыма толькі па-за межамі іх роднай Паялы…

У прэзентацыі ўзялі ўдзел аўтар рамана — папулярны шведскі пісьменнік , а таксама Уладзімір Арлоў, Валянцін Акудовіч ды амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан. Хіт-майстрам і вядучым імпрэзы быў Віктар Шалкевіч.

Мікаэль Ніемі быў госцем і Саюза беларускіх пісьменнікаў, на сядзібе якога адбылася дзвюхгадзінная сустрэча-гаворка шведскага празаіка з кіраўніцтвам СБП.

**Н.К.**

▸ ПРЭМІІ

# АНГЕЛЬСКІ «БУКЕР-2010»

**12 кастрычніка 68-гадовы брытанскі пісьменнік і журналіст Говард Джэйкабсон (Howard Jacobson) стаў уладальнікам Букераўскай прэміі за кнігу «Пытанне Фінклера» — камедыйны раман пра двух сяброў і сутнасць ангельскага габрэйства.**



Фота «Парк культуры»

Говард Джэйкабсон ужо двойчы мог атрымаць гэтую самую прэстыжную ўзнагароду ў брытанскім літаратурным свеце: у 2002-м яго раман «Ночы Калукі» быў сярод лаўрэатаў Букераўскай прэміі, а ў 2006-м туды ж патрапіў яго раман «Хто шкадуе».

Нават брытанскія букмекерскія канторы не чакалі, што гэтым разам Говарду Джэйкабсону нарэшце пашанцуе...

Пасля цырымоніі ўзнагароджання, якая па традыцыі прайшла ў цырыманіяльнай ратушы лонданскага Гілдхола, лаўрэат прызнаўся, што быў абсалютна спакойным з моманту вылучэння ў доўгі спіс намінантаў: «Мяне з дзяцінства выхоўвалі нічога не чакаць».

Смешны і адначасова журботны раман «Пытанне Фінклера» Говарда Джэйкабсона распавядае аб сустрэчы Джуліана Трэслава, былога прадзюсара BBC, і папулярнага габрэйскага філосафа Сэма Фінклера з іх настаўнікам Лайборам Севікам. Яны збіраюцца ў адзін з вечароў разам і аддаюцца ўспамінам аб мінулым. Адказваючы на пытанне, як атрымалася змясціць трагедыйныя ноткі ў камедыйным рамане, пісьменнік адзначыў: «Я смешны, таму што журботны».

На думку пераможцы, «Пытанне Фінклера» — яго самая лепшая і самая дарослая кніга на сённяшні дзень.

Пераможца Букераўскай прэміі-2010 Говард Джэйкабсон стаў багацейшым на 50 тысячаў фунтаў стэрлінгаў (такі прызавы фонд прэміі) і ў столькі ж разоў вядомей: вячэрняя цырымонія ўзнагароджвання транслявалася ў прамым эфіры па BBC. Ужо на наступны дзень продаж рамана «Пытанне Фінклера», за які ён атрымаў прэмію, павялічыўся на сотні разоў. Кніга перамясцілася з «топ-100» самых прадаваных кніг адразу ж на другую пазіцыю, саступаючы толькі кулінарнай кнізе Джэймса Олівера.

Сам Джэйкабсон прызнаўся, што вельмі рады атрыманню Букераўскай прэміі: яна абяцае прынесці яму не толькі прызнанне, але і новых чытачоў. «Я пішу ўжо трыццаць гадоў. Але многія адкрылі мяне (як пісьменніка) толькі цяпер. Я хачу, каб людзі мяне чыталі, — сказаў Говард. — Мне так надакучыла, што мяне завуць недаацэненым пісьменнікам».

На пытанне аб тым, як ён плануе выдаткаваць прызавы фонд, лаўрэат адказаў не задумваючыся: «На сумачку для сваёй жонкі».

«Усю суму?» — паспрабаваў удакладніць адзін з журналістаў. У адказ пісьменнік пайранізаваў: «А вы ведаеце, якія цяпер кошты?» І дадаў: «І на пару туфляў, калі застанецца грошы. Для маёй жонкі, натуральна».

Жонка Говарда Джэйкабсона, элегантная Джэніі, прысутнічала на цырымоніі ўручэння «Букера» і клапацілася, каб муж бездакорна выглядаў падчас начных інтэрв'ю перад аб'ектывамі камераў. Давядаўшыся, на што будуць выдаткаваны 50 тысячаў фунтаў стэрлінгаў (каля 75 тысячаў даляраў ЗША), яна толькі ўсміхнулася, сцінуўшы серабрыстую сумачку, з якой прыйшла на прыём.

Говард Джэйкабсон ужо мае планы на будучыню, хоць і жартоўныя: з моманту вылучэння ў кароткі спіс намінантаў Говард сур'ёзна задумаўся аб тым, каб напісаць кнігу, у якой бы распавядалася аб перажываннях пісьменніка ў чаканні ўзнагароды...

**Наталля МІХАЙЛАВА**

# РАСІЙСКІ «БУКЕР»

**Абвешчаны шорт-ліст літаратурнай прэміі «Расійскі букер».**




За званне лепшага рамана на расійскай мове будуць змагацца Алег Зайанчкоўскі («Шчасце магчымае»), Андрэй Іваноў («Вандраванне Ханумана на Лолланд»), Алена Калядзіна («Кветкавы крыж»), Марыам Петрасян («Дом, у якім…»), Герман Садулаеў («Шалінскі рэйд») і Маргарыта Хэмлін («Клоцвог»).

Ураджэнка Ерэвана Марыам Петрасян працавала мультыплікатарам на «Арменфільме» і «Саюзмультфільме», а яе раман-фэнтэзі пра інтэрнат для дзяцей-інвалідаў «Дом, у якім…» ужо атрымаў «Расійскую прэмію» ў намінацыі «Буйная проза».

Алег Зайанчкоўскі ў спісах «Расійскага Букера» не пачатковец: яго першая кніга «Сяргееў і гарадок» патрапіла ў шорт-ліст, а «Пятровіч» — у доўгі спіс прэміі. «Шчасце магчымае» — раман пра пісьменніка, які добра разбіраецца ў чужых лёсах, але заблытаўся ў сваім уласным.

Кніга Андрэя Іванова — прыгоды расійскага эстонца і індуса, якія ўцяклі ў Данію і жывуць у лагеры для ўцекачоў.

«Кветкавы крыж» Алены Калядзінай выйшаў у часопісе «Вологодская литература»: у цэнтры яго сюжэту святар айцец Логін, які спачатку навучае вернікаў абагаўляць мясцовую прыгажуню Феадоссю, а потым вінаваціць яе ў вядзьмарстве.

«Шалінскі рэйд» Германа Садулаева — спроба асэнсавання чачэнскай вайны. У «Клоцвоге» Маргарыты Хэмлін таксама прысутнічае вайна, але толькі мімаходзь. Гераіня рамана, знаходлівая габрэйка-ўкраінка, якая перажыла ў дзяцінстве Другую сусветную, ператварылася ў авантурніцу, якая маніпулюе чужымі жыццямі ды «круціць» мужчынамі.

У конкурсе прымалі ўдзел літаратурныя творы, апублікаваныя ў перыяд з 16 чэрвеня 2009 года па 15 чэрвеня 2010-га.

Сваіх намінантаў вылучылі 47 выдавецтваў, 9 часопісаў, 4 універсітэты і 11 бібліятэк.

Усяго на конкурс было пададзена 95 твораў, з якіх сфармавалі доўгі спіс у 24 пазіцыі. Журы, у якое ўвайшлі крытыкі Марыя Рэмізава і Марына Абашава з Пярмі, пісьменнік Валерый Папоў з Санкт-Пецярбурга і рэжысёр Вадзім Абдрашытаў, узначаліў празаік Руслан Кірэеў.

Аб'яўляючы ў ліпені доўгі спіс «Расійскага Букера», Кірэеў адзначыў: «Тэксты розныя, але асабліва выразна прагладаюцца дзве тэндэнцыі: аўтабіяграфічная проза, сучасныя варыяцыі «Былого и дум», і проза, якая адлюстроўвае рэальнасць апасродкавана, ствараючы новую, шмат у чым умоўную рэальнасць, — варыяцыі «Гісторыі аднаго горада» Салтыкова-Шчадрына. Якая тэндэнцыя пераможа? У Шчадрына перамагла першая: свой творчы шлях ён скончыў «Пашахонскай даўнінай». Паглядзім, што будзе ў нас».

У пералік фіналістаў прэміі не ўвайшлі такія знакамітыя прадстаўнікі лонг-ліста, як Дзіна Лала, Андрэй Аствацатураў, Цімур Кібіраў і Віктар Пялевін.

Кожны намінант букераўскага шорт-ліста атрымае 60 тысячаў расійскіх рублёў (каля 20 тысячаў даляраў ЗША). А пераможцу дастанецца грашовы прыз, які сёлета вырас і складае 600 тысячаў расійскіх рублёў — у два з паловай разы больш, чым ангельскі «прататып».

У розныя часы «Расійскім Букерам» ганараваліся Булат Акуджава, Людміла Уліцкая і Уладзімір Маканін, а ў мінулым годзе прэмію атрымаў раман Алены Чыжовай «Час жанчын». Імя лаўрэата гэтага года будзе абвешчанае ў пачатку снежня.

«Расійскі Букер» будзе прысуджацца ў 19-ы раз.

▸ КОНКУРС

# ТВОРЫ ПРА ЖАНЧЫНУ

**Паважаныя сябры!**

**ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» завяршае конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.**

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве» чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а таксама семінары і майстар-класы з удзелам вядомых беларускіх і замежных пісьменнікаў!

Вы маеце апошні шанец да 5 лістапада г.г. даслаць свае творы на адрасы: паштовы – 220112, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, д.31, п.906 (сядзіба СБП); электронны — sbp@tut.by.



**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

▸ АКЦЫЯ

# БУДЗЬМА З БЫКАВЫМ!

Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў і Рэдакцыйная калегія Поўнага збора твораў народнага пісьменніка Беларусі Васіля БЫКАВА запрашаюць актывістаў беларускага мастацкага слова і грамадскіх распаўсюднікаў з Мінска і рэгіёнаў Беларусі да супрацы.

Мы хочам з вашай шчырай дапамогай прадоўжыць бясплатную перадачу ў бібліятэкі нашай краіны (гарадскія, раённыя, універсітэцкія, школьныя) 8 тамоў прозы нацыянальнага класіка, якія выйшлі ў свет (наступныя тамы ў стадыі падрыхтоўкі).



Будзьма з праўдзівым і прароцкім словам Васіля Быкава!

Даведкі па гарадскім тэлефоне ў Мінску: 200-80-91.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 5 ЛІСТАПАДА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.45, 18.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.35** Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна).
**11.25** Відэафільм АТН «Легенды святога возера» цыклу «Зямля беларуская».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Лірычная камедыя «Сёмы пялёстак» (Украіна).
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Токшоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Хранікальна-дакументальны фільм цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Прэм'ера. Фантастычная камедыя «Мая супербылая» (ЗША).
**00.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**00.50** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**01.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Фільм «Няскончаная аповесць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Музычная камедыя «Вясёлыя рабяты».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Фільм «Белае сонца пустэльні».
**15.00** «Алег Табакоў. Здабытак рэспублікі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Юбілейны вечар «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здабытак Рэспублікі: Юры Антонаў».
**23.40** «Наша Белараша».
**00.15** Фільм «Тры гісторыі».
**02.15** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Маўчы ў анучку». Вялікабрытанія, 2005 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.

**00.10** Фільм «Жан-Клод Ван Дам». Францыя-Бельгія-Люксембург, 2008 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія). 5-я серыя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Казка «Восеньскі падарунак фей» («Беларусьфільм»).
**12.00** Дакументальны фільм «Папая» (Беларускае тэлебачанне).
**12.25** Кіныспробы.
**12.45** Жывы гук.
**13.25** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.25** Мультсерыял «Драконочак і яго сябры» (Канада).
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**14.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія). 5-я серыя.
**16.50** Усё аб бяспецы.
**17.20** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.25** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**20.45** «Калыханка».
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.05** «Пра мастацтва».
**23.35** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд матчаў 4-га тура.
**01.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Цырк».
**08.40** Мультфільмы.
**09.20** Фільм «Не страляйце ў белых лебедзяў». 2-я серыя.
**10.35** Фільм «Кандагар». 2010 г.
**12.30** Прэм'ера. «Каралі лёду».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «4 таксісты і сабака - 2». 2006 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Прэм'ера. «Вялікая сям'я. Крутыя».
**18.45** «Пакой смеху».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.25** Фільм «Стылягі». 2008 г.
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** Юбілейны вечар на «Новай хвалі».

### НТВ

**06.10** Драма «Каліна чырвоная».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Мама ў вялікім горадзе».
**08.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.20** Маладзевы серыял «Барвіха».
**15.05** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**16.00** Сёння.
**16.20** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**18.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** Прэм'ера. «Музычны рынг НТБ».
**23.30** Драма «Шлюб».

### EUROSPORT

**09.30** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Дзень 5-ы.
**11.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**12.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Дзень 6-ы.
**15.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Іспаніі (Барселона). Марафон. Мужчыны.
**16.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**17.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Дзень 6-ы.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Боўлінг. РВА тур. ЗША.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый (Бухарэст, Румынія).
**22.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.00** Покер. Турнір Партуш (Каны, Францыя).
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.15** Вось дык так!!!
**00.30** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Дзень 6-ы.
**02.00** Кіберспорт. Турнір Extreme Masters (Шанхай, Кітай).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабісты капітал.
**08.05** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**08.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**09.00** Хто ёсць кім?: Юрый Хадыка.
**09.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**09.25** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Перу, Амазонія, 1973».
**09.50** «Зорны пірат», серыял: 4 серыя.
**10.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 5 серыя.
**11.00** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 13 серыя.
**11.45** «Кропачка і Антон», маст. фільм, 1999 г., Германія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 5 серыя.
**18.20** «Бульбаны», мультсерыял: «Лячэнне голадам».
**18.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Параненыя», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**19.00** Маю правa (прававвая праграма).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Крывавыя карыкатуры», 2007 г., Данія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Дырыжор», маст. фільм, 1979 г., Польшча.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Аператарка».
**23.55** Аб'ектыў.

## 6 ЛІСТАПАДА, СУБОТА

### 1

**06.40** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.05** Існасць.
**07.30** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.20** «Аўташкола».
**11.05** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**12.10** Камедыя « Дыяментавая рука» (СССР).
**14.10** Відэафільм АТН «Кропка адліку. Пагляд за кулісы».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Nota Bene.
**17.10** Дакументальны серыял «Гараджане»: Заграб» (Харватыя)».
**17.40** Відэафільм АТН «Высокія ноты Ляхавіцкай шляхты» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.50** Відэафільм АТН «Дзеці Еўрабачання».
**22.15** Урачыстае адкрыццё Мінскага міжнароднага кінафэсту «Лістапад-2010».
**23.10** Прэм'ера. Меладрама «Інсайт».
**00.50** Дзень спорту.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** Камедыя «Формула кахання».
**13.45** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Народжаныя рэвалюцыяй».
**17.20** «Тур дэ Франс».
**18.15** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.15** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка-5».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Беларусь — гэта мы!».
**00.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.40** Прыгодніцкі фільм «Міраж».

### СТВ

**06.30** Фільм «Васёк Трубачоў і яго таварышы». СССР, 1955 г.
**07.50** Фільм «Маўчы ў анучку». Вялікабрытанія, 2005 г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** Прэм'ера! «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Гары, гары, мая зорка». СССР, 1969 г.
**15.35** «Дарагая перадача».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Вялікі горад».
**17.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Мінск»-»Шахцёр» (Салігорск). Прамая трансляцыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Зброевы барон». ЗША-Францыя, 2005 г.
**23.45** Фільм «Калібр 45». ЗША, 2006 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.20** Усё аб бяспецы.
**07.50** «Рэальны свет».
**08.25** Дыялогі аб рыбалцы.
**08.55** Жансавет.
**09.40** Ваенна-прыгодніцкі серыял «Апошні бронецягнік» (Беларусь-Расія). 1-я - 4-я, заключная, серыі.
**13.40** Тэлебарометр.
**13.45** «Запал па культуры».
**14.25** Міжнародны фэст Юрыя Башмета. Частка 1-я.
**15.45** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Бірмінгем - Вэст Хэм. Прамая трансляцыя.
**18.55** Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.15** Жывы гук.
**00.00** Маладзевая камедыя «Бландынка з амбіцыямі» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** Фільм «Формула кахання».
**09.05** «Каралі лёду».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Меладрама «Дзённы цягнік».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Здабытак рэспублікі».
**14.35** «Нататкі натураліста».
**15.05** «Пакой смеху».
**16.05** Фільм «Чакаю і спадзяюся». 1-я серыя.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**18.00** «Суботні вечар».
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.25** Тэлефільм «Пажар». 2010 г.
**23.00** Камедыя «Чалавек з бульвара КапуцынаК». 2009 г.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Агляд».
**08.50** «Авіятары».
**09.25** «Жывуць жа людзі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**16.00** Сёння.
**16.20** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**19.00** Сёння.
**19.30** Фільм «Адстаўнік».
**21.20** Вострасюжэтны фільм «Адстаўнік -2».
**23.10** Прэм'ера. Камедыя «Дзікая штучка».
**00.55** Фільм «Начны слухач».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**09.40** «Спартовае вандраванне». Часопіс.
**09.45** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Дзень 6-ы.
**11.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**12.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.
**14.00** Марафон (Берлін, Германія).
**15.30** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 2-і.
**16.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**17.00** Фехтаванне. Чэмпіянат свету ў Францыі (Парыж). Індывідуальныя спаборніцтвы. Шабля. Прамая трансляцыя.
**18.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі. Фіналы.
**20.00** Снукер. Мастэрс у Кітаі (Шанхай). Фінал.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Human Fight Night.
**23.30** Кікбоксінг. Сусветная серыя (Амстэрдам, Нідэрланды).
**01.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Невядомая Беларусь: «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**08.35** Маю правa (прававвая праграма).
**08.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Параненыя», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**09.30** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**10.00** Калыханка для самых маленькіх.
**10.35** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Крывавыя карыкатуры», 2007 г., Данія.
**11.30** «Дырыжор», маст. фільм, 1979 г., Польшча.
**13.05** «100 хвілін вакацыяў», серыял.
**14.25** Маю правa (прававвая праграма).
**14.45** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Прашу галасаваць за мяне».
**15.40** Героі не нашага часу: Уладзімір Парфяновіч: Звычка перамагаць.
**16.05** «Ранча», серыял: 1 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.00** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.10** Вагон.
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** Навігатар.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Адна рука не пляскае», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Малы сабака».
**23.05** Аб'ектыў.

## 7 лістапада, нядзеля

**07.05** Дзень спорту.
**07.15** Камедыя «Вясёлыя рабяты» (СССР).
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.15** Героіка- прыгодніцкі фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (СССР).
**13.05** Героіка-прыгодніцкі фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (СССР).
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.00** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Каханне Аўроры « (Украіна).
**17.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Печкі-лавачкі».
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** «Лістапад-2010». Дзённік.
**23.15** Камедыя «Вясельная вечарынка» (ЗША-Германія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**10.00** «Шалапутныя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.20** «Фазэнда».
**11.55** «Ранішняя пошта».
**12.30** Камедыя «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка».
**14.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**17.30** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: ток-шоў «Кухня».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**22.15** Прэм'ера. Праект «Якія нашы гады!».
**23.40** Прэм'ера. «Легенды Рэтра FM».

**06.00** Фільм «Нахалёнак». СССР, 1961 г.
**06.55** Фільм «Зброевы барон». ЗША-Францыя, 2005 г.
**09.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх». СССР, 1974 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «У адзін бок». Германія, 2006 г.
**22.50** СТБ прадстаўляе: Алег Молчан запрашае сяброў.
**00.45** Фільм «Кантроль». ЗША-Японія-Вялікабрытанія-Аўстралія, 2007 г.
**02.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**06.35** Дабравест.
**07.00** Мір вашай хаце.
**07.15** Героіка-прыгодніцкі фільм «Зялёны фургон» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**09.45** Медычныя таямніцы.
**10.25** Школа рамонту.
**11.35** Тэлебарометр.
**11.40** Бухта капітанаў.
**12.20** Кінаспробы.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Міжнародны фэст Юрыя Башмета. Частка 2-я.
**15.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.00** Прыгодніцкая камедыя «Белае сонца пустэльні» (СССР).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ліверпуль - Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**19.55** Смешная часіна.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.40** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія - ЗША).
**23.15** Культасвет.

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Фільм «Малахольная». 2009 г.
**09.00** Камедыя «Чалавек з бульвара КапуцынаК». 2009 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Стрэлы Робін Гуда».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Фільм «Дарагі мой чалавек».
**16.45** Фільм «Чакаю і спадзяюся». 2-я серыя.
**18.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі.
**20.25** Тэлефільм «Пажар». 2010 г.
**23.00** Фільм «Дні Турбіных».

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**11.00** «І зноў добры дзень!». Спецвыпуск.
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**16.00** Сёння.
**16.20** Вострасюжэтны серыял «Псеўданім «Албанец».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. «Марскія д'яблы».
**23.25** «Інвестыцыі ў рэвалюцыю».
**00.15** «Футбольная ноч».
**00.50** «Асабліва небяспечны!».

**09.30** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**09.35** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**10.00** Аўтаспорт. Азіяцкая серыя Ле Ман у Кітаі (Чжухай). Прамая трансляцыя.
**12.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). «Залаты этап».
**12.55** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**13.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.
**15.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). «Залаты этап». Прамая трансляцыя.
**15.55** Марафон (Нью-Йорк, ЗША). Прамая трансляцыя.
**19.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.
**21.00** Бокс. Міжнародны турнір у ЗША.
**22.30** Марафон (Нью-Йорк, ЗША).
**23.30** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). Агляд.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Кіпр). «Залаты этап».
**01.00** Матаспорт па выходных.
**01.15** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету ў Новай Зеландыі (Лэйк-Карапіра). Фіналы.
**02.15** Матаспорт па выходных.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавацая праграма): «Альгерд».
**08.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.25** Навігатар.
**08.45** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Праблема з камарамі ды іншыя гісторыі», дак. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.50** Калыханка для самых маленькіх.
**10.20** «Арол: крымінальная сага», серыял: 7 серыя.
**11.20** «Адна рука не пляскае», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**13.10** «Тры шалёныя нулі», серыял: 1–3 серыі.
**14.35** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**14.50** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**15.45** «Мой свет нарадзіўся ў кузні», рэпартаж, 2008 г., Беларусь.
**16.05** «Ранча», серыял: 2 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.40** «Час гонару», серыял: 2 серыя.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавацая праграма).
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнавацая праграма): «Перу, Амазонія, 1973», ч. 2.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** «Савецкая гісторыя», дак. фільм, 2008 г., Латвія.
**21.55** Фільматэка майстроў: «На злом галавы», маст. фільм, 2004 г., Германія–Турцыя.
**00.55** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Будзьце ўважлівымі: змяніліся нашы рэквізіты ў банку і адрас рэдакцыі. Рахунак: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**
**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Всего ________

Кассир

Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ЦЕНЬ КАРАЛЕЎСТВА РУКЮ

Іван БІЧ

**У цэнтры цяперашняга японска-кітайскага канфлікту нечакана апынулася гісторыя маленькай астраўной дзяржавы, якой даўно няма на карце свету.**

Увесь сыр-бор распачаўся з-за архіпелага Сенкаку ў Японскім моры. Сітуацыя вакол спрэчных выспаў зноў абвастрылася пасля таго, як Кітай напрыканцы мінулага тыдня накіраваў туды патрульныя караблі. У адказ Токіа выказаў Пекіну дыпламатычны пратэст. З таго часу ў абедзвюх краінах не спыняюцца дэманстрацыі, удзельнікі якіх патрабуюць ад сваіх урадаў не ісці на саступкі ў тэрытарыяльным канфлікце. У падмацаванне пазіцыі свайго ўрада кітайскія навукоўцы нечакана заявілі, што Токіа незаконна анексавала густанаселены востраў Акінава. Як паведамляе інтэрнэт-выданне «Asia Times», прэтэнзіі на гэты востраў «выказалі ўплывовыя сілы ў КНР». Іх аргументы змешчаны ў апошніх артыкулах некалькіх кітайскіх гісторыкаў. Галоўны тэзіс навукоўцаў: пытанне пра тое, каму належыць Акінава, не ўрэгулявана. Да 1879 года востраў уваходзіў у склад каралеўства Рукю, якое было васалам Пекіна. Але Японія ліквідавала гэтую дзяржаву і далучыла Акінаву да сябе. Кітайская імперыя Цын, аднак, не давала на гэта прыяднанне згоды.




Гістарычныя прарывы кітайскіх гісторыкаў сталі вядомыя ўдзельнікам апошніх антыяпонскіх дэманстрацый у КНР. Яны неслі плакаты: «Аднавіце дзяржаву Рукю! Вызваліце Акінаву!» Так нечакана ў Японіі набыла актуальнасць гісторыя Рукю і праблема этнічных меншасцяў, што жывуць у краіне (рукюкцы — асобны народ). У Японіі пражываюць тры вялікія этнічных групы. Але ні адна з іх не з'яўляецца суб'ектам японскага права. Канстытуцыя прызнае адзіную нацыю — японцаў. Сваю дзяржаўнасць мелі толькі рукюкцы. Іх дзяржава паўстала ў XIV стагоддзі, калі аб'ядналіся тры асноўныя кланы на востраве Акінава. Дзяржава была ўпісаная ў сістэму міжнародных адносінаў. Існавала свая дынастыя, якая мела ўсе атрыбуты дзяржаўнасці, пачынаючы ад сцяга і заканчваючы судовай сістэмай.

У імператарскім Кітаі суседнія дзяржавы лічыліся варварскімі. І калі іх амбасадары прыязджалі ў Паднябесную, яны былі змушаныя прымаць гэту канцэпцыю — падавалі імператару дарункі ці плацілі яму даніну. Гэта, як прызнаюць спецыялісты, можа служыць пацвярджэннем васальнай залежнасці. З іншага боку, самі рукюкцы былі не супраць такога падыходу. Пекін перадаў ім як васалам права гандлю паміж Кітаем і іншымі варварамі. Дзякуючы такой акалічнасці Акінава стала ключавым вузлом марскіх камунікацый у рэгіёне. Неўзабаве, аднак, яе пазіцыі былі падарваны прыходам еўрапейцаў і японскай акупацыяй. У выніку востраў захаваў фармальную незалежнасць, аднак фактычна ён перайшоў пад пратэктарат Японіі. Былі толькі ўсталяваны законы, скіраваныя на эканамічную ізаляцыю Акінавы. Абарыгенам забаранялася насіць японскія імёны і нават вывучаць японскую мову. У сваю чаргу, японцам патрабаваўся адмысловы дазвол на наведванне Рукю. Прыход заходнікаў даў штуршок развіццю баявых мастацтваў, бо японцы забаранілі мясцоваму насельніцтву мець зброю. У выніку тэхніка самаабароны набыла шырокую папулярнасць.

З пачаткам эпохі Мэйдзі (перыяд мадэрнізацыі Японіі) падыходы японцаў да Рукю былі перагледжаны. Рукюкцы атрымалі японскія імёны і пашпарты. Адначасова ў Токіа з'явіўся лозунг —ператварыць жыхароў новай прэфектуры ў сапраўдных японцаў. У даволі кароткі час, найперш за кошт агульнай сістэмы адукацыі, былая Рукю палітычна і эканамічна інтэгравалася ў японскае грамадства. З іншага боку, гэты працэс не пайшоў так далёка, як на Хакайда, дзе мова айну ў выніку падобнай палітыкі практычна знікла.

Тым часам пачалася другая сусветная вайна. У 1944 годзе тут высадзіўся амерыканскі дэсант. Баі за выспу прывялі да масавых ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. З тых часоў пацыфізм стаў важнай часткай мясцовай палітычнай культуры. Гэтаму паспрыяла і паваенная сітуацыя. Нават пасля капітуляцыі Японіі амерыканцы не сышлі. Акінава, якая на паперы заставалася часткай Японіі, часова была выведзена з-пад японскай юрысдыкцыі і ператварылася ў велізарную амерыканскую базу, якая займала дзясятую частку выспы.

Пасля вайны амерыканская адміністрацыя спрабавала ініцыяваць сепаратысцкі рух. Існавала ідэя ператварэння Акінавы ў галоўную стаўку Чанкайшы для барацьбы з кітайскімі камуністамі. Для таго, каб заспакоіць міжнародную грамадскасць, Акінава не павінна была знаходзіцца на тэрыторыі Японіі. Аднак прапаганда сепаратызму выклікала дзіўную рэакцыю насельніцтва. Людзі настолькі баяліся новай вайны, што літаральна маліліся на Японію. Лічылася, што вяртанне сюды японскай цэнтральнай адміністрацыі паскорыць вывад амерыканскай вайсковай інфраструктуры.

Казаць пра незалежнасць пачалі толькі тады, калі Акінаву ў 1970 годзе падпарадкавалі Токіа. У тым жа годзе ўзнікла Партыя незалежнасці Рукю. Але яе лідэры ў сотую гадавіну ліквідацыі каралеўства Рукю (1979 год) урачыста распусцілі партыю. Рух адрадзіўся толькі напачатку гэтага стагоддзя і пакуль што дынамічна развіваецца. Асноўныя лозунгі прыхільнікаў незалежнай Рукю наступныя: стварэнне дзяржавы Акінава з нейтральным міжнародным статусам, сістэмай прагрэсіўнага падаткаабкладання, сістэмай экалагічнага кантролю, вывучэннем у школах гісторыі Акінавы. Цікава, што партыя патрабуе ўключыць у склад незалежнай Акінавы групу выспаў, якія зараз уваходзяць у склад КНР.

У 1996 годзе на востраве было праведзена апытанне наконт стаўлення насельніцтва да магчымага аднаўлення незалежнасці Рукю. Супраць выказалася 57 працэнтаў апытаных, 20 працэнтаў падтрымалі незалежнасць, але з умовай, што сама Японія «адпусціць» востраў.

Напал рытарыкі вакол каралеўства Рукю падае нацыяналістам нядрэнны шанец прыцягнуць цікавасць грамадства да гісторыі свайго рэгіёна і мясцовых традыцый дзяржаўнасці. Невядома, ці атрымаецца гэта, але сітуацыя, прынамсі, ужо не будзе такой, як была. Пазіцыя афіцыйнага Пекіна настолькі ўстрывожыла японскую публіку, што газеты загаварылі пра неабходнасць захавання амерыканскай вайсковай прысутнасці на Акінаве.



КНР пагражае Японіі жорсткімі мерамі з-за інцыдэнту каля Сенкаку

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Цікавасць да цяперашніх выбараў у Беларусі звязана не толькі з тым, што беларускі лідэр кіруе краінай 16 гадоў і мае намер і далей захаваць сваю пасаду. Аснова інтрыгі вакол выбарчай кампаніі — складаная эканамічная і палітычная сітуацыя, у якую паставіла краіну Расія. Павялічыўшы кошт энерганосьбітаў, нядаўняя саюзніца стварыла эканамічныя праблемы. Паабяцаўшы строга падысці да ацэнкі выбараў, Расія наблізіла перспектыву поўнай нелегітымнасці Лукашэнкі. А развязаўшы інфармацыйную вайну, пазбавіла яго маральнай падтрымкі. Лукашэнка ўжо паўгода вядзе ўскосную агітацыю — былі беспрэцэдэнтна падвышаны пенсіі і зарплаты, чаго ніколі не здаралася ў гісторыі сучаснай Беларусі. Прыняты бюджэт з закладзеным у ім ростам сацыяльных выдаткаў на 40%, у тым ліку на 35% — заробкаў. У гэтай сітуацыі адсутнасць падтрымкі, у тым ліку фінансавай, пасля выбараў можа прывесці да глыбокіх эканамічных і сацыяльных катаклізмаў.

**«Независимая Газета» (Расія).**

Які з кірункаў — прагматычнае стаўленне да ўлады ці падтрымка грамадзянскай супольнасці — з'яўляецца для Літвы больш прыярытэтным, верагодна, стане вядома пасля выбараў прэзідэнта Беларусі. Пакуль жа эксперты і магчымыя кандыдаты ацанілі гэты візіт як падтрымку А. Лукашэнкі падчас яго прэзідэнцкай кампаніі.

**«Delfi» (Літва)**

У Кітаі Лукашэнка заявіў, што дамовіўся на 15 мільярдаў долараў інвестыцый, якія будуць выплачаны ў форме крэдытаў. Такі рост пазыкаў быў бы апраўданы, калі б сродкі накіроўваліся на перспектыўныя праекты, здольныя прынесці краіне экспартную выручку, сцвярджаюць эксперты. Аднак крэдытныя грошы спачатку ўкладаюцца ў золатавалютныя рэзервы для фармавання «падушкі бяспекі», а потым, калі попыт на валюту з боку насельніцтва і прадпрыемстваў перавышае прапанову, праз валютныя інтэрвенцыі сыходзяць на фінансаванне імпарту. Перадвыбарнае падвышэнне сацыяльных стандартаў на гэтым фоне палохае не толькі эканамістаў. Менавіта негатыўным знешнегандлёвым балансам краіны яны тлумачаць чуткі пра дэвальвацыю сярод простых людзей, якія скупляюць валюту.

**«Росбалт» (Расія)**

Тым часам у Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі заяўляюць, што абсалютна ніякіх парушэнняў закону пры правядзенні выбарчай кампаніі няма. Цікава, на якую рэакцыю з боку Еўрасаюза разлічвае апарат чыноўнікаў? ЕС і Расія, хоць і не ўмешваюцца ў ход прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, але сітуацыяй валодаюць, і дзеянні службоўцаў па ўтрыманні ўлады Лукашэнкам там добра вядомыя. Галоўнымі індыкатарамі шчырасці заяў улад Беларусі пра адкрытыя і сумленныя выбары будуць адказы на два пытанні: колькі актывістаў апазіцыі будуць уключаны ў склад больш за 6 тысяч участковых выбарчых камісій і ці змогуць назіральнікі кантраляваць працэс падліку галасоў. Тады і стане зразумела, ці сапраўды ў Беларусі штосьці сур'ёзна змяняецца, ці спектакль з элементамі лібералізацыі — чарговы рэверанс Мінска ў бок Еўрасаюза на фоне канфрантацыі з Масквой.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Увесь гэты час Беларусь атрымлівала танныя энерганосьбіты і зарабляла на перапрацоўцы бязмытнай расійскай нафты. Да таго ж мільярдныя пазыкі за газ Ельцын папросту прабачаў Лукашэнку па сяброўстве. Так і паўстаў пад бокам жабрачкі Расіі беларускі рай, з лёдавымі палацамі, стабільнай зарплатай і эканамічным цудам «а ля бацька Лукашэнка». Праўда, «парадыз» скончыўся адразу ж, як толькі Пуцін і Мядзведзеў пачалі наводзіць парадак з пастаўкамі энерганосьбітаў, чакаючы за немалыя прэферэнцыі праявы хоць бы салідарнасці.

**«Голос России» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЗАХСТАН. У ШКОЛАХ БУДЗЕ «НУРСУЛТАНАЗНАЎСТВА»

Увесці школьны прадмет «Нурсултаназнаўства», дзе будзе вывучацца біяграфія прэзідэнта Назарбаева, прапанаваў кіраўнік прэзідэнцкага фонду. Ініцыятыва была агучана падчас прэзентацыі кнігі пра Нурсултана Назарбаева. Яе назва «Ушконыр — залатыя яслі». Кніга распавядае пра дзіцячыя і школьныя гады Нурсултана Назарбаева, пра людзей, сярод якіх ён жыў, пра яго жыццёвы шлях. Кніга вельмі цікавая. Напрыклад, апавядае пра тое, як аднойчы, у далёкім дзяцінстве, Нурсултан ледзь было не памёр ад адзёру. «Вясковы лекар сказаў, што Нурсултану ўжо не жыць, і загадаў адвезці яго дахаты. Нурсултана везлі на возе. Хлопчык трызніў, у яго была высокая тэмпература», — распавядае аўтар кнігі. Далей гэта легенда распавядае, што Нурсултан нечакана апрытомнеў, паглядзеў, што ўжо ноч і свецяць месяц. Тады хлопчык сказаў: «Хіба Месяц вышэй за Бога? Месяц усміхаецца, а доктар сказаў, што я памру? Як гэта я памру? Не, я аспрэчваю хваробу». І так Нурсултан вылечыўся і ўстаў на ногі.

**Па матэрыялах казахскай службы «Радыё Свабода»**

### УКРАІНА. ЦІ МОЖНА ЕСЦІ «МАСКАЛЁЎ»?

Кампанія супраць нацыяналістаў, якую праводзіць Партыя рэгіёнаў, дабралася да кулінарнага сектара. У поле зроку ўлад патрапіла кафэ «Криївка» ў цэнтры Львова, афармленае ў стылі хованкі (зямлянкі) УПА. Супрацоўнікі «Криївки» апрануты ў форму байцоў Украінскай паўстанцкай арміі, на сценах вісіць зброя часоў другой сусветнай вайны, з якой кліенты могуць пастраляць у столь халастымі патронамі. Наведвальнікам прапануюць тэматычныя стравы накшталт «Маскалікі п'яныя», гарэлку «Мёртвы маскаль», кісель «Кроў маскаля» г. д. Менавіта назвы меню не спадабаліся актывістам партыі. Дэпутат Алег Цароў звярнуўся да прэзідэнта, прэм'ера і губернатара Львоўскай вобласці з просьбай праверыць установу, у якой, па яго меркаванні, распальваецца міжнацыянальная варожасць і прапагандуецца фашызм. Ён удакладняе, што патрабуе не зачыніць, а толькі перафарматаваць установу, прыбраўшы з меню абразлівае для рускіх слова «маскаль». У сваю чаргу, «аранжавы» дэпутат Алекса Гудыма пераконвае: слова «маскаль» нікога не ганьбіць і азначае «заваёўніка, істоту без роду і племені, што не паважае Украіну».

**Па матэрыялах «Сегодня» (Украіна)**

### ІСПАНІЯ. АБЛАВЫ НА МАЛАДЫХ БАСКСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ

Іспанская паліцыя правяла адну з самых вялікіх паліцэйскіх аперацый супраць нацыяналістычнага падполля ў Краіне Баскаў. На гэты раз пад раздачу трапілі сябры нефармальнай моладзевай арганізацыі «Segi». Паліцыя правяла ператрусы ў 46 кватэрах, шукаючы зброю і доказы кантактаў «Segi» з тэрарыстамі з групоўкі ETA. Калі верыць прэсе, паліцэйскім сапраўды ўдалося знайсці матэрыялы, якія могуць быць выкарыстаныя для выбуховых рэчаў. 35 арыштаваных збіраюцца прыцягнуць да судовай адказнасці за хуліганства. Сяброў «Segi», якую ўлады называюць «аўтэнтычнай акадэміяй тэрарызму», так моцна трасуць ужо ў другі раз. У 2009 годзе мела месца першая хваля масавых арыштаў. Па словах іспанскага МУС, задача аперацыі — перакрыць каналы, праз якія маладыя людзі сыходзяць у тэрарызм.

**Па матэрыялах іспанскай прэсы**

### МАЛДОВА. ГАЛОЎНЫМ ГАГАУЗАМ СТАНЕ ЖАНЧЫНА

Упершыню ў гісторыі гагаузскай аўтаноміі пасаду башкана (кіраўніка краю) можа заняць жанчына — Ірына Влах. Яна будзе балатавацца ад Камуністычнай партыі Рэспублікі Малдовы (КПРМ). Перад тым, як стаць кандыдатам, яна прайшла працэдуру «праймерыз» (унутрыпартыйныя выбары). Палітолагі лічаць, што ў камуністкі, якая, дарэчы, цяпер мае мандат дэпутата нацыянальнага парламента, рэальныя шанцы перамагчы цяперашняга башкана Міхаіла Формузала (партыя «Адзіная Гагаузія»). Хацця б таму, што ў мінулым годзе на выбарах у мясцовы парламент КПМР атрымала 60 працэнтаў галасоў. Малдаўскія камуністы, думаецца, спецыяльна зрабілі стаўку на Влах. «Чырвоных» шмат крытыкуюць за тое, што яны — партыя мінулага (КПМР дасюль кіруюць выхадцы з КПСС). Ірына, якой усяго 35 гадоў, павінна разбурыць старыя міфы.

**Па матэрыялах «Пульс» (Малдова)**

### ВАТЫКАН. ЦІ БУДЗЕ ЯН ПАВЕЛ ІІ СВЯТЫМ?

У газеце «Polska — The Times» з'явілася інтэрв'ю з вядомым італьянскім журналістам Джакама Галеазіні (Giacomo Galeazzinni), што працуе ў каталіцкіх выданнях. Журналіст, які неаднаразова падкрэсліў сваю павагу да папярэдняга пантыфіка, прызнае, што дынаміка яго беатыфікацыі затармазілася. Прычынай стаў скандал у кіраўніцтве Ватыканскага банка, які ў часы Яна Паўла ІІ разам з іншымі банкамі стварылі ў дзяржавах, дзе моцныя пазіцыі Касцёла, свайго роду «царкоўны афшор». Пры гэтым праз афшоры не толькі адмываліся грошы, але і фінансаваліся кланы мафіі і дыктатарскія рэжымы, напрыклад, рэжым Самосы ў Нікарагуа. Другі фактар звязаны з нядаўнім педафільскім скандалам, да якога ў тым ліку маюць дачыненне артадаксальныя палітызаваныя ордэны накшталт «Opus Dei», «Легіянеры Хрыста» і г.д. Сваім існаваннем яны шмат у чым абавязаны Яну Паўлу ІІ, які заахвочваў іх дзейнасць, разглядаючы іх як важны сродак барацьбы супраць марксістаў і евангелістаў.

**Па матэрыялах «Polska — The Times» (Польшча)**

ГЕАПАЛІТЫКА

# КРЫМ СТАНЕ ДАНБАСАМ

**На думку шматлікіх украінскіх палітолагаў, Партыя рэгіёнаў збіраецца зрабіць тое, пра што «аранжавыя» нават марыць не маглі, — ліквідаваць аўтаномію Крыма. Наколькі маюць глебу такія спекуляцыі? Пра гэта журналіст «НЧ» размаўляе з крымскім палітолагам Аляксеем Вернікам.**



***— Адкуль узяліся чуткі пра тое, што бліжэйшым часам трэба чакаць як мінімум абмежавання аўтаноміі АРК ( Аўтаномная Рэспубліка Крым), а як максімум — яе ператварэння ў звычайную вобласць Украіны?***

— Усе памятаюць, як нядаўна была зменена канстытуцыя Украіны. Чаму б не паўтарыць падобнае ў Крыме? Тым больш, што перад Партыяй рэгіёнаў пастаўлена заданне атрымаць у новым Вярхоўным Савеце АРК 70 працэнтаў мандатаў. На першы погляд, лічба астранамічная — нашто так шмат? Аднак для змены канстытуцыі амаль столькі і трэба. І, здаецца, Партыя рэгіёнаў сапраўды збіраецца атрымаць такую лічбу. Практычна па ўсёй Украіне цяпер ідзе шантаж апазіцыйных палітыкаў. Увосень па Крыме пракацілася хваля арыштаў. Сярод самых гучных — арышт мэра Алупкі Андрэя Харытонава. Усе, хто апынуўся за кратамі, былі звязаныя з партыяй «Саюз» (адна з вядучых партый паўвострава і канкурэнт Партыі рэгіёнаў на выбарах). Кіраўніцтва «Саюза» нават баіцца цяпер публічна агучваць спіс сваіх кандыдатаў, каб іх не напаткаў лёс Харытонава. Таксама на ціск скардзяцца іншыя апазіцыйныя партыі: ад левай Партыі прагрэсіўных сацыялістаў да правай партыі «Батьківщина».

***— Нашто Партыі рэгіёнаў абмежаванне аўтаноміі рэспублікі?***

— Каб адказаць на гэта пытанне, трэба акцэнтаваць увагу на тым, што Крымам кіруе не проста Партыя рэгіёнаў, а яе «макееўская група». Цяперашні прэм'ер Васіль Джарты ў 1990-я гады меў мянушку Вася Біта, а гэта пра шмат гаворыць. Васю Біце аддалі паўвостраў у вотчыну. Калі не зміняць правіла гульні, пасля перамогі на выбарах 30 кастрычніка групоўка атрымае інстытуцыйныя гарантыі бяспекі дзякуючы аўтаноміі. Тады дыктат Януковіча будзе немагчымы. Не думаю, што Віктару Фёдаравічу патрэбны такі сцэнар. Каб і далей кантраляваць «макееўскіх», дастаткова прыбраць з асноўнага закону АРК некалькі артыкулаў. У любым выпадку ўжо зразумела, што канстытуцыйная рэформа непазбежная: будуць іншымі адміністратыўныя межы паўднёвага берагу, дзе знаходзяцца самыя дарагія курортныя зоны.

***— Як Партыя рэгіёнаў і самі крымскія ўлады тлумачаць апошнія працэсы?***

— Кажуць, што ў арыштах няма ніякага палітычнага падтэксту. Аднак, каб пераканацца ў адваротным, дастаткова ўважліва прааналізаваць справу таго ж Харытонава. На яго завялі справу яшчэ ў красавіку, даючы зразумець, што на выбары лепш не ісці. Як толькі ён падаў заяву на рэгістрацыю ў выбаркам, адразу пракурор выпісаў пастанову на арышт. Відавочна, што рыхтуюцца махінацыі. Зараз у Крыме ў пустыя інтэрнаты і недарагія гатэлі масава засяляюць і рэгіструюць людзей з Данецкай вобласці. Па нашых законах, людзі галасуюць па месцы прапіскі. Размова ідзе пра тысячы чалавек, галасоў якіх будзе дастаткова, каб паўплываць на выніке выбараў.

***— Як рэагуюць традыцыйныя крымскія партыі на ўчынкі «данецкіх»?***

— Ёсць спроба стварэння агульнай крымскай партыі. Прынамсі, аксакал крымскай палітыкі камуніст Леанід Грач прапанаваў усім апазіцыянерам яшчэ летам пачаць працэс збору подпісаў за адстаўку Джарты. Аднак да афармлення якога-небудзь саюзу справа не дайшла. Увогуле, як можа выглядаць такі блок? Грач, які роўна год таму агітаваў за Януковіча на выбарах прэзідэнта, сёння крытыкуе Януковіча за тое, што ён слаба працуе з Расіяй і Лукашэнкам, што тармозіць развіццё рускай мовы. Такія заявы хутчэй адштурхоўваюць ад Грача сярэдні і малы бізнес, які баіцца экспансіі «данецкіх». Адзінае, што, магчыма, яднае апазіцыю — намер не даць Партыі рэгіёнаў набраць 70 працэнтаў галасоў.

**На днях Леанід Грач паскардзіўся, што на яго заяву пра пагрозу ліквідацыі аўтаноміі не адрэагавала ніводная міжнародная арганізацыя**

***— Якая пазіцыя крымскататарскага насельніцтва?***

— Як вы ведаеце, крымскія татары традыцыйна ўваходзілі ў саюз з «аранжавымі». Меджліс — галоўны каардынацыйны орган — быў удзельнікам кааліцыі «Народны Саюз — Наша Украіна». Яшчэ зімой улады арганізавалі спробу расколу Меджлісу. У выніку ім удалося ўцягнуць лідэраў руху ў канфрантацыю і выключыць з выбарчай кампаніі. Таму татарскае пытанне не першае на гэтых выбарах.

***— Калі паглядзець з Кіева, на думку стандартнага прадстаўніка нацыянальнай інтэлігенцыі, ліквідацыя аўтаноміі Крыма — гэта добра ці дрэнна?***

— Вядучыя ўкраінскія праваабарончыя арганізацыі, кіраўніцтва якіх звычайна трымаецца праеўрапейскіх поглядаў, сапраўды не ведаюць, як сябе паводзіць у дачыненні да працэсаў у Крыме. Партыя «Саюз» і камуністы доўгі час выступалі лабістамі расійскіх інтарэсаў — заклікалі да выхаду Крыма са складу Украіны і яго ўваходжання ў РФ. Калі АРК кіравалі камуністы, яны ігнаравалі правы на свабоду сходаў, забараняючы акцыі ўкраінскіх нацыяналістаў. Таму калі сёння Януковіч выступае супраць крымчан, дэмакраты трымаюць нейтралітэт. У прынцыпе, крымскія аўтаномісты самі сабе вырылі яму. На днях Грач паскардзіўся, што на яго заяву пра пагрозу ліквідацыі аўтаноміі не адрэагавала ніводная міжнародная арганізацыя. Аднак наўрад ці еўрапейскія чыноўнікі будуць прыслухоўвацца да чалавека з рэпутацыяй прарасійскага палітыка.

***— Як можа павесці сябе Расія ў выпадку канстытуцыйнай рэформы?***

— Маю сумнеў, што Расія сапраўды захоча актыўнічаць. Гэта не Абхазія і не Асецыя. Новай канстытуцыі хоча большасць крымчан, калі меркаваць па складзе абранага парламента. Януковіч можа спасылацца на тое, што ён як прарасійскі палітык папросту капіруе расійскую сістэму адносін цэнтра і рэгіёнаў.

***— Што можна сказаць пра стаўленне людзей да выбараў?***

— Крым быў адным з самых палітычна актыўных рэгіёнаў Украіны. Аднак цяпер здаецца, можна казаць, што гэта ўжо гісторыя. Усе адзначаюць пасіўнасць электарату. Здаецца, людзі папросту страцілі давер да палітыкаў, якія то свараца, то ствараюць агульныя саюзы. У такой атмасферы партыя ўлады за кошт адміністратыўнага рэсурсу лёгка атрымае перамогу.

РЭФОРМЫ

# КУБА: КАНЕЦ САЦЫЯЛІЗМУ

Алег НОВІКАЎ

**Маргарэт Тэтчэр, Рональд Рэйган, Ягор Гайдар. Гэтым ліберальным рэфарматарам нават не сніўся маштаб рынкавай трансфармацыі, якая стартуе сёння на камуністычнай Кубе. Тут вырашылі «парваць кантракт» з кожным чацвёртым працоўным.**




1 жніўня 2010 года. На пасяджэнні Народнай Асамблеі (кубінскі парламент) слова далі прэзідэнту Раулю Кастра. Ён запатрабаваў ад урада тэрмінова прыняць «важнае структурнае і канцэптуальнае рашэнне» для скарачэння бюджэтнага дэфіцыту.

Партыя сказала: «Трэба!». Урад адказаў: «Ёсць!». 14 верасня Савет міністраў і прафсаюзы апублікавалі сумесны дакумент, адпаведна якому да сакавіка наступнага года колькасць працоўных, занятых у дзяржаўным сектары (прадпрыемстваў іншай формы ўласнасці на Кубе амаль няма), будзе скарочана на паўмільёна. Усяго на Кубе прыкладна 2 мільёны працоўных. Такім чынам, на вуліцу будзе выстаўлены кожны чацвёрты.

Міністры і прафсаюзныя бонзы тлумачаць неабходнасць драконаўскага закона «патрэбай аптымізаваць вытворчасць і палепшыць якасць паслуг». У любым выпадку маштабы рэформы проста фантастычныя.

Між тым кубіназнаўцы пагаджаюцца, што падобных крокаў ад урада трэба было чакаць. Пасля часовага паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў пачатку гэтага стагоддзя ў 2008 годзе на востраве Свабоды пачаўся новы этап крызісу. Крызіс выкліканы не толькі традыцыйнымі ўнутранымі, але і знешнімі фактарамі — амерыканскае эмбарга на гандаль з Кубай і сусветная глабальная рэцэсія, якая паменшыла колькасць турыстаў на кубінскіх курортах.

Сваю ролю адыгралі тры буйныя цыклоны, якія запар атакавалі Кубу у 2008-м, што прывяло да скарачэння вытворчасці цукру. Плюс падзенне на міравых рынках попыту на цынк, які здабываюць на Кубе. У выніку сёння каля 70 працэнтаў прадуктаў масавага спажывання кубінскі ўрад набывае за мяжой. Па словах таго ж Рауля Кастра, падобная схема пагражае нацыянальнай бяспецы.

Нягледзячы на тое, што Рауль Кастра канстатаваў наяўнасць сістэмных праблем у краіне адразу, як тры гады таму заняў пост прэзідэнта, глабальныя змены ён пачаў толькі зараз. Раней усё абмяжоўвалася дазволам валодаць мабільнікамі, ствараць прыватныя фірмы ў сферы паслуг і браць зямлю ў арэнду. Аднак апошнія рэформы, безумоўна, самыя радыкальныя за ўвесь час іх кіравання.

Чаго варта чакаць на Кубе пасля таго, як на працоўным рынку з'явіцца сапраўдная армія беспрацоўных? Уладныя ідэолагі мараць пра тое, што новыя беспрацоўныя дадуць штуршок развіццю такіх сектараў, як будаўніцтва і агракультура. Скептыкі чакаюць не эканамічнага цуду, а імклівай паўперызацыі насельніцтва. Яны сыходзяць з таго, што былому чыноўніку (гэту катэгорыю працоўных будуць звальняць у першую чаргу) цяжка стаць будаўніком або рабочым з добрай кваліфікацыяй.

Затое можна дакладна чакаць з'яўлення своеасаблівай палітычнай апазіцыі Кастра. У заходняй прэсе з'явіліся матэрыялы дыскусій апошніх збораў Кампартыі Кубы. Некаторыя ўдзельнікі збораў выступалі супраць бюракратаў, якія прымаюць рашэнні без уліку наступстваў іх рэалізацыі для працоўных мас.

Афармляецца ў партыі паступова і група «лібералаў», якая гуртуецца вакол Рауля Кастра. Гэта кааліцыя часткі апаратчыкаў і прадстаўнікоў дырэктарскага корпуса, якія жадаюць развіцця Кубы па кітайскай або в'етнамскай мадэлі. У гэты лагер можна запісаць таксама і самога Фідэля Кастра. За тыдзень да абвяшчэння пра масавыя скарачэнні ў амерыканскім часопісе «The Atlantic» з'явілася ягонае інтэрв'ю, дзе Фідэль заявіў: «Кубінская мадэль не функцыянуе». Кубіназнаўцы лічаць, што гэтыя словы былі своеасаблівым блаславеннем на структурныя трансфармацыі.

Нарэшце, у кубінскай Кампартыі ёсць трэцяя пазіцыя. Яе рэпрэзентуюць маладыя партыйцы і людзі, блізкія да мясцовай багемы, якія вераць у магчымасць мадэлі «сацыялізму ўдзелу» . На гэтым этапе яны патрабуюць не столькі ліберальных рынкавых рэформаў, колькі пашырэння працоўнага самакіравання і свабоды прэсы.

Чытачу цікава будзе даведацца, як рэагуюць на рэформы на Кубе ў ЗША. Парадаксальна, аднак вядучыя выданні, якія адлюстроўваюць інтарэсы буйнага бізнесу і палітычнай эліты, не ў захапленні ад новаўвядзенняў на востраве Свабоды.

«Foreign Affaires» хвалююцца за тое, што рэформы «ідавочна паслабяць сістэму аховы здароўя. Перш за ўсё яе рэзервы будуць знішчаныя масавай эміграцыяй медыкаў. Яе рэшткі амерыканскія фірмы ператвораць у абмежаваны сектар медыцынскага турызму».

«Wall street Journal» заклапочаны тым, што «рэструктурызацыя справакуе новую сацыяльную стратыфікацыю, якая будзе спрыяць стварэнню класа белай буржуазіі і маргіналізацыі чарнаскурай часткі насельніцтва Кубы».

У адным усе аглядальнікі пагаджаюцца — кубінскаму сацыялізму прыходзіць канец.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АЛЕГ ЛЯШКО



Дэпутата Вярхоўнай Рады Украіны выключылі з фракцыі «Блок Юліі Цімашэнка» (БЮТ) пасля гучнага скандалу. Прыкладна за тыдзень да гэтага ў інтэрнэце з'явілася пікантная стужка, знятая быццам напрыканцы 1990-х гадоў. На ёй паказаны допыт у міліцыі чалавека, падобнага на Ляшко. Гэты чалавек прызнаецца, што займаўся сексам з прадстаўніком адміністрацыі Кучмы. БЮТ і так увесь час ліхарадзіць ад скандалаў на сексуальнай глебе. Год таму некалькі сяброў фракцыі БЮТ падазраваліся ў педафіліі. Цяпер вось непрыемная гісторыя з гомасексуалістамі. Хаця Ляшко заявіў, што на стужцы не ён, яго ўсё роўна выключылі за тое, што аднойчы прагаласаваў насуперак партыйнай лініі. Ляшко ў адказ выліў у прэсу некаторыя сакрэты «Юлінай кухні» — напрыклад, што партыя мае вялікія пазыкі і праблемы з бізнесам і што БЮТ імкліва губляе сацыяльную базу. Экс-бютавец, акрамя таго, прапанаваў сваю версію апошніх падзей. Па яго словах, ён даўно збіраўся стварыць сваю партыю, аднак Цімашэнка прапанавала яму заступіць на месца лідэра БЮТ, а пасля папросту «кінула». А ў дадатак, каб Ляшко не стварыў асобную партыю, піяршчыкі знялі кампраметуючы ролік пра яго. Самае цікавае, што палітык з блакітным іміджам збіраецца працягнуць кар'еру. Бліжэйшым часам ён мае намер узначаліць новую структуру, якая будзе называцца Украінская партыя.

### ЯРАСЛАЎ КАЧЫНЬСКІ



На лідэра польскай кансерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць» (PiS) хацеў здзейсніць замах 68-гадовы вадзіцель таксі з польскай глыбінкі. З такім намерам ён прыйшоў у бюро PiS у Лодзі. Паколькі Качыньскага ў офісе не было, таксіст у якасці кампенсацыі забіў нажом двух клеркаў. Падчас арышту забойца сказаў журналістам, што з'яўляецца праціўнікам PiS і хоча знішчыць Качыньскага. Сам Качыньскі, калі даведаўся пра выпадак у Лодзі, патрабаваў склікання тэрміновага пасяджэння парламента, паколькі, па яго словах, гаворка ідзе пра спробу фізічнага знішчэння апазіцыі. Ён таксама лічыць, што трагедыя ў Лодзі — наступства кампаніі, якую ліберальны ўрад «Грамадзянскай платформы» (PO) вядзе супраць яго і ягонай партыі. Платфармісты, у сваю чаргу, кажуць, што адказнасць за падзеі ў Лодзі павінен таксама несці Качыньскі, які раскручвае спіраль напружанасці ў грамадстве. Так, правадыр PiS дасюль адмаўляецца прызнаваць вынікі прэзідэнцкіх выбараў, на якіх ён прайграў Браніславу Камароўскаму (PO), сцвярджае, што катастрофу прэзідэнцкага самалёта пад Смаленскам арганізаваў урад Дональда Туска разам з агентамі Масквы. Рэакцыя PO і PiS на забойства ў Лодзі сведчыць пра тое, што «польска-польская» вайна (так называюць у прэсе канфрантацыю кансерватараў і лібералаў, якая фактычна раскалола польскі соцыум) будзе працягвацца. На жаль, цяпер у гэтай вайне ёсць першыя ахвяры.

### МІХАІЛ ГІМПУ



Старшыня малдаўскай партыі лібералаў, які часова выконвае абавязкі прэзідэнта краіны, арыгінальна пачаў выбарчую кампанію (выбары ў парламент адбудуцца 28 лістапада). Ён урачыста адкрыў помнік пісьменнікам, якія загінулі ад рук савецкай улады. Гімпу запэўніў, што ягоная партыя лібералаў пабудуе за ўласныя грошы помнік у кожным населеным пункце ў памяць пра ахвяр таталітарнага камуністычнага рэжыму, каб грамадзяне ведалі імёны тых, хто супрацьстаяў камуністычнаму рэжыму і папакутаваў за гэта. «Яны былі дэпартаваныя ў Сібір ці расстраляныя. Гэта трагедыя, а нам няма куды ўскласці кветкі ў памяць пра герояў», — адзначыў Гімпу. Акрамя таго, Гімпу раскрытыкаваў перадвыбарны лозунг партыі камуністаў «Малдова выбірае перамогу!». Па меркаванні Гімпу, такія слоганы «ненармальныя для малдаўскага грамадства». «Будзьце ўважлівыя! «Малдова выбірае перамогу!» — лозунг, перакладзены з рускай мовы. Ён падобны на тыя, якія гучалі ў 1990-я гады. І мэта іх — раз'яднаць малдаўскае грамадства. Ну хіба гэта нармальнае стаўленне да грамадзян гэтай краіны?» — сказаў Гімпу.

▸ КІНО

# СЕМ З ПАЛОВАЙ ЗАБОЙСТВАЎ «МАСАКРЫ»

Андрэй РАСІНСКІ

**Карціну «Масакра» Андрэя Кудзіненкі, прэм'ера якой мае адбыцца 7 лістапада, ужо пабачыла прэса. Аўтар гэтых радкоў назіраў за з'яўленнем «першага беларускага бульба-хорару» яшчэ калі складаўся сцэнар — ды з таго часу стаўся зацятым заўзятарам стужкі. Каб не быць занадта суб'ектыўным, выкладу толькі факты і назіранні.**

**Вашай увазе — сем з паловай гісторый «Масакры» (па колькасці забойстваў у карціне).**

## Гісторыя стварэння

Ідэя паставіць містычны трылер з'явілася ў Андрэя Кудзіненкі напрыканцы 1990-х гадоў. Але пасля стужкі «Акупацыя. Містэрыі», якая была забаронена ў Беларусі, Кудзіненка стаў на радзіме апальным аўтарам. Рэжысёр застаўся без працы і з'ехаў у Расію, дзе здымаў серыялы і паставіў на студыі Паўла Лунгіна кінапаўтор «Розыгрышу».

Сучасны «Розыгрыш» прадстаўляў Расію на міжнародных кінааглядах, а тым часам у Беларусі дазвання абсмоктвалася ваенная тэма — нягледзячы на супраціў мастацтва і публікі. Цэтлік «Беларусьфільма» разгаляў гледачоў.

Напрыканцы 2008 года кінастудыя адправіла Кудзіненку сцэнары, якія ён бы мог паставіць на «Беларусьфільме». Кудзіненка нецікавыя прапановы адкінуў і даслаў сваю заяўку на містычны хорар, «каб адчапіліся».

Але за заяўку ўчапіліся абедзвюма рукамі. Кіраўнік кінастудыі Уладзімір Замяталін асабіста патэлефанаваў рэжысёру і запрасіў на радзіму здымаць карціну, абяцаючы ўсялякае спрыянне.

## Гісторыя сюжэту

«Масакра» пастаўлена па матывах «Локіса» Праспэра Мэрымэ. Страшная гісторыя мядзведзялака была экранізаваная ў 1920-я (паводле сцэнару савецкага наркама Луначарскага). У 1970-я гады польскі рэжысёр Януш Маеўскі зрабіў нуднаватакаляровую версію «Локіса».

Але Андрэй Кудзіненка сцвярджае, што «Локіс» — не толькі літоўская, але і беларуская легенда, і што на поўначы Беларусі ёсць месца, дзе сяляне забілі панамядзведзя.

Сцэнарыст Аляксандр Качан перанёс дзеянне мядзвежай «Масакры» ў часы пасля задушэння вызвольнага паўстання. Шляхецкія маёнткі набываюць новыя гаспадары. У маёнтак графа Пазуркевіча трапляе авантурнік Казанцаў, які выдае сябе за навукоўца-кнігалюба. Авантурнік заляцаецца да нявесты графа, якая Казанцаву сімпатызуе. Але граф — люты мядзведзялак, і гасцям, якія прыехалі на заручыны (і продаж маёнтку), — не пазайздросціш.



Фота www.masakra.tut.by

У цэнтры: рэжысёр Андрэй Кудзіненка

### Даведка

**Масакра**

Беларусь, 2010, каляровы, 100 хвілінаў

Сцэнар: Аляксандр Качан і Андрэй Кудзіненка (паводле матываў «Локіса» Праспэра Мэрымэ і беларускіх легенд)

Рэжысёр: Андрэй Кудзіненка

Аператары: Аляксей Убейволк (апошняя сцэна), Павал Зубрыцкі

Мастак: Артур Клінаў

Мастачка па касцюмах: Ніна Гурло

Кампазітар: Алег Хадоска

Мантаж: Аляксандр Дэбалюк

Ролі выконваюць: Дзмітры Мілер, Андрэй Назімаў, Марыя Курдзяневіч, Аляксандр Колбышаў, Вячаслаў Паўлюць, Сяргей Уласаў, Святлана Зелянкоўская, Аксана Лясная, Сяргей Журавель, Алена Адзінцова, Паліна Сыркіна, Аляксандр Кашпераў, Аляксей Сянчыла, Алег Гарбуз, Іван Мацкевіч, Генадзь Фамін, Аляксандр Малчанаў.

## Гісторыя акцёраў

Спачатку Андрэй Кудзіненка падбіраў у «Масакру» толькі беларускіх акцёраў. Але знайсці графа і ягоную нявесту, каб акцёры падыходзілі па ўзросце, фактуры, шляхетнасці, на жаль, не атрымалася. Дзмітры Мілер і Марыя Курдзяневіч — акцёры расійскія. Але самі расійскія крытыкі іх не пазналі — дый палічылі за беларускіх акцёраў. Дзмітры Мілер увогуле без акцэнту размаўляў на беларускай мове.



Акцёра Андрэя Назімава, які сыграў Казанцава, Кудзіненка ўзяў са свайго «Розыгрышу».

А беларускія акцёры — Аляксандр Кашпераў, Алег Гарбуз, Сяргей Журавель, Вячаслаў Паўлюць, Паліна Сыркіна, Аксана Лясная — ладзяць гратэскна-радаснае шоу са звярынымі маскамі, любошчамі і пераўтварэннямі.

У апошнім, італьянскім, эпізодзе — «партызанскага раю» — засвяціласяздымачная група. Вознік — Андрэй Кудзіненка, гарыбальдзійцы — мастак Артур Клінаў і майстар мантажу Аляксандр Дэбалюк.

А вось Аляксандр Колбышаў, Святлана Зелянкоўская і Аляксандр Малчанаў прыйшлі ў «Масакру» з «Акупацыі». Зелянкоўская змяніла амплуа згубнай німфаманкі на ролю харызматычнай камічнай алкагалічкі. Колбышаў — зухаваты святар-партызан (!), Малчанаў — яшчэ адзін інсургент, дзед патомнага партызана Якуба Лойкі з «Акупацыі».

## Гісторыя вызваленчай барацьбы

Разня, якую ладзіць мядзведзь калабаранцкай шляхце і расійскаму генералу (Кашпераву), — гэта гісторыя вызваленчай барацьбы з містычным алібі. Нельга выказвацца пра Кастуся Каліноўскага станоўча, бо ў падручніках яго засланяе «энергічны адміністратар» Мураўёў-вешальнік, — атрымайце помслівага мядзведзялака са старажытнага ліцвінскага роду (дарэчы, у палацы — партрэты Радзівілаў, якія, паводле сцэнару, — сваякі Пазуркевіча).

Нельга пачуць беларускую мову — яна будзе падпольнай, тайнай, як у фільме, — прыцісnутая рускімі субцітрамі (ненаўмысная спасылка да «Акупацыі»). Мы занадта добра ведаем рускую культуру — дык на экране дасціпная іронія з Пушкіна і Талстога (расійскія крытыкі абураліся).

Зрэшты, маёнтак, у якім фільм здымалі, — напаўразвалены палац Чацвярцінскіх. Старая шляхта, стары род, забытая гісторыя іншай культуры.

## Гісторыя бульба-хорару

Андрэй Кудзіненка акрэсліў бульба-хорар як нацыянальны беларускі жанр з жахаў, смеху і эротыкі. Ягоныя вытокі — «Дзікае паляванне караля Стаха», пастаўленае Рубінчыкам, і «Усходні калідор» Валянціна Вінаградава. Выкшталцона-эстэцкія творы Вінаградава ў нас былі забытыя і за савецкі часам забароненыя. Кудзіненка прысвяціў гэтаму майстру адну з першых сваіх стужак — «Сны В.В.»

У 1995 годзе Кудзіненка абмяркоўваў з крытыкам Алегам Кавалавым, які жанр можа стацца беларускім нацыянальным. Такім жанрам творцы назвалі містычны трылер.

«Масакра» — гэта гульня з жанрам.

## Гісторыя гульні

«Масакра» — гэта не столькі гісторыя Беларусі, колькі гісторыя гатычнага жанру. Дарэмна гісторыкам дакараць за касцюм графа-пярэваратня (можа, яму яшчэ даведку прынесці ад паляўнічых?). Не трэба абурацца маскамі на тварах сялян і саламянымі пакоямі ў палацы (геніяльныя дэкарацыі Артура Клінава).

Гэта гульня з готыкай студыі «Хэмэр» і дажынначныя кашмары Робіна Гардзі («Плецены чалавек»). Гэта Дракуліяна, «Вій», «Партрэт Дарыяна Грэя», «Маска Сатаны» Марыя Бавы і вусцішныя казкі Дарыя Арджэнты.

Гэта дасціпная энцыклапедыя страшнага жанру, дзе кожнае забойства ў калекцыі.

## Гісторыя забойстваў

Жудасная гісторыя кахання дзяўчыны (якую не выратуе і Пушкін!) да згубнай пачвары пастаўлена цнатліва і з густам. У фільме сем з паловай гвалтоўных смерцяў — і адна мядзведзялачыха ў дамавіне. Але ўсе смерці абыгрываюцца аўтарам не натуралістычнымі кавалкамі мяса, а з дапамогай мантажу, гука, ракурсу, колеру. Брак грошай на дарагія эфекты распаліў рэжысёрскую вынаходлівасць (саламяны смяротны пакой, пэўна, увойдзе ў даведнікі). У шматлікіх любоўных сцэнах героі зболышага апранутыя, вока лашчаць кічава-барочныя шаты.

«Масакрай» будуць абураныя аматары высакалобых нудных карцін, бо гэта — нізкі жанр. А чыпсаеды рызыкнуць падавіцца: фільм зроблены па-майстэрску. Затое ў «Масакры» ёсць усе шанцы атрымаць еўракультавы статус і прывабіць заўзятараў, якія будуць пераглядаць стужку процьму разоў, каб разгадаць усе яе таямніцы.

▸ З НАГОДЫ

# «ЛІСТАПАД» СТАНОВІЦЦА ФЕСТЫВАЛЕМ

Андрэй РАСІНСКІ

**Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад», які пройдзе з 5 па 12 лістапада, абнавіўся і прагне ў Еўропу.**




«Нам цікавыя стужкі постсацыялістычных краінаў,» — акрэсліў першы фестывальны кірунак яго праграмны дырэктар Ігар Сукманаў.

У асноўным конкурсе — тузін стужак з Сербіі, Балгарыі, Грузіі, Венгрыі, Кыргызстану, Польшчы, Украіны, Расіі і Беларусі. Гэта «Святы Георгій забівае цмока» Срджана Драгоевіча, «Усходнія п'есы» Камена Калева, «Прагульнікі» Левана Кагуашвілі, «Рэверс» Барыса Ланкоша, а таксама румынская стужка Крысці Пую «Аўрора», якая нарасхват на міжнародных фэстах. Украіна прадстаўлена карціна ураджэнца Баранавічаў Сяргея Лазніцы «Шчасце маё», якая выклікала розгалас у Канах. На «Лістападзе» адбудзецца і міжнародная прэм'ера «Масакры» Андрэя Кудзіненкі.

Другая фестывальная разынка — конкурс маладога кіно. У праграме — 9 дэбютных карцін рэжысёраў з усяго свету.

Адбудзецца і традыцыйны паказ неігравых стужак (20 конкурсных карцін), і асобна — спаборніцтва маладых дакументалістаў (12 стужак). Пад дахам «Лістапада» ладзіцца конкурс і для самых маленькіх — «Лістападзік-2010» з шасцю дзіцячымі фільмамі.

Па-за конкурсам — 8 дакументальных праграм і 5 ігравых. А таксама — дні польскага кіно, панарама расійскага кіно і нацыянальныя кінапрэм'еры слынных беларускіх дакументалістаў — Віктара Аслюка і Галіны Адамовіч.

У гледачоў будзе магчымасць паставіць адзнакі ўсім фільмам і нават сустрэцца з творцамі. Але прыз глядацкіх сімпатый адсунуты на другі план прызам журы прафесійнага, якое сёлета ачоліць класік літоўскага кіно Шарунас Бартас. Змена кінаўлады звязана з заяўкай «Лістапада» на ўступленне ў Міжнародную федэрацыю асацыяцый кінапрадзюсараў.

Да апошняга часу «Лістапад», які праходзіць сёлета ўжо ў 17 раз, свайго твару не меў. У лепшым выпадку гэта была постсавецкая тусоўка, пераважна з расіян. З набыццём дакладнай канцэпцыі і міжнародным журы «Лістапад» становіцца кінафэстам Цэнтральнай Еўропы.

ВЫСТАВЫ

# ДА СТАГОДДЗЯ ЯФІМА ТАРАСА

Генадзь КЕСНЕР

**Стагоддзю беларускага мастака і графіка Яфіма Тараса прысвечана выстава плакатаў, якая 25 кастрычніка адчынілася ў памяшканні Беларускага саюза дызайнераў. На ёй экспануюцца сямнаццаць прац майстра, датаваных 1940–60-мі гадамі. У цырымоніі адкрыцця выставы прынялі ўдзел і сваякі Яфіма Мікалаевіча, а самаму малодшаму з іх — праўнуку Янку — споўніўся толькі год.**



Старшыня Беларускага саюза дызайнераў Зміцер Сурскі, адкрываючы выставу, падкрэсліў, што плакаты Яфіма Тараса займаюць асаблівае месца ў калекцыі БСД, паколькі яны з’яўляюцца рарытэтамі — самы стары плакат, што дэманструецца ў экспазіцыі, датаваны 1940 годам. Плакаты Тараса прысвечаны 30-годдзю БССР, уз’яднанню Заходняй Беларусі з Беларускай ССР, 40-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, тлумачэнню вучэння Уладзіміра Леніна, правадыру савецкага народа Іосіфу Сталіну, выгодам, якія савецкі народ мог зведаць ад набыцця латарэйных білетаў, і інш.

Куратар выставы Ягор Сурскі зазначыў, што праца над падрыхтоўкай выставы плакатаў была надзвычай цікавая. «Калі збіраўся гэты матэрыял, адкрыліся некаторыя дадатковыя факты. Яфіму Тарасу, напэўна, пашанцавала з нашчадкамі. Дзякуючы яго сыну Валянціну Тарасу, які стварыў кнігу «На выспе ўспамінаў», дзе цэлы раздзел прысвечаны бацьку, мы можам даведацца, што талент Яфіма Тараса як плакатыста і капіравальшчыка прыдаўся яшчэ ў разведцы: дзесьці з саракавога года і падчас вайны мастак падрабляў дакументы для разведчыкаў. Давялося Яфіму Тарасу на сваім жыццёвым шляху шмат зведаць, пабачыць і вытрываць.

Упершыню лёсу чалавека «ўтылітарнай прафесіі» надаецца такая дэтэктыўная цікавасць. Падчас даследавання творчасці гэтага мастака-плакатыста адкрыліся новыя цікавыя факты. Плакаты, што дэманструюцца на гэтай выставе, у свой час былі надрукаваныя агульным накладам больш за 300 тысяч асобнікаў, і можна сабе ўявіць, што дзякуючы такой растыражаванасці яны фарміравалі тагачасную візуальную рэчаіснасць краіны, і гэта важкі аргумент на карысць гэтай прафесіі і ацэнкі працы самога мастака», — падкрэсліў Ягор Сурскі.

Сын мастака прафесар Анатоль Тарас распавёў, што яго бацька, які нарадзіўся 25 мая 1910 года ў вёсцы Мядзвежына пад Мінскам, быў прадстаўніком старажытнага шляхецкага роду. Пасля атрымання пачатковай адукацыі Яфім Тарас накіраваўся ў тагачасны Ленінград, дзе спачатку працаваў грузчыкам у порце, потым быў падсобным рабочым у Тэатры юных гледачоў. Яфім Мікалаевіч скончыў мастацкую студыю і ў 1932 годзе вярнуўся ў Мінск, дзе і пражыў да 1994 года, — спачатку служыў у арміі, а потым працаваў мастаком.

Анатоль Тарас зазначыў, што лёс бацькі быў зменлівы. Напрыклад, за вываз з Мінска ў чэрвені 1941 года сакрэтных дакументаў аддзела разведкі штаба Заходняга фронту Яфіма Тараса прадставілі да звання Героя Савецкага Саюза, але з прычыны бюракратызму і шматступеньчатай сістэмы ўзнагароджання мастак атрымаў толькі медаль «За баявыя заслугі І-й ступені». Разам з тым, калі Яфіму Тарасу было ўжо 60 год, і стан яго здароўя пакідаў жадаць лепшага, мастака па надуманых прычынах асудзілі. Яфім Тарас правёў у вязніцы дзевяць месяцаў, пасля чаго яго — хворага, знямоглага і ледзь жывога — апраўдалі і адпусцілі на волю.

За сваё творчае жыццё майстар намаляваў больш за сто плакатаў, аформіў столькі ж кніжак, пераважна класікаў беларускай літаратуры, стварыў шмат паштовак і паштовых марак.

Цікавы момант распавёў унук Яфіма Мікалаевіча — вядомы беларускі журналіст і публіцыст Віталь Тарас: «Некалі ў букіністычнай краме мне ў рукі трапіў томік «Выбраных твораў» Пушкіна. Гэта быў зборнік перакладаў на беларускую мову, выдадзены ў Мінску ў 1949 годзе да 150-годдзя з дня нараджэння рускага класіка. Увагу маю прыцягнула вокладка, на якой быў рэльефны профіль паэта ў медальёне, а ўнізе выціснуты залатымі літарамі факсімільны подпіс: «А. Пушкинъ». Але самае вялікае адкрыццё чакала мяне, калі я разгарнуў томік і прачытаў, што над афармленнем кнігі працаваў мастак Я. Тарас. Я нават не адразу зразумеў, што гэта мой дзед Яфім Тарас».

Старшыня БСД Зміцер Сурскі падтрымаў прапанову Анатоля Тараса стварыць альбом, у якім будзе прадстаўлена творчасць Яфіма Тараса. Асновай альбома могуць стаць фотаздымкі, дакументы і ўспаміны родных Яфіма Мікалаевіча.

Выстава плакатаў мастака і графіка Яфіма Тараса будзе працаваць да 25 лістапада па адрасе: Мінск, вуліца Брылеўская, 14.

ФЕСТЫВАЛЬ

# ТРЫ ГАДЗІНЫ «КІНAVARKI»

Аляксей ХАДЫКА

**3 лістапада ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі адбудзецца дэманстрацыя фільмаў-удзельнікаў Форума альтэрнатыўнага відэа «КінаVarka-2010».**

Паказ адбываецца ў рамках II міжнароднага фестывалю лічбавага мастацтва Terra Nova, у якім бяруць удзел прадстаўнікі васьмі краін. Задача: прадставіць розныя накірункі, тэхнікі і тэхналогіі, звязаныя з лічбавым мастацтвам, і даць прастору для прэзентацыі маладых аўтараў.

Менавіта зварот да новых тэхналогій, іх магчымасцяў, адрозных ад класічнага жывапісу і графікі, з’яўляецца, па словах куратара фестывалю Фёдара Ястраба, галоўнай ідэяй мастацкага форуму.

Дэманстрацыю кароткаметражных фільмаў арганізуе прадзюсар кампаніі «Карамболь» і куратар гэтай часткі праграмы Уладзімір Максімкаў. Цягам трох гадзін з 17.00 да 20.00 будзе прадстаўлена каля 100 стужак маладых рэжысёраў з Беларусі, Расіі, Францыі і Украіны. Уваход вольны. Хутка фільмы можна будзе ўбачыць і ў інтэрнэце на сайце фестывалю: www.kinovarka.tut.by.

# «ПОСТАЦІ» МАРАЧКІНА

Аляксей ХАДЫКА

**У фальварку «Добрыя мыслі» ў Мінску адкрылася выстава твораў вядомага беларускага мастака і грамадскага дзеяча Аляксея Марачкіна з серыі «Постаці», над якой творца працуе ўжо два гады.**

Былі прадстаўлены 26 выяваў знакамітых гістарычных асоб нашай краіны ад Ефрасінні Полацкай да Эміліі Плятэр, выкананых незвычайным спосабам: друкаваная графіка на дробназерневым палатне з паслядоўнай аўтарскай дапрацоўкай паверхні ўручную. Аляксей Антонавіч сёлета ўжо прэзентаваў публіцы частку гэтай серыі ў сакавіку-красавіку да свайго 70-годдзя. Гэтым разам шэраг герояў мінуўшчыны дапоўніў жывапісны партрэт сучасніка, знакамітага паэта Анатоля Сыса, які і зрабіўся «цвіком» прэзентацыі.

Наведвальнікі ўбачылі палатно «У гэтай краіне...» — першы партрэт Анатоля Сыса (26.10.1959 — 04.05.2005), які паўстаў за пяць гадоў, што мінулі пасля яго заўчаснай смерці. Серыя, распачатая цыклам «Жодзінцы» і жывапіснай выявай Багуслава Радзівіла другім творам у тэхніцы алейнага жывапісу, паказаным на выставе, як бы замкнулася гэтымі двума вобразамі.



На прэзентацыі гучалі песні на вершы паэта, успаміны, прысвечаныя яму паэтычныя творы. Асабліва шчымліва — радкі верша Паўла Змітрука з рэфрэнам: «Айчына, немінучая як смерць...». Арсень Ліс вельмі прачула казаў пра паэтычную зорку Сыса, разгадаўшы кампазіцыю прадстаўленага партрэта: яго фон — малая і вялікая радзіма Анатоля — вёска Гарошкаў на Гомельшчыне. Гаварылі і пра «феномен Сыса» — сыход у асабісты, адмежаваны ад навакольнага вар’яцкага жыцця свет. У дасканалую Беларусь, якую па-свойму шукалі Язэп Драздовіч, Мікола Цудзік.

І хаця Аляксей Марачкін прыгадаў, як Сыс, прыходзячы да яго ў майстэрню, называў мастака «бацькам», можна сказаць, што духоўна яны — з адной генерацыі. Таму і чын яны рабілі вельмі часта супольны: Марачкін стварыў абраз «Маці Божай Чарнобыльскай», а Сыс змясціў адзін са сваіх радкоў у іканастас царквы паблізу Гарошкава.

Выставу «Постаці» можна наведаць да 29 кастрычніка, а шэраг твораў убачыць, зайшоўшы на сайт нашай газеты.

# ФРАНЦЫЯ — ТРЭЦЯЯ РАДЗІМА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**26 кастрычніка ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы жывапісу легендарнага Барыса Заборава.**



Персанальная выстава мэтра, чые творы робяць фурор па ўсім свеце і на ўсіх кантынентах, у Мінску! Яго жывапісам, графікай, сцэнаграфіяй, работамі для кіно і тэлебачання, пластыкай, эсэістыкай захапляюцца ў Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Францыі, Італіі, Ізраілі, Японіі, ЗША і ў іншых краінах. Творы Барыса Заборава набываюць буйнейшыя музеі і галерэі свету, а кошты на іх зазвычай пачынаюцца ад некалькіх дзесяткаў тысяч еўра.

Гэта першая персанальная выстава Барыса Заборава на Беларусі, укладзеная з 37 твораў, спецыяльна для Мінска — горада, дзе 16 кастрычніка 1935 года ў гадаванца віцебскай мастацкай школы, «добрага сацрэаліста» Абрама Заборава нарадзіўся сын Барыс.

Асобная падзяка за выдатны каталог. Будзем спадзявацца, што гэта сустрэча не апошняя. Хоць бы таму, што мастак з годнасцю падкрэслівае, што Беларусь — яго радзіма, што ўсё яго мастацтва «афарбаванае жыццём на гэтай зямлі». «Насамрэч не непасрэдна, праз сюжэты... а ў сэнсе свядомасці, майго выхавання, лінія, якая працягваецца ў маёй крыві... — усё звязана з Беларуссю. Фатальны для майго мастацтва матыў — беларуская хата, якую пішу па некалькі разоў у год, гэта фундаментальны сюжэт, які сілкуе мяне... Адчуваю, што калі працую над ім, быццам бы вяртаюся сюды», — адзначае мастак. І дадае: «Лічу Расію сваёй другой радзімай, бо вучыўся ў Ленінградзе, Маскве, і Расія за апошнія 15 гадоў праявіла да мяне і маёй працы значную ўвагу. Францыя прыняла мяне, няпрошанага госця, дапамагла мне ў першыя цяжкія гады. Тут я стаў мастаком у тым сэнсе, як мне гэта бачылася. Таму Францыя для мяне — трэцяя радзіма. Чалавек свабодны, і калі ён па тых ці іншых прычынах выбірае іншую краіну для жыцця і дзейнасці — гэта яго неад’емнае права. Але чаго ён не павінен рабіць — я ў гэтым упэўнены — дык гэта рубіць свае карані, бо толькі з іх можа ўзрасці крона.... І мой асабісты досвед таму пацверджанне».

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ПЕРАМОЖЦЫ ЛЁСУ: ЧАРГОВАЯ КНІГА АЛЯКСАНДРА ТАМКОВІЧА

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Пяцьдзясят інтэрв'ю-маналогаў вядомых на Беларусі людзей журналіст Аляксандр Тамковіч аб'яднаў у сваёй кнізе пад назвай «Лёсы». Яе прэзентацыя адбылася 22 кастрычніка ў Мінску з удзелам саміх герояў.**



Палітыкі, мастакі, пісьменнікі, філосафы, гісторыкі, эканамісты — іх імёны ўсе добра ведаюць. «Пад гэтай вокладкай сабраліся біяграфіі людзей розных жыццёвых планаў, магчыма, нават перакананняў, не кажучы ўжо пра розную прафесійную накіраванасць. Але адно іх, як мінімум, аб'ядноўвае. Усе яны без выключэння з'яўляюцца апанентамі існуючаму ладу, мэйнстрыму, які пануе сёння ў палітыцы, культуры і г. д.», — адзначыў сацыёлаг Алег Манаеў.

Па словах Аляксандра Тамковіча, ён хацеў паказаць складаны лёс гэтых людзей. «Усе дасягнулі ў жыцці чагосьці не халявай, а сваёй працай», — сказаў ён. Адзін толькі прыклад — Васіль Шлындзікаў. Вядомы эканаміст, кіраўнік, гаспадарнік. «Але калі Шлындзікаў быў малады, ён спаў на вакзале, падклаўшы кніжкі пад галаву. Таму што больш не было дзе, не было нейкіх інтэрнатаў», — распавёў журналіст.

Яшчэ адна найцікавейшая постаць — актыўны грамадскі дзеяч Валеры Шчукін. Але хто дагэтуль ведаў, бываючы ў мінскім цырку, што поручні ў ім рабіў калісьці слесар Шчукін. Ці як ён вучыў дачку іграць на піяніна, якога ў іх дома не было. Гэты музычны інструмент быў дэфіцытам і каштаваў вялікіх грошай. Шчукін выразаў фанерку і намаляваў клавішы. Купіў падручнік. «Пяць разоў прачытаў, — расказвае Тамковіч. — Першыя тры разы нічога не зразумеў, што там напісана. А потым пачаў больш-менш разумець. І глядзеў па кніжцы, каб дачка не махлявала. Вось так яна навучылася іграць. І ўся кніжка, па сутнасці, пранізана менавіта такімі эпізодамі жыцця. Таму што сказаць нешта новае пра гэтых людзей вельмі цяжка. Трэба такія цікавыя моманты шукаць».

У кніжцы 52 старонкі фатаграфій. «І таму, як усе кніжкі, яе трэба пачынаць чытаць з канца, — жартуе аўтар. — Я вельмі хачу, каб людзі, якія яе будуць чытаць, па-першае, усміхнуліся. І я, напрыклад, не магу некаторыя фотаздымкі глядзець без усмешкі». Найбольшую жывасць, зразумела, выклікалі фота з дзяцінства. «Паглядзіш і на Юрыя Хашчавацкага, як ён маленькі ў гармонік грае, і яшчэ такія здымкі ўнікальныя. Таму і кніжачка атрымалася гэткая цёплая і вельмі добрая», — лічыць мастак Аляксей Марачкін.

На думку гісторыка Алега Трусава, аўтар кнігі праз біяграфіі выбітных людзей піша жывую гісторыю Беларусі. Былы палітвязень Андрэй Клімаў зазначыў, што героі кнігі ўжо ўвайшлі ў гісторыю. «Я думаю, што гэтыя людзі з'яўляюцца тым цэментам, які змацоўвае нашу дзяржаву, не дае ёй распадацца. Гэта больш чым эліта», — мяркуе ён. І хаця гісторыя не любіць умоўнага ладу, кніга «Лёсы», па перакананні Алега Манаева, дае адказ на пытанне, якой была б Беларусь за апошнія 16 гадоў на чале з гэтымі людзьмі. «Чытай гэту кнігу і папросту экстрапалюй гэтых людзей і іх біяграфіі ў гэты гістарычны шлях», — сказаў ён.

Гераіня іншай кнігі аўтара — «Жанчыны» — лічыць, што з жыцця такіх людзей трэба вучыцца рабіць сваё жыццё. «Бо ў нас бракуе лідэраў, бракуе духоўных асобаў, з якіх наша грамадства магло б браць прыклад», — сказала гісторык Таццяна Процька. І, на яе погляд, у шэрагу такіх людзей не хапае адной біяграфіі — Аляксандра Тамковіча. «Ты пайшоў супраць усіх трагічных абставін жыцця, якія ў цябе былі. І я іншых людзей не ведаю, якія б так змагаліся за сваё месца ў жыцці, за сваё жыццё і перамаглі свой лёс. І тое, што ты перамог, сведчыць гэта добрая кніжка», — зазначыла Таццяна Процька.

Героі Тамковіча прыйшлі на прэзентацыю з падарункамі. Народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка падарыла яму слоік з грыбамі лісічкамі. Кінарэжысёр Уладзімір Колас — дыскі са сваімі фільмамі, Аляксей Марачкін — кнігі. А паэт Андрэй Хадановіч уручыў аўтару пасведчанне сябра Беларускага ПЭН-цэнтра, хоць літаратары прынялі яго ў сваё аб'яднанне яшчэ год таму. «Каб я ведаў, што мне пасведчанне ўручаць на прэзентацыі, то хутчэй бы кніжку пісаў», — пажартаваў журналіст. Але кропку ў сваім праекце ён не паставіў. І напярэдадні прэзентацыі запісаў першы расповед — скульптара Алеся Шатэрніка.

«Лёсы» — шостая кніга Аляксандра Тамковіча, тры з іх перакладзены на англійскую мову, адна перавыдадзена. «Я не пісьменнік, я — журналіст, — кажа ён пра сябе. — Я папросту слухаю людзей, запісваю іх». Адначасова аўтар працуе над некалькімі праектамі і ўжо падрыхтаваў яшчэ дзве кнігі — пра хобі знаных асобаў і гутаркі з замежнымі дыпламатамі. «Гэтыя творы завершаныя. Засталося толькі выдаць», — абвясціў Аляксандр Тамковіч.

ФЕЛЬЕТОН

# ЗБОРШЧЫКІ

Лёлік УШКІН

**Нягледзячы на загад вертыкалі прыпыніць збор подпісаў за афіцыйнага кандыдата, сітуацыя мала змянілася. Недагледзелі? Сабатаж? А можа яшчэ горш?**

* * *

Пра тое, што адбываецца нешта дзіўнае, ён пачаў здагадвацца падчас паездак з працы дахаты. Маршрут пралягаў міма ГУМу, які аблюбавалі пікетчыкі розных кандыдатаў і палітычных плыняў. Неяк ягоную ўвагу прыцягнула адна група людзей.

— А што робяць тыя грамадзяне? — спытаў ён у кіраўніка аховы. — Няўжо гэта пікет за маю кандыдатуру? Я ж забараніў збіраць подпісы за сябе. Трэба альтэрнатыўным дапамагаць.

— А што тут дзіўнага? — адказаў ахоўнік. — Папросту людзі са сцягамі. У нашага народа такая любоў да афіцыйнай сімволікі, што яны нават на шопінг з ёй ходзяць.

Адказ яго задаволіў. Ён нават падумаў пра неабходнасць падтрымкі айчынных вытворцаў сцягоў. Напрыклад, можна ўвесці абмежаванне на колькасць чырвона-зялёных сцягоў, якія можна ўвозіць у краіну з-за мяжы.

Між тым праз некалькі дзён, зноў жа праязджаючы па цэнтры, ён змог разгледзець на стэндзе нейкага зборшчыка вельмі знаёмую фізіяномію.

— Слухайце, гэта ж я! Гэта ж мае вусы! Як жа так? Я ж забараніў за сябе збіраць!

Ахоўнік зноў яго супакоіў:

— Гэта папросту рэклама гастролей нейкага падобнага да вас артыста. Здаецца, яго завуць Лэдзі Гага.

Было ў словах ахоўніка нешта фальшывае. Прыехаўшы ў рэзідэнцыю, ён залез у інтэрнэт і ашалеў — у Лэдзі Гагі не было вусоў.

Ён пачасаў рэпу. Значыць, ахоўнік схлусіў. Значыць, мае месца нейкая змова. Самае цяжкае, што цяпер даверяць ён мог толькі сабе. Давялося весці расследаванне самастойна. Вечарам сказаў, што будзе працаваць з дакументамі, а на самай справе непрыкметна пакінуў будынак Адміністрацыі, злавіў таксі і загадаў ехаць за джыпам ахоўніка. Недзе ў Лошыцы машына змоўніка прыпынілася каля прэстыжнага катэджа. Ахоўнік знік у будынку, а ён асцярожна забраўся на дрэва і пачаў заглядаць у акно.



Хутка ён убачыў свайго ахоўніка і яшчэ аднаго чалавека, твар якога немагчыма было разгледзець з-за насунутага капелюшу. Яны даволі гучна нешта абмяркоўвалі.

— Трэба спяшацца, мэтр. Ён пачынае нешта падазраваць.

— Пачакайце, яшчэ рана. Як гаворыцца ў Чорнай біблії, зборшчыкам за д'ябла для рытуалу выкліканка гаспадара цемры патрэбна яшчэ пару пікетаў.

Гаспадар цемры. Чорная Біблія. Зборшчыкі за д'ябла. Што за іксфайлаўшчына такая? Ён насцярожыўся.

— Аднак зараз ужо хутка, — працягваў маналог мужык у капелюшы. Заўтра ў Берцах будзе пастаўлены 666-ы пікет. Усе яны сфармуюць сабой вялікую пентаграму. Тады праз сваіх людзей у арганізацыі «Стабільная Русь» мы выганім яе сяброў на пікеты. Напярэдадні яны атрымаюць інструкцыю: калектыўна пакончыць з жыццём, выклікаючы адначасова князя цемры. І ён прыйдзе.

— А сябры «Стабільнай Русі» пагодзяцца на такое?

— Куды яны дзенуцца? Каму ахвота, каб табе не працягнулі кантракт?

Ад такіх навін ён страціў асцярожнасць і гучна зваліўся з дрэва на зямлю. Людзі ў пакоі пачулі шум і кінуліся да вокнаў. Уцякаючы, ён паспеў пабачыць, як мужык у капелюшы нешта загадаў ахоўніку.

Дзякуючы рэгулярным хакейным трэніроўкам ён лёгка адарваўся ад пагоні. Але што далей? Трэба ратаваць свет. Што рабіць? Мозг ліхаманкава працаваў. Яны нешта казалі пра пентаграму, складзеную з пікетаў. Значыць, трэба тую схему разбурыць. Як? Проста — дастаткова знішчыць хаця б адзін пікет, звяно маштабнага сатаністкага сімвалу.

* * *

Сябры «Стабільнай Русі» на станцыі Пралетарская сталі ў пікеце, чакаючы, калі закончыцца іх змена. Раптам на іх наляцеў нейкі дзядзька, які пачаў ламаць стэнд і ледзь не зубамі рваць на кавалкі сцяг. Зборшчыкі разбегліся. Затое акт вандалізму выклікаў вялікую цікавасць у грамадстве. Сабраўся натоўп. Людзі актыўна каментавалі расправу.

— Людзі добрыя, што ж робіцца! Яшчэ шасці няма, а ён ужо так набраўся. Таварыш, нельга столькі піць.

— Што вы кажыце, жанчына?! Я яго асабіста цалкам разумею. Проста чалавек стаў ахвярай злачыннага рэжыму. Мужчына, можа вам лепш у Беларускі Хельсінскі камітэт звярнуцца?

— Мужык, кідай дурное. Гэту сістэму не зменіць. Пайшлі лепш па сто грам накацім. Адразу стане лягчэй.

Раптам нечакана ён перастаў ламаць стэнд «Стабільнай Русі» і задумаўся.

Перад тым, як выкліканы дзяжурным па станцыі нарад міліцыі пацягнуў яго ў аддзяленне, ён паспеў дастаць мабільнік, набраць нейкі нумар і сказаць суразмоўцу на тым канцы лініі:

— Слухай, Валодзя! І Дзімку перадай. Мне губляць няма чаго. Або газ па 120 доляраў, або я выклікаю князя цемры — і ўсяму чалавецтву капец.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1089

Падпісана да друку 29.10.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.